ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕ

Літаратура і Мастацтва

ВЫДАЕЦЦА З 1932 г

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 47 (2678) • Пятніца, 23 лістапада 1973 года • Цана 8 к

26 ЛІСТАПАДА СПАЎНЯЕЦЦА 30 ГАДОЎ З ДНЯ ВЫЗВАЛЕННЯ ГОМЕЛЯ АД ГІТЛЕРАЎСКІХ ЗАХОПНІКАЎ

Гэты здымак праспекта У. І. Леніна ў Гомелі быў зроблены месяц назад. Халодны лістапад сарваў буйную лістоту з каштанаў, зацярушыў іх снежным пылам. Але ўсё роўна і сёння горад па-над Сожам хвалюе сваёй прыгажосцю.

Ён цудоўны, наш Гомель. А стане яшчэ лепшым. Так будзе выглядаць адзін з новых раёнаў горада—Валатава, які ўзнімецца на пойменных землях.

Фота П. БЕЛАВУСА.

Матэрыялы, прысвечаныя Гомелю, чытайце на 2 і 3 старонках.

КОНКУРС «МАЯ МІЛІЦЫЯ» ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Падведзены вынікі літаратурнага конкурсу «Мая міліцыя», удзел у якім прынялі рэспубліканскія, абласныя, раённыя газеты, тэлебачанне і радыё.

Першыя прэміі па раздзелу апавяданняў, нарысаў прысуджаны журналістам С. Ваганаву («Знамя юности»), П. Кордзікаву (Беларускае радыё), Д. Пінхасіку («Советская Белоруссия»), Н. Ініну («Вячэрні Мінск»). У ліку пераможцаў конкурсу: Л. Ефіменка — начальнік следчага аддзялення Рэчыцкага аддзела ўнутраных спраў, В. Літвінаў — намеснік начальніка Навабеліцкага аддзела ўнутраных спраў, Н. Шлег — інструктар аддзела палітыка-выхаваўчай работы УУС Мінгарвыканкома.

Міністэрства ўнутраных спраў Беларускай ССР, Саюз пісьменнікаў БССР, Саюз журналістаў і Дзяржаўны камітэт Савета Міністраў БССР па тэлебачанню і радыёвяшчанню прадоўжылі рэспубліканскі літаратурны конкурс «Мая міліцыя» на 1974 год. На конкурс прымаюцца апавяданні, нарысы, замалёўкі, вершы, рэпартажы і фотаздымкі, апублікаваныя ў друку, а таксама матэрыялы, перададзеныя па тэлебачанню і радыё. За лепшыя творы ўстаноўлены прэміі і дыпломы. Чарговыя вынікі літаратурнага конкурсу «Мая міліцыя» будуць падведзены да 10 лістапада 1974 года.

БЕЛТА.

ГЕРОІ СЫШЛІ З ЭКРАНА

Яны спусціліся ва Усходняй Прусіі з неба, як кажуць, проста на галовы фашыстаў. Група капітана Крылатых. Гэта не аўтарская знаходка. Крылатых — сапраўднае прозвішча камандзіра групы савецкіх разведчыкаў, аднаго з герояў мастацкага фільма, як і аднайменнай аповесці Н. Рыдзеўскага «Парашуты на дрэвах».

І вось перад экранам — два члены гэтай групы, якія засталіся жывыя: журналіст Н. Рыдзеўскі і юрыст Г. Юшкевіч, а таксама стваральнікі карціны. Па запрашэнню прэзідыума БТА яны прыйшлі ў Рэспубліканскі дом мастацтваў, каб разам з прысутнымі паглядзець і паказаць сваю новую работу тэатральнай грамадскасці Мінска. Менавіта сваю, таму што, як сказаў рэжысёр-пастаноўшчык фільма, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР І. Шульман, Н. Рыдзеўскі, Г. Юшкевіч прымалі актыўны ўдзел і ў стварэнні карціны.

Героі фільма нібы ўваходзяць у экран, працягваючы жывы расказ аб перажытым. Час ад часу іх успаміны ажываюць, і гледачы ўважліва сочаць за гераічнай і рызыкоўнай, але так неабходнай камандаванню Савецкай Арміі работай разведчыкаў.

— Няўжо сцэна ў бункеры, дзе знаходзіліся героі і куды прыехалі фашысцкія афіцэры, таксама рэальнасць, а не аўтарскі домысел?— спытаў пасля прагляду адзін з гледачоў.

Не, нічога тут не прыдумана. Усе сітуацыі рэальныя. У жыцці было і больш складана. Былыя разведчыкі ахвотна адказваюць на пытанні, якім, здаецца, няма канца. Шмат выпрабаванняў выпала на долю герояў фільма, вобразы якіх настолькі праўдзіва ўзноўлены акцёрамі, такое моцнае іх партрэтнае падабенства, што нікога не здзіўляе «сумяшчэнне» дакументальнасці і мастацкасці. Усё гэта натуральна пераплятаецца, узмацняючы эмацыянальнае ўздзеянне на гледача.

У фільме шмат рэжысёрскіх знаходак, ён добра зняты аператарам А. Аўдзеевым. І ўсё ж такі не пра гэта думаюць людзі, калі гасне экран. Яны думаюць пра вялікі подзвіг савецкіх воінаў, пра наш патрыятычны абавязак перад Радзімай.

Я. ПАЛУШКІНА.

У РЭДАКЦЫЮ «ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА»

Дазвольце са старонак газеты выказаць шчырую падзяку ўсім установам і таварышам, ад якіх я атрымаў з нагоды свайго 60-годдзя і ўрадавай узнагароды цёплыя віншаванні.

Л. ВАЛЧЭЦКІ,
заслужаны дзеяч культуры БССР.

РАСКВІТНЕЎ НАД СОЖАМ ГОРАД

РАСКАЗВАЕ ДРУГІ САКРАТАР ГОМЕЛЬСКАГА ГАРКОМА КПБ БАРЫС МАЦВЕЕВІЧ ТАМАШОЎ.

Куды б лёс не закінуў чалавека, няхай і за тысячы кіламетраў ад месца, дзе ён нарадзіўся, усё роўна родны кут заўсёды мілы яго сэрцу. Мне ж, я лічу, здорава пашанцавала. Гомель не толькі мая радзіма, гэта і горад усёй маёй біяграфіі, тут я вырас, пасталеў, тут жыву і працую.

Разам з тысячамі маіх землякоў я ганаруся званнем гамяльчаніна. Гомель — любоў мая. Люблю яго шырокія праспекты, паркі і скверы, кручу па-над шырокім Сожам, дзе дыхаецца на поўныя грудзі

Тры дзесяцігоддзі сплыло з дня вызвалення Гомеля ад фашысцкай навалы. А здаецца ўчора толькі прыязджаў я сюды з арміі на кароткую пабыўку і засмучаны, узрушаны хадзіў па разбураных вуліцах. Страшная карціна паўставала перада мной. На колькі хапала вачэй — папялішчы, папялішчы. Апускаецца вечар — ніводнага агеньчыка, ніводнага гуку.

Цяжка ўспамінаць...

Гітлераўцы знішчылі ў Гомелі больш за пяць тысяч дамоў, у тым ліку, бальніцы, школы, культурныя ўстановы, прамысловыя прадпрыемствы. Агульны ўрон, які акупанты нанеслі гораду, склаў больш за тры мільярды рублёў.

Матэрыяльныя каштоўнасці... А людзі, якіх ужо не вярнуць! Фашысты закатавалі тысячы мірных грамадзян, насельніцтва Гомеля зменшылася напалавіну.

З цягам часу вырас горад па-над Сожам на месцы папялішчаў. Усё, што мы сёння маем, зроблена працавітымі рукамі гамяльчан.

Гомель перакрочыў мільярдны рубеж у аб'ёме прамысловай вытворчасці і па выпуску прадукцыі займае ў рэспубліцы другое месца. Гомель — горад хімічнай і электратэхнічнай прамысловасці, горад машына- і прыборабудаўнікоў. Прадукцыя з маркай гомельскіх заводаў экспартуецца ў 55 краін свету. За поспехі ў выкананні сямігадовага плана горад быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Чытачам «Літаратуры і мастацтва» будзе цікава даведацца і пра нашы здабыткі ў культурным будаўніцтве. Яны не меншыя, чым у прамысловасці, і іншых галінах. У нас створаны ўсе ўмовы для гарманічнага развіцця кожнага чалавека.

Я запрашаю вас зрабіць своеасаблівае падарожжа ў культурнае і мастацкае жыццё горада. На самай нашай вялікай плошчы, якая носіць імя Леніна, узвышаецца манументальны будынак, упрыгожаны порцікам з чатырма гатычнымі калонамі. У гэтым памяшканні ў 1954 годзе пачаў працаваць абласны драматычны тэатр. Тэатральны калектыў, які ўзначальвае галоўны рэжысёр, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР, народны артыст рэспублікі Іосіф Сцяпанавіч Папоў, радуе гамяльчан высокім мастацтвам. У рэпертуары тэатра спектаклі па п'есах савецкай і зарубежнай класікі, сучасных аўтараў.

Насупраць тэатра — зялёны масіў славутага гомельскага парку культуры і адпачынку імя Луначарскага. Парк гэты адзін з даўнейшых на Беларусі — любімае месца адпачынку гамяльчан. У парку — старажытнай архітэктуры палац. Былы палац графа Паскевіча, разбураны ў гады вайны, поўнасцю рэстаўрыраваны. У палацы знаходзіцца абласны краязнаўчы музей, яго экспазіцыі расказваюць пра слаўнае мінулае Гомельшчыны, пра яе сённяшні дзень.

Пойдзем па адной з самых прыгожых вуліц горада — імя Пушкіна. На адным з будынкаў убачыце шыльду: «Гомельская абласная філармонія». Гомель пакуль што адзіны ў рэспубліцы абласны цэнтр, які мае сваю філармонію. Яе калектыў вядзе значную работу па прапагандзе мастацтва сярод насельніцтва. Сёлета філармонія была ўзнагароджана дыпломам Міністэрства культуры СССР за добрае абслугоўванне сельскіх працаўнікоў. Да прыкладу назаву некалькі лічбаў. За 10 месяцаў гэтага года артысты філармоніі далі каля двух тысяч канцэртаў, на якіх пабывала больш за паўмільёна чалавек.

На Савецкай вуліцы абавязкова звернеце ўвагу на серабрысты купал арыгінальнага збудавання. Гэта наш цырк — адзін з самых вялікіх (на дзве тысячы месц) і прыгожых у краіне... Адкрыццё яго адбылося ўсяго год назад, але на цыркавых прадстаўленнях пабывала ўжо каля мільёна чалавек.

Дарэчы, на афішах, расклееных на маляўнічых стэндах, вы сустрэнеце імёны лепшых спевакоў і музыкантаў, акцёраў кіно і артыстаў цырка з Масквы і Ленінграда, Мінска, Кіева і Рыгі, з Польшчы і Югаславіі, ГДР і Румыніі.

Гамяльчане ахвотна знаёмяць і з мастацтвам самадзейных артыстаў-землякоў. Дастаткова сказаць, што ў горадзе працуе 360 калектываў мастацкай самадзейнасці, з іх 11-ці прысвоена ганаровае званне народных. Збываюцца прарочыя словы Карла Маркса аб тым, што пры камунізме ў сферу мастацкай творчасці будзе прыцягнута большасць членаў грамадства.

Карыстаючыся выпадкам, мне б хацелася сёння адзначыць некалькі мастацкіх калектываў. Гэта народны хор абутковага вытворчага аб'яднання «Праца». Кіруе калектывам Іван Галко. Хор дрэваапрацоўчага аб'яднання пад кіраўніцтвам заслужанага дзеяча культуры БССР Мікалая Бяспалага. І, нарэшце, вакальна-інструментальны ансамбль Гомельскага універсітэта «Радзімічы». Гэтыя калектывы выступалі ў многіх гарадах Беларусі і за яе межамі і ўсюды карысталіся заслужаным поспехам.

На Прывакзальнай плошчы — гмах палаца культуры чыгуначнікаў імя У. І. Леніна. Калектыў мастацкай самадзейнасці палаца мае даўнюю і слаўную гісторыю. Ён выхаваў шмат таленавітых самадзейных артыстаў, шмат з іх працуюць цяпер на прафесійнай сцэне. Сярод іх народная артыстка РСФСР салістка Вялікага тэатра Саюза ССР Веранікa Барысенка, салістка Вялікага тэатра оперы і балета БССР, заслужаная артыстка рэспублікі Раіса Асіпенка.

Шырока вядомы народны ансамбль песні і танца, якім кіруе народны артыст БССР Аляксандр Рыбальчанка. Ансамбль некалькі разоў узнагароджваўся ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, мае звыш ста ганаровых грамат і дыпломаў, за удзел у шматлікіх аглядах і фестывалях.

Вялікай папулярнасцю карыстаюцца народны тэатр, аркестр народных інструментаў і іншыя калектывы палаца.

У нашым горадзе чатыры палацы культуры і 11 клубаў. Неўзабаве гасцінна адкрые дзверы палац культуры хімікаў, будаўніцтва якога завяршаецца ў мікраёне Фестывальны. Гэта будзе цудоўнае збудаванне з вялікай глядзельнай залай, бібліятэкай, пакоямі для гурткоўй работы. Узводзяць свой палац культуры рабочыя 10-га будаўнічага трэста.

Мне б хацелася расказаць і пра тое, як гамяльчане сябруюць з кнігай, паказаць нашы бібліятэкі. 167 масавых бібліятэк у горадзе. Кніжны фонд іх складае больш за тры мільёны тамоў, а калі падлічыць колькасць чытачоў, дык атрымаецца, што ў бібліятэку запісаны ледзь не кожны другі гамяльчанін (у Гомелі жыве зараз 330 тысяч чалавек). У Гомелі адна бібліятэка прыходзіцца прыблізна на 2.000 чалавек, а ў ЗША — на 22 тысячы, у Англіі — на 82 тысячы, у Японіі — на 117 тысяч чалавек.

Не хапіла б, відаць, летнай паласы, каб пералічыць усе мерапрыемствы, якія праводзяцца нашымі бібліятэкамі. Гэта і канферэнцыі чытачоў, і сустрэчы з пісьменнікамі, выдатнымі людзьмі горада, героямі вайны і працы, ветэранамі партыі і г. д.

Мы ганарымся тым, што Гомель — другі горад у рэспубліцы, які мае універсітэт. Наш універсітэт яшчэ зусім малады, але вядомы сваёй навуковай і педагагічнай работай. А вось пра тое, што ў Гомелі працуе каля ста народных універсітэтаў, ведаюць не ўсе нашы госці. Асаблівай папулярнасцю карыстаюцца універсітэты культуры. Адзін толькі універсітэт мастацкага выхавання пры Палацы культуры чыгуначнікаў наведвае звыш 400 чалавек.

Хачу я сказаць — выдатная ў нас інтэлігенцыя. Адукаваная, энергічная, працавітая. Вы б паслухалі, як праходзяць пасяджэнні гарадскога клуба, які аб'ядноўвае творчых работнікаў тэатра і філармоніі, пісьменнікаў, архітэктараў, журналістаў. Тут і абмен творчымі планамі і задумамі, тут і сяброўская крытыка, жарты, эпіграмы. Сядзіш, слухаеш і думаеш: добра, цікава мы жывем.

А будзем жыць яшчэ лепей.

«Вайна і жыццё». Лінагравюра Я. Пакаташкіна.

СЛУЖЫЦЬ

Наша Гомельскае аддзяленне Саюза мастакоў БССР налічвае 19 чалавек. Пераважная большасць з іх — людзі, якія актыўна і плённа працуюць у мастацтве. У першую чаргу трэба назваць аднаго са старэйшых беларускіх жывапісцаў, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Барыса Фёдаравіча Звінагродскага. Шмат работ мастак прысвяціў цудоўнай прыродзе роднага Палесся. Нягледзячы на пажылыя гады — Б. Ф. Звінагродскаму — восьмы дзесятак, — ён вядзе вялікую грамадскую работу, працуе дэканам універсітэта мастацкага выхавання пры Гомельскім палацы культуры чыгуначнікаў, выязджае з лекцыямі пра выяўленчае мастацтва на заводы, у калгасы, навучальныя ўстановы.

Хацелася б адзначыць творчасць Мікалая Казакевіча і Дзмітрыя Алейніка. Яны ўдзельнікі рэспубліканскіх і ўсесаюзных выставак, іх работы дэманстраваліся за рубяжом. Добрыя водгукі атрымалі на Усесаюзнай выстаўцы «Наша Радзіма» работы М. Казакевіча «Юнацтва», Д. Алейніка «Бабіна лета», «Веснавы матыў», а на выстаўцы ў Фінляндыі — «Порт. Вясна».

Гэтыя ж мастакі плённа працуюць у жанры манументальна-дэкаратыўнага жывапісу. Іх афармленне фае гомельскага кінатэатра імя Калініна (мазаіка) атрымала другую рэспубліканскую прэмію Дзяржбуда БССР.

Наогул многія нашы мастакі прымаюць актыўны ўдзел у афарміцельскіх работах. Прынамсі, станоўчую ацэнку атрымала мазаічнае пано работы Д. Кузняцовай і С. Бродскага ў рэстаране гасцініцы «Гомель», дэкаратыўнае пано, выкананае В. Казачэнкам, Я. Іванешкам і В. Крыловым ў прафілакторыі для чыгуначнікаў і г. д.

Ёсць пэўныя творчыя здабыткі ў гомельскіх скульптараў.

У мінулым годзе ў Петрыка-

Праект будынка Гомельскай філармоніі (архітэктар В. Комар).

ЯСНАЯ ПЕРСПЕКТЫВА

ВАРТА чалавеку не пабыць у Гомелі, скажам, адзін год, каб, вярнуўшыся, заўважыць у абліччы горада шэраг істотных перамен.

За апошні час справілі наваселлі тысячы гамяльчан, выраслі новыя школы, бібліятэкі, клубы, кінатэатры, адміністрацыйныя будынкі.

Карэспандэнт «Літаратуры і мастацтва» сустрэўся з галоўным архітэктарам Гомеля Арктам Маркавічам Іванчанкам і папрасіў яго расказаць, якія задачы вырашаюць цяпер гомельскія дойліды, якім ён стане, горад над Сожам, у бліжэйшыя дзесяцігоддзі.

— Нашы продкі ведалі, дзе сяліцца, — гаворыць з усмешкай Аркт Маркавіч,— не знойдзеш больш зручнага месца — вялікая чыстая рака, маляўнічы ландшафт. Зараз Гомель займае 80 квадратных кіламетраў і, як гаворым мы, архітэктары, мае выдатнае арганізуючае асяроддзе для развіцця архітэктуры.

Па генеральнаму плану забудовы горада, распрацаваным 10 гадоў назад, да 1975 года насельніцтва Гомеля павінна было скласці 275 тысяч. А мы ўжо цяпер маем 330 тысяч...

— Адкуль такая памылка ў прагназіраванні?

— Тлумачыцца ўсё даволі проста. Распрацоўшчыкі генплана зыходзілі з таго, што ў далейшым у самім Гомелі тэмпы развіцця буйнай прамысловасці будуць стрымлівацца. Жыццё ўнесла ў план істотныя карэктывы. За апошняе дзесяцігоддзе ў горадзе было пабудавана нямала прамысловых прадпрыемстваў. А прамысловасць, як вядома, магутны градаўтвараючы фактар.

Зараз распрацоўваецца генеральны план развіцця нашага горада на бліжэйшыя тры дзесяцігоддзі. Да двухтысячнага года насельніцтва Гомеля складзе 620—640 тысяч чалавек. У разлік бярэцца, вядома, не толькі натуральны прырост. Горад будзе расці ў асноўным за кошт развіцця навукі і культуры.

Ужо зараз узводзіцца вялікі універсітэцкі комплекс. Плануецца будаўніцтва шэрагу буйных праектных і навукова-даследчых інстытутаў, такіх, напрыклад, як інстытут «Гіпрасельмаш», «Механікі металапалімерных сістэм», філіял Маскоўскага інстытута «Гіпрахім» і г. д.

Нашу, так сказаць, глабальную стратэгію ў архітэктурным развіцці горада я б сфармуляваў такім чынам— прыгажосць, зручнасць, максімальнае выкарыстанне прыродных умоў, захаванне акаляючага асяроддзя.

Гэтых прынцыпаў не так лёгка трымацца. Скажам, ужо сёння мы сустракаемся з праблемай свабодных тэрыторый для забудовы. Маглі б, вядома, ахвяраваць зялёнай зонай, якая апаясвае горад. Але дзе мы будзем тады адпачываць, і, вобразна кажучы, чым дыхаць? Не можа горад расці і за кошт зямель прыгарадных калгасаў і саўгасаў. Гэта забаронена законам.

Мы прыйшлі да выводу, што трэба асвойваць пойменныя землі. Падлічылі, што інжынерныя работы абыдуцца нам у 17 мільёнаў рублёў, але гэтыя затраты акупяцца. Затое мы не высякаем лес, набліжаем горад да ракі.

Сёння ўжо вядзецца інжынерная падрыхтоўка пойменнага ўчастка ў раёне вёскі Валатавы. З дня ў дзень тут працуюць сем магутных земснарадаў.

— Здаецца, у рэспубліцы гэта будзе першы вопыт будаўніцтва на намыўных землях?

— Так. Дзяржбуд БССР мяркуе арганізаваць у раёне Валатавы эксперыментальнае паказальнае будаўніцтва, каб потым распаўсюдзіць вопыт у іншых гарадах рэспублікі.

Аркт Маркавіч падыходзіць да сцяны і паказвае на вялікі здымак аб'ёмнага макета.

— Вось так будзе выглядаць «Валатава»... Тут мяркуецца размясціць восем мікрараёнаў з насельніцтвам 130 тысяч чалавек. Там жа будзе універсітэцкі комплекс, Батанічны сад, маладзёжны цэнтр. Тэрыторыя «Валатавы» арганізуецца вакол возера (цяпер гэта глеістае, бруднае балота), якое стане маляўнічым месцам адпачынку мясцовых жыхароў.

Па генеральнаму плану асноўнай кампазіцыйнай воссю горада стане рака. Забудова ўздоўж ракі будзе весціся ў паўночна-ўсходнім і паўднёва-заходнім напрамках. Тут размесціцца гарадскі цэнтр горада, жылыя раёны, паркавая зона.

З боку ракі сілуэт горада будзе ўяўляць комплекс вышынных будынкаў.

— Мабыць, змены закрануць і цяперашні цэнтр Гомеля?

— Абавязкова. Скажам, новае аблічча адной з самых ажыўленых вуліц горада — Савецкай — надасць сістэма звязаных плошчаў з своеасаблівымі архітэктурнымі ансамблямі. Напрыклад, на плошчы Паўстання, дзе пабудаваны цырк, будзе ўзведзены вышынны будынак універмага, адпаведным чынам рэканструяваны будынкі, якія выходзяць на плошчу.

Яшчэ адна плошча на гэтай вуліцы арганізуецца ў раёне цяперашняга універсітэта. Тут размесціцца філармонія, дом тэхнікі.

Перад намі стаіць задача разгрузіць цэнтр горада, які стаў цеснаваты для цяперашняга патоку аўтатранспарту. Нагадаю, што Гомель стаіць на магістралі Ленінград — Адэса, і цераз горад праходзіць нямала транзітных машын. Робяцца пэўныя захады па стварэнню вуліц-дублёраў для пропуску грузавога транспарту. Акрамя таго, праз Сож будуць перакінуты новыя транспартныя масты.

— Аркт Маркавіч, Гомель, відаць, будзе расці не толькі ў шырыню, але і ў вышыню?

Трэба прызнацца, пакуль што мы слаба расцем увышыню. Ёсць для гэтага пэўныя аб'ектыўныя прычыны. Справа ў тым, што кожны архітэктар, прапануючы тую ці іншую ідэю, павінен улічваць, як гэтая ідэя будзе, так сказаць, матэрыялізавана, ці ёсць для яе ажыццяўлення матэрыяльныя і інжынерныя магчымасці. Дагэтуль прадукцыя Гомельскага домабудаўнічага камбіната была разлічана на збудаванні не вышэй пяці паверхаў. Зараз, пасля рэканструкцыі камбіната, мы можам весці шырокую забудову дзевяці- і дванаццаціпавярховымі будынкамі.

Прынамсі, на Валатаве ўсе збудаванні будуць не ніжэй 9—12 паверхаў.

Дадамо, што ў Гомелі ўзводзіцца яшчэ завод аб'ёмна-блочнага домабудаўніцтва на 100 тысяч квадратных метраў жылля ў год.

Вось усё, што мне хацелася расказаць пра нашы планы, нашы перспектывы. Мы, гамяльчане, упэўнены—наш горад над Сожам будзе яшчэ больш прыгожы і велічны.

НАРОДУ



«Новы дом». Лінагравюра Я. і Л. Пакаташкіных.

ва быў урачыста адкрыты помнік матросам Дняпроўскай флатыліі, вызваліцелям гэтага гарадскога пасёлка (скульптар Аляксандр Сівалобаў).

Неўзабаве ў пасёлку Азарычы Калінкавіцкага раёна на месцы былога лагера смерці будзе ўзведзены мемарыяльны комплекс. Аўтары — скульптары Дзмітрый Папоў і Генадзь Гарбанёў, архітэктары Фаіл Хаўрулін і Віктар Калюжны.

Будзе ўстаноўлена стэла з рэльефамі (скульптар Д. Папоў) у вёсцы Насовічы Гомельскага раёна, дзе ў гады вайны гітлераўскія карнікі знішчылі амаль усё мірнае насельніцтва.

Гэты год багаты ў нас на выстаўкі. Аддзяленнем было арганізавана 13 выставак, з іх тры перасоўных — у Мазыры, Зябраўцы і Бранску.

Дарэчы, у нас даўнія творчыя сувязі з рускімі калегамі. Яны часта прыязджаюць са сваімі творамі да нас, мы паказваем свае работы жыхарам Бранска. Абменьваліся мы выстаўкамі і з чарнігаўскімі мастакамі.

У Гомеля ёсць горад-пабрацім — Чэшскае Будзеёвіцэ. Плануецца паслаць туды выстаўку твораў гомельскіх мастакоў, запрасіць чэшскіх майстроў выяўленчага мастацтва да сябе.

Наш Гомель жыве паўнакроўным мастацкім жыццём. Нядаўна ў нас была арганізавана выстаўка работ Надзі Рушавай, украінскіх майстроў. У гэтым годзе на Гомельшчыне, на нафтаправодзе «Дружба» працавала група мастакоў з Польшчы, ГДР і некаторых нашых саюзных рэспублік. Іх работы мы спадзяёмся неўзабаве ўбачыць.

Праз некалькі дзён гамяльчане, а з імі і ўся Беларусь будуць адзначаць 30-годдзе вызвалення горада над Сожам ад фашысцкіх захопнікаў.

Сваё слова ў арганізацыі гэтага вялікага свята скажуць і гомельскія мастакі. Праедзьце зараз па вуліцах горада, паглядзіце на яго маляўнічае ўбранне. Мастакамі афармлена алея Герояў Савецкага Саюза, ураджэнцаў горада (аўтары М. Палянкоў і В. Казачэнка), зроблена выстаўка «Падполле горада Гомеля ў час вайны» (мастак Г. Говар), на адной з плошчаў горада ўстаноўлены вялікі стэнд з дванаццаці пано, прысвечаных гомельскаму народнаму апалчэнню (мастакі У. Кароткі, М. Навейкаў).

Гэтымі днямі ў нас адкрыецца вялікая абласная мастацкая выстаўка «Беларусь сацыялістычная», на якой будзе прадстаўлена каля ста работ гомельскіх мастакоў.

Як і ва ўсіх савецкіх мастакоў, у нас адна мэта — служыць сваёй творчасцю народу.

Я. ПАКАТАШКІН,
старшыня Гомельскага аддзялення Саюза мастакоў БССР.

У ВЯНОК ДРУЖБЫ

Андрыс ВЕЯН

Латвія

ВЕЦЕР І ЦЫМБАЛЫ

Савецкай Беларусі

Струны кранецца вецер — заяснiцца
У вокнах песня, дол абудзіць сад.
Душылі ўсіх платы і акяніцы.
Для жонак быў ялейны чад бажніцы,
А для мужоў — карчмы сівушны чад.

Дзе партызан па сцежцы-таямніцы
Ішоў (яе і ў снах баяўся гад),
Збіраюць дзеці спелыя чарніцы.

Струны кранецца вецер — і пагляд
У возера ляснога прамяніцца.
Не змусяць болей нас схіляцца ніца
Ані пыхлівы пан, ні казнакрад.
А салаўю спяваць — не супыніцца.
Да шчасця нам ісці, не ведаць звад.
Струны кранецца вецер —
Зорапад!

Пераклаў Рыгор БАРАДУЛІН.

Георгі ДЗУГАЕЎ

Асеція

З Я М Л Я

Зямля мая!
Я сын малодшы твой.
Грудзьмі тваімі ўскормлены на волі.
Тваёй сагрэты ласкай, дабрынёй.
Я сейбіт твой і твой касец у полі.
Перад табой не сорам пасці ніц.
Імя тваё
Я вечна славіць буду.
Мяне ты клічаш радасцю крыніц,
У іх знаходжу ўсе зямныя цуды.
П'яніць мяне спрадвечны хлеба пах.
Тваімі я на ўсё гляджу вачыма.
Тваё імя да скону на губах.
Тваё імя, любімая Айчына!

Пераклаў Г. КЛЯЎКО.

ПЕРШАЯ КНІЖКА

УРАДЖАЙНЫМ быў гэты год на першыя паэтычныя зборнікі. Чытач мае магчымасць пазнаёміцца з новымі імёнамі. Але агульнавядома: першая кніжка павінна стаць падзеяй не толькі для аўтара, але і для шырокага кола прыхільнікаў паэзіі. Сёння, у час масавай увагі да паэзіі ў нашай рэспубліцы, надзвычай узраслі патрабаванні да яе. Расце цікавасць да асобы нашага сучасніка, расце разам з гэтым і цікавасць да паэзіі як лірычнага выразніка асобы. І таму натуральныя пытанні: з чым ідуць аўтары гэтых першых кніжак у жыццё, у паэзію, што іх хвалюе, як разумеюць яны складаныя праблемы часу?

Менавіта гэтыя пытанні і сталі ў цэнтры ўвагі на чарговым пасяджэнні секцыі паэзіі, якое адбылося днямі ў памяшканні клуба Саюза пісьменнікаў БССР. Абмяркоўваліся першыя зборнікі маладых паэтаў Віцебшчыны — «Крыгалом» Б. Беліжэнкі, «Паверка» М. Губернатарава і «Бяседа» С. Законнікава. Размова была адкрытай і мэтанакіраванай: памагчы маладым паэтам лепш усвядоміць не толькі станоўчае, але і істотныя пралікі ў іх творчасці. М. Аўрамчык, М. Арочка, Р. Барадулін, Г. Бураўкін, В. Вітка, А. Вярцінскі, А. Грачанікаў, С. Гаўрусёў, А. Клышка, Е. Лось, П. Макаль, Ю. Свірка, Д. Сімановіч і іншыя звярнулі ўвагу на непасрэднасць і шчырасць, з якой аўтары адкрываюць свае сэрцы чытачу, расказваюць пра тое, што іх хвалюе. Лепшыя вершы вылучаюцца паэтычнай канкрэтнасцю, з іх паўстае прывабны вобраз лірычнага героя. Гэты герой адчувае радасці і трывогі веку, любіць родны край, захапляецца сёняшнім днём, але не забывае і суровае мінулае, з пачуццём вялікай удзячнасці гаворыць аб гераізме і мужнасці савецкіх людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Аднак разам з тым у вершах Б. Беліжэнкі, М. Губернатарава і С. Законнікава нярэдка назіраецца няўменне дыялектычна спалучаць пачуцці і думкі. У адных выпадках пераважаюць эмоцыі і верш робіцца залішне сентыментальным, другім жа вершам, наадварот, уласцівы сухі рацыяналізм. Асабліва адзначалася тэматычная вузкасць твораў маладых аўтараў: у большасці яны засяроджваюць сваю ўвагу на «вечных тэмах» — маленстве, малюнках прыроды, вёсцы і г. д. Само па сабе гэта нядрэнна. Горш іншае. Часам паэт (напрыклад, М. Губернатараў) малюе сённяшнюю вёску старымі фарбамі, не заўважаючы новых працэсаў. Безумоўна, такі верш не ўсхвалюе, не зацікавіць. Задача паэзіі якраз у тым, каб адгукацца на самыя надзённыя патрэбы, самыя трапяткія праблемы часу, паказваць унутраны свет сучасніка ва ўсёй яго складанасці.

Аб гэтым слушна гаварылі ў сваіх выступленнях П. Макаль, А. Клышка, В. Вітка і інш. У прыватнасці, В. Вітка асабліва раіў маладым паэтам пазбягаць жанравай аднастайнасці, «не іграць на адной струне», а настойліва весці творчы пошук, глыбей вывучаць жыццё і адлюстроўваць яго.

Г. Бураўкін, Р. Барадулін, С. Гаўрусёў, Ю. Свірка падрабязна, на канкрэтных прыкладах разгледзелі мастацкія вартасці першых кніжак віцяблян. Выказалі шэраг карысных, павучальных думак адносна мастацкага асваення тэмы, падкрэслілі першаступенную важнасць для паэта заўсёды імкнуцца знайсці галоўнае ў думках ці перажываннях, вакол якіх ствараецца верш.

Падсумоўваючы гаворку аб першых зборніках, намеснік старшыні праўлення СП БССР А. Грачанікаў адзначыў яе надзённасць, карыснасць, пажадаў творчых поспехаў, добрага плёну маладым літаратарам Віцебшчыны ў адлюстраванні савецкай рэчаіснасці.

З інфармацыяй аб выніках падрыхтоўкі «Дня паэзіі—1974» на пасяджэнні выступіла рэдактар зборніка Е. Лось. Затым была абрана рэдакцыйная калегія «Дня паэзіі—1975».

У заключэнне прысутныя прагледзелі і абмеркавалі тэлефільм «Па шчасце, па сонца» (па вершах Янкі Купалы).

ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ!

„СЛОВА-ГАРТ, СЛОВА-

ПРЫЗНАЮСЯ, што мне трохі сумна ад усведамлення гэтага бязлітаснага факта. Сумна таму, што з дня першага нашага знаёмства ў 1945 годзе, за чвэрць стагоддзя добрага сяброўства я прывык бачыць перад сабой чалавека, над якім гады, здавалася, не маюць ніякай улады: заўсёды ён поўны сапраўды-такі маладой энергіі, жыццярадаснасці, бадзёрасці, весялосці, заўсёды гатовы з юнацкім імпэтам кінуцца ў грамадскую, літаратурную бойку, каб адстаяць тыя ідэалы, барацьбе за якія прысвяціў усё сваё жыццё, усю сваю рэвалюцыйную дзейнасць, — камуністычныя ідэалы. Такім Піліп Сямёнавіч сустракае і свае юбілейныя сем дзесяткаў, нягледзячы на ўсе ўдары жорсткага лёсу і на ўсе хваробы, якімі яго «шчодра» надзялілі яшчэ сырыя і халодныя, з рэжымам на фізічнае знішчэнне камуністаў, турмы Пілсудскага...

Ёсць людзі, у якіх цікавая і ў пэўным сэнсе багатая біяграфія, але жыццяпіс іх не можа адлюстраваць пэўны перыяд ці нават пэўны момант у гісторыі народа. Біяграфія, усе галоўныя падзеі жыцця Піліпа Пестрака адбіваюць цэлую вялікую эпоху. Усё жыццё Пестрака было з народам, у гушчы народа і ў цэнтры барацьбы. І натуральна, што такая біяграфія абумовіла накіраванасць творчасці, яе ідэйную аснову.

Першая сусветная вайна, нямецкае наступленне выгнала сям'ю Пестракоў, як і многія тысячы іншых беларусаў, з роднай вёскі Сакоўцы на Брэстчыне. Дапытлівы, паэтычна ўзнёслы юнак апынуўся на бязмежных прасторах Расіі. Там удыхнуў жыццятворны вецер рэвалюцыйнай буры, вецер Кастрычніка. Вучоба на бібліятэчных курсах, на першым савецкім рабфаку, у Самарскім універсітэце загартавала ідэі, погляды, імкненне хлопца. Загартавала так моцна, што пасля ўжо нішто не магло зламаць Пестрака, патушыць агонь ленінскіх ідэй у яго сэрцы, сцішыць рэвалюцыйную страсць, — ні зварот з Савецкай Расіі ў панскую Польшчу, ні трагедыя ў сям'і, калі за адзін тыдзень тыф забраў бацьку, брата і сястру, ні беднасць, што прымусіла шукаць заробак, каб карміць сям'ю, бо зямля пракарміць не магла, ні непамерная цяжкая праца на лесапільнях, ні служба ў польскай арміі і спакусы начальства зрабіць адукаванага разумнага хлопца афіцэрам...

Не, не мог той, хто зведаў волю, стаць афіцэрам арміі, якая ахоўвала інтарэсы памешчыкаў і капіталістаў. Пестрака цягнула ў іншую армію — у вялікую армію рэвалюцыянераў, змагароў за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне роднага народа.

У 1926 годзе Піліп Пестрак уступае ў рады Камуністычнай партыі. А праз колькі месяцаў — першы арышт. Але і ў турме можна працягваць змаганне. Якой зброяй? Ёсць зброя! Слова! Паэзія!

«Год пражыў у віленскай турме «Лукішкі», — піша Піліп Сямёнавіч у сваёй аўтабіяграфіі. Хочацца звярнуць увагу, што паэт не піша, як многія іншыя вязні, «прасядзеў», а **пражыў**, бо жыў ён там поўным актыўным жыццём змагара.—«Там упершыню ў нелегальным нашым часопісе «Краты» быў надрукаваны, вядома ад рукі, мой верш «Паэзія», «напісаны» ў памяці на этапных дарогах. (У пінскай турме не было паперы і нават кніг.)»

«Паэзія» — творчае крэда, творчая праграма Пестрака-паэта і рэвалюцыянера.

Больш не трэба, не трэба,
не трэба
тых жахлівых, бязвыхадных
пут!
Я даўно не малюся да неба,
Я гадую ў душы сваёй бунт!
Дай, паэзія, меч прамяністы,
слова-гарт, слова-кліч, слова-
бой!
Дай палёт мне арліны,
агністы—
гімнам-полымем біць да
нябёс!

З 1927 па 1939 — адзінаццаць год зняволення, з іх — каля двух год адзіночкі і трыццаць шэсць дзён турэмнай галадоўкі. Але за гэты час — цэлы том палымяных вершаў, якія нельга было фашыстам утрымаць за кратамі. Вершы адразу вырываліся на волю, друкаваліся ў падпольных выданнях, разыходзіліся ў рукапісах, рабіліся песнямі барацьбы. Асобнай кнігай гэтыя творы выйшлі пасля вызвалення Заходняй Беларусі. Кніга называлася «На варце».

Піліп Пестрак, член ВКП(б), актыўны грамадскі дзеяч, вядомы пісьменнік, дэпутат Вярхоўнага Савета СССР, пільна стаяў на варце заваёў Кастрычніка, заваёў працоўных Беларусі: [illegible] паэзіяй заклікаў людзей да пільнасці, бо фашызм — нямецкі — быў побач і ненажэрна праглытваў еўрапейскія краіны, раздзьмухваў пажар новай сусветнай вайны.

Зноў Піліп Пестрак, як і ў юнацтве, толькі ўжо са сваімі дзецьмі, ідзе на ўсход як бежанец. Але ў гэты раз ідзе недалёка — ад Беластока да Палесся, да Лельчыц і там, пакінуўшы сям'ю ў вёсцы ў добрых людзей, уступае ў партызанскі атрад, у праслаўленую інтэрнацыянальную армію генерала Сабурава, якая граміла гітлераўскую зграю на зямлі рускай, беларускай, украінскай.

Зноў вядомы рэвалюцыянер знаходзіцца ў самай гу-

АМАТАРАМ ЛІТАРАТУРЫ

УШЫРОКАЙ і разнастайнай літаратурнай перыёдыцы нашай краіны ў тэтым годзе з'явілася новае звяно—часопіс крытыкі і бібліяграфіі «Литературное обозрение». Адкрываючы першы нумар, рэдакцыя ў сваім слове да чытача ставіла перад сабой і перад усёй савецкай крытыкай задачу:

«Усіх літаратараў нашай краіны — інтэрнацыян а л і стаў і савецкіх патрыётаў— творча стымулюе глыбокае вызначэнне савецкай культуры, дадзенае ў дакладзе Леаніда Ільіча Брэжнева «Аб пяцідзесяцігоддзі Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік»: «...Наша культура — сацыялістычная па зместу, па галоўнаму напрамку свайго развіцця, разнастайная па сваіх нацыянальных формах і інтэрнацыяналісцкая па свайму духу і характару». Гэта абагульненне вельмі важнае і для крытыкі, для яе прафесійнай дзейнасці; іменна на такім метадалагічным грунце крытыка павінна яшчэ больш актыўна і мэтанакіравана ўдзельнічаць у развіцці нашай адзінай многанацыянальнай літаратуры, у выхаванні ў чытачоў і ў пісьменнікаў пачуцця савецкай агульнанацыянальнай гордасці».

«Литературное обозрение» з гонарам выконвае гэтую задачу. Яно шырока асвятляе сучасныя літаратурныя працэсы, творчасць усіх братніх рэспублік, у тым ліку і Беларусі. На старонках часопіса рэцэнзаваліся кнігі нашых празаікаў і паэтаў, выдадзеныя ў Мінску і Маскве, выступалі беларускія пісьменнікі з публіцыстычным словам, з расказам пра свой творчы вопыт, пра кнігі сваіх сабратоў з саюзных рэспублік.

Пра кнігу новых вершаў М. Танка «Нарачанскія сосны», выдадзеную ў Маскве ў перакладзе Я. Хялемскага, расказаў чытачам «Литературного обозрения» А. Хакімаў, пра кнігу апавяданняў і нарысаў эстонскага пісьменніка А. Хінта «Апошні пірат» — Я. Брыль. Пра аповесць В. Быкава «Дажыць да світання» і «Хатынскую аповесць» А. Адамовіча пісаў вядомы крытык І. Казлоў. На кніжку Г. Бураўкіна «Жаўранак над праспектам» рэцэнзію змясціў у часопісе Н. Злотнікаў, а Г. Бураўкін адгукнуўся на выхад новай кнігі вершаў П. Панчанкі «Снежань». З цёплым словам пра кнігі А. Пысіна, якія выйшлі ў Маскве і Мінску, выступіў І. Шклярэўскі.

З. Фініцкая прарэцэнзавала зборнік артыкулаў Ул. Гніламёдава «Традыцыі і наватарства».

Іван Мележ апублікаваў артыкул «Чый дарагі суд?» аб адносінах пісьменнікаў і чытачоў, Васіль Быкаў расказаў, як стваралася аповесць «Сотнікаў».

Дыскусію аб сучасным стане савецкай паэмы пачаў у часопісе сваім артыкулам «Паэма: крызіс ці адраджэнне?» М. Арочка.

«Литературное обозрение» знаёміць чытачоў з водгукамі на кнігі, апублікаванымі ў рэспубліканскім друку. З «Літаратуры і мастацтва», напрыклад, перадрукавана была рэцэнзія Г. Егарэнкавай на кнігу І. Мялы «Раскол».

У раздзеле «На мовах народаў свету» змешчаны водгукі прэсы ГДР аб выдадзеных там зборніку апавяданняў беларускіх празаікаў «Буслы над балотамі» і аповесці В. Быкава «Сотнікаў».

Спіс гэты можна множыць і множыць. Для рабочага і калгасніка, настаўніка і бібліятэкара, журналіста і студэнта ў кожнай рэспубліцы Краіны Саветаў часопіс стаў цікавым субяседнікам і добрым памочнікам. І нездарма супрацоўнікі бібліятэкі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта ў пісьме ў часопіс заяўляюць: «Литературное обозрение» — вельмі патрэбнае выданне для ўсіх, хто любіць літаратуру».

КЛІЧ, СЛОВА-БОЙ...“

шчы барацьбы народа са страшнейшым ворагам. І зноў у яго руках не толькі вінтоўка і граната, але і карандаш: Пестрак рэдагуе партызанскую газету, якая нясе людзям словы праўды, разам са зводкай Савінфармбюро і партызанскімі заклікамі на старонках партызанскіх выданняў гучаць вершы паэта.

Беларуская паэзія, паэзія Купалы, Коласа, Броўкі, Танка, Глебкі, Пестрака, Куляшова, Панчанкі, Астрэйкі дала класічныя ўзоры грамадзянскай патрыятычнай лірыкі яшчэ ў франтавых і партызанскіх зямлянках і ў першыя пасляваенныя гады. Гісторыя барацьбы народа за родную Савецкую ўладу, эпагеем якой з'явілася эпапея ўсенароднага змагання з фашысцкім нашэсцем і вялікая перамога, патрабавала ад пісьменнікаў глыбокіх псіхалагічных абагульненняў з шырокім ахопам падзей. Карацей кажучы, народ патрабаваў добрых раманаў і аповесцей.

Міхась Лынькоў амаль дваццаць гадоў працуе над эпапеяй пра ўсенародную партызанскую барацьбу... Набіраюць творчы разгон прадстаўнікі маладзейшага пакалення празаікаў. Сапраўдны подзвіг робіць Пліп Пестрак, ствараючы двухтомны раман «Сустрэнемся на барыкадах». Гэта — эпапея жыцця і барацьбы той часткі беларускага народа, якая аказалася пад акупацыяй буржуазнай Польшчы.

Я лічу, што нашай літаратуры проста пашанцавала, што такі раман напісаў Пліп Пестрак, сын селяніна, чалавек, які так выдатна ведае быт народа, сам актыўны ўдзельнік рэвалюцыйных падзей у Заходняй Беларусі, пісьменнік надзвычай чулы да праўды мастацкага факта і да харастра народнай мовы.

У рамане нямала аўтабіяграфічнага. Але гэты аўтабіяграфізм, тое, што ў галоўным герої Андрэі Касцевічы, мы, блізкія да аўтара людзі, пазнаём рысы самога Піліпа Сямёнавіча, — усё гэта не толькі не зніжае высокія мастацкія вартасці рамана-эпапеі, а наадварот, узнімае іх, надае ўсім фактам, калізіям, характарам надзвычайную верагоднасць, дакументальнасць у найлепшым і высокім разуменні гэтага слова.

Пліп Пестрак стварыў цэлую галерэю вобразаў падпольшчыкаў, людзей з глыбінных беларускіх вёсак, якія ад стыхійных форм змагання ўзнімаюцца да разумення марксісцка-ленінскага вучэння аб класавай барацьбе і рэвалюцыі. У рамане пераканаўча паказана, як самыя простыя людзі цягнуцца, бы да сонца, да Краіны Саветаў, як прагна ловяць кожнае слова адтуль, з Радзімы.

Аўтар не спрашчае і ворагаў. Яны хітрыя і разумныя, у іх арсенале нямала сродкаў для ўздзеяння на душы і розумы людзей. У «Сустрэнемся на барыкадах» нідзе не адчуваеш «сачынённасці», літаратурнай зададзенасці, штучнасці ў сюжэце, кампазіцыі, і ў той жа час гэта не фатаграфія з натуры — з жыцця прыроды і людзей, гэта — глыбокае мастацкае асэнсаванне ўсяго таго, што перажыў, перадумаў народ, а з народам — аўтар, яго летапісец.

Працуючы над раманам аб часе, які стаў гісторыяй, Пліп Пестрак ні на дзень, ні на момант не адрываўся ад надзённых праблем сацыялістычнага будаўніцтва. Яго цікавіла, што ж адбываецца на вызваленай зямлі, асабліва цікавіла вёска—як яна пераўтвараецца, як мяняецца псіхалогія селяніна. Пліп Сямёнавіч часты госць у родных мясцінах, у Івацэвіцкім раёне. Ды і не толькі там. У той час мне пашчаслівіла разоў колькі выязджаць у сельскія раёны разам з аўтарам «Сустрэнемся на барыкадах». Скажу шчыра, што я пазайздросціў Пестраку: усюды ў яго ў былой Заходняй Беларусі былі сябры, здавалася, амаль у кожнай вёсцы, а ў райцэнтрах то напэўна.

І яшчэ мяне зайздросна здзіўляла, як добра ведае Пестрак зямлю і як любіць яе. Некалі ў маладосці ён марыў стаць аграномам. І я думаю, што стаў ім, без дыплома, але не менш адукаваным аграномам. І гэтае шчаслівае спалучэнне агранома і праніклівага, з пільным вокам, мастака дапамагло Пестраку ўбачыць у новых калгасах, якія не без цяжкасцей набіралі моц, тое своеасаблівае, адметнае, што адрознівала гэтыя калгасы ад калектыўных гаспадарак усходніх абласцей, арганізаваных у 30-я гады. На аснове сабранага матэрыялу пісьменнік стварае раман «Серадзібор», рэч праўдзівую, глыбока псіхалагічную і для свайго часу смелую.

Цяпер на рабочым стале Піліпа Сямёнавіча новая праца, новы раман, які аўтар умоўна называе паэтычным словам «Лесавічанка».

Праца над раманам цягнецца ўжо колькі гадоў. Творчая інтэнсіўнасць у такім узросце залежыць ад многіх фактараў і перш за ўсё ад здароўя пісьменніка.

Сустракаючы Піліпа Сямёнавіча нязменна жыццярадаснага, аптымістычна настроенага, з маладой паэтычнай улюбёнасцю ва ўсё хараство жыцця, не сумняваешся, што хопіць у яго сілы скончыць і «Лесавічанку», і парадаваць чытачоў яшчэ многімі выдатнымі творамі ў розных жанрах. А жанравы дыяпазон Пестраковай творчасці шырокі: паэзія, проза — раманы і навелы, драматургія, крытыка...

Ад шчырага сэрца жадаю шаноўнаму юбіляру добрага здароўя і здзяйснення ўсіх творчых задум, пра якія ён так хораша, захапляюча ўмее расказваць сябрам.

Добрага табе, дарагі Піліп Сямёнавіч, чалавечага і пісьменніцкага шчасця!

Іван ШАМЯКІН.



З нагоды 70-годдзя пісьменніка праўленне Саюза пісьменнікаў рэспублікі накіравала юбіляру віншаванне, у якім гаворыцца:

«Дарагі Піліп Сямёнавіч!

Горача і шчыра вітаем Вас, нашага паплечніка па пяру і добрага сябра, са слаўным сямідзесяцігадовым юбілеем.

Ваш творчы шлях пачаўся ў былой Заходняй Беларусі ва ўмовах акупацыйнага рэжыму буржуазнай Польшчы. Свой яркі паэтычны голас Вы, камуніст-падпольшчык, узнялі супраць прыгнятальнікаў, клікалі родны народ на барацьбу за волю і шчасце, за ўз'яднанне з усходнімі савецкімі братамі. За рэвалюцыйную барацьбу Вас не аднойчы пілсудчыкі кідалі ў турмы. Але і там Вы не спынялі мужнага змагання.

Пасля векапомных вераснёўскіх дзён 1939 года наступіў новы радасны этап у Вашым жыцці і ў творчасці. Былі выдадзены асобнымі кнігамі Вашы паэтычныя творы. Вы далучыліся да шырокай і актыўнай грамадскай дзейнасці.

У гады Вялікай Айчыннай вайны Вы прымалі ўдзел у партызанскім руху. Пасля вайны пачалі выступаць у жанры прозы і адразу займелі шырокую вядомасць сярод чытачоў. Раман-эпапея «Сустрэнемся на барыкадах», над якім Вы шмат год працавалі, стаў яркай з'явай у нашай савецкай літаратуры. Грунтоўнае слова аб пасляваенным жыцці ў вёсцы Вы сказалі раманам «Серадзібор». Чытачы палюбілі Вашы шматлікія аповесці і апавяданні.

Вы добра вядомы як актыўны грамадскі дзеяч і публіцыст.

Мы рады, што Вы свой юбілей сустракаеце ў росквіце творчых сіл, поўныя новых задум і планаў.

Жадаем Вам, дарагі Піліп Сямёнавіч, жыццёвых удач, сонечнага настрою, моцнага здароўя, шчасця».

Рэдакцыя штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» далучаецца да гэтага віншавання і жадае Піліпу Сямёнавічу новых творчых поспехаў.

ГАДАВАЎ У НАШЫХ ДУШАХ БУНТ

Піліпу Пестраку—семдзесят. Я ўспамінаю сёння, як мы ўпершыню сустрэліся з ім у Лукішскай турме. Гэта было ў 1936 годзе. Нас тады судзіў Віленскі акруговы суд за рэвалюцыйную дзейнасць, за тое, што мы выдавалі «Беларускую газету» і сатырычны часопіс «Асва», у якіх друкавалася праўда аб гаротнай долі рабочых і сялян у Заходняй Беларусі. Працэс цягнуўся шэсць дзён. Старшынёй суда быў нехта Бжазоўскі, а абвінавачваў нас—16 чалавек—вядомы прыслужнік санацыйнага ўрада Пятроўскі. Мы ведалі, што панскі суд не злітуецца над намі, што нас чакае шматгадовае турэмнае зняволенне. Але падсудныя не вешалі галоў, не прасілі ў суддзяў ласкі.

У сваёй абвінаваўчай прамове пракурор з асаблівай нянавісцю гаварыў пра Валянціна Таўлая і Піліпа Пестрака—ужо тады вядомых у Заходняй Беларусі паэтаў. Ён называў іх самымі небяспечнымі крамольнікамі і патрабаваў самай суровай кары. На ўсё жыццё запомніліся мне тады словы Піліпа Пестрака, які ў адказ на гатае пракурорскае дамаганне спакойна сказаў:

— Вы хочаце, панове, задушыць голас праўды. Гэта яшчэ нікому не ўдавалася, не ўдасца і вам.

Прысуд быў бязлітасны: Піліп Пестрак, Валянцін Таўлай і некаторыя іншыя ўдзельнікі працэсу атрымалі па восем гадоў катаргі.

Мне давялося не адзін месяц сядзець у агульных камерах разам з Пілілам Пестраком. Як старэйшы, больш вопытны і адукаваны таварыш, ён карыстаўся сярод вязняў вялікай павагай. Мы любілі яго за тое, што ён быў нейкі вельмі просты і абаяльны. Піліп Сямёнавіч умеў з кожным пагаварыць так, што ў суразмоўніка ад гэтага як бы мацнелі крылы. Ён чытаў нам лекцыі, выступаў з дакладамі, дэкламаваў вершы. Любіў і ўмеў Піліп Пестрак расказваць аб сваіх жыццёвых прыгодах, аб літаратурных персанажах, аб усялякіх смешных здарэннях. На гэта ён і цяпер вялікі мастак. Расказвае, не спяшаючыся, з прыціскам, як бы смакуючы кожнае слова. І калі гэта што-небудзь камічнае, сам смяецца ад усяе душы, смяецца залівіста, моцна.

У агульных камерах Гродзенскай турмы Піліпу Сямёнавічу, як і Валянціну Таўлаю, нялёгка было пісаць вершы. Я часта назіраў працэс «запісвання» твораў. Адарвецца, бывала, Піліп Сямёнавіч ад будзённічыны, сядзе на лаву, возьме ў руку каменьчык і пачынае чыркаць ім па цэментнай падлозе. Напіша дватры радкі, паходзіць і зноў сядае, зноў піша. Так радок за радком.

Шмат можна было б расказваць аб турэмным жыцці-быцці Піліпа Пестрака. Аб тым, як ён, будучы старшынёй турэмнага камітэта камуны, часта, схаваўшыся пад нары, да паўночы пісаў дырэктывы вязням ва ўсе камеры. Як разам з Таўлаем рэдагаваў турэмны часопіс «Краты», дзе змяшчаліся і іх вершы. Як яму і іншым вязням даводзілася за перадачу хлеба ці кавалка цукру ў другую камеру па два тыдні спаць на голых нарах «цвёрдае ложа» або жыць на хлебе і вадзе. Як ён стойка змагаўся супраць намаганняў адміністрацыі прыраўняць палітвязняў да звычайных крыміналістаў. Як кожны дзень, кожную мінуту марыў аб часе, калі і на нашай вуліцы будзе свята.

Мяне і Піліпа Сямёнавіча павінны былі выпусціць з турмы 21 снежня 1939 года. Жартуючы, ён часта гаварыў, што як толькі выйдзем на волю, дык першым чынам купім кілаграм «розмаітосьці» — мяснога асарці—і паабедаем так, як, можа, ніколі не абедалі. І сам заходзіўся ад смеху з гэтай сваёй «гастранамічнай» мары.

Прыгадваецца мне сёння верасень 1939 года, вызваленчы паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь.

18 верасня затрашчалі турэмныя краты, і мы, выйшлі на гродзенскія вуліцы. Што рабілася ў горадзе—цяжка было зразумець. Улады ніякай, Крымінальнікі кінуліся па магазінах, а мы, палітвязні, пачалі ўзбройвацца. Трэба было дапамагчы рабочым навесці ў горадзе рэвалюцыйны парадак. Камандзірам нашым стаў Піліп Пестрак, які ведаў армейскую службу. Трэба было бачыць яго ў гэтыя гадзіны. Ён аддаваў загады, вучыў вязняў валодаць вінтоўкамі і кулямётамі, расстаўляў людзей на скрыжаваннях вуліц.

Але не паспелі мы агледзецца, як у горадзе ўзнялася стральніна. Павыпаўзалі са сваіх нораў паліцэйскія, чыноўнікі, афіцэры, асаднікі. З касцёлаў загаварылі кулямёты. Пачаліся аблавы, пад вечар таго ж дня мы зноў апынуліся ў астрозе. Назаўтра нас судзіў ваенна-палявы суд. Мы добра ведалі, што гэта такое і мужна чакалі прысуду.

Але праз дзень рабочыя гродзенскіх фабрык з чырвонымі павязкамі на рукавах адчынілі турэмныя брамы з радасным воклічам:

— Нашы ў Гродна, выходзьце, таварышы!

...Такім я ведаю Піліпа Пестрака. Ведаю як паэта-камуніста з яго непахіснай вераю у шчасце свайго народа. Барацьбе за гэтае шчасце ён з юначых дзён аддае свае сілы, свой талент, увесь жар свайго мужнага сэрца.

Якуб МІСКО.

ЭСЭ НА АДНОЙ СТАРОНЦЫ

З ім заўсёды прыемна сустрэцца.

Гэты чалавек, няйначай, нешта цікавае скажа табе пры сустрэчы—усміхнецца загадкава, тады паводзіць паміж табой і сабой пальцам і скажа, каб тое лягло добрым словам на душу і ў памяці засталося.

І ўжо зусім будзь пэўны—калі ў цябе твор недзе выйшаў (у выдавецтве ці ў часопісе), дык таксама не стане маўчаць ад зайздрасці ці па якой іншай прычыне, а скажа сваю слушную думку.

Карацей, ён заўсёды знойдзе сабе прычыну, каб нешта сказаць табе. Вось і ўчора:

— А навошта гэта ты, хлопец, носіш гэты?...—І паказвае на фацэтны берэт з куртатым брыльком. — Капялюш насі. Капялюш пісьменніку больш пасуе.—Зняў свой з галавы, пакруціў у руцэ.—Бачыш, хораша і прыстойна. І людзі тады да цябе—з усёй павагай!

І гэта—самым сур'ёзным чынам, дасціпна і далікатна, як умее гаварыць, можа, толькі адзін Пестрак.

А ты таксама ўсміхаешся, ківаеш галавой пачціва, бо ў тваім уяўленні Піліп Сямёнавіч даўно класік беларускай літаратуры. Па яго творах мы вучыліся яшчэ ў школе, па яго раманах здавалі залікі і іспыты ў інстытутах. Нездарма таму самым належным чынам згадваеш простыя словы: «Класік—гэта аўтар, якому плоцяць даніну захапленні і які з'яўляецца ў сваёй галіне аўтарытэтам». І зусім сур'ёзна ўлічваеш розныя стасункі, якія ўдакладняюць выверанае вызначэнне — «мудрасць, памяркоўнасць, лагічнасць, што ахопліваюць і падпарадкоўваюць сабе ўсё іншае», і, можа, якраз вось па гэтай прычыне не хочацца сёння прыпадабняцца зязюлі ды лічыць Пестраковы гады...

А яны ж былі! Яны ў яго, як і ў кожнага чалавека, за плячамі!

Гэта і тыя леты і зімы, дзе адно гаротнае дзяцінства, ад якога на ўсё жыццё засталася класавая нянавісць да ўсялякіх фальваркоўцаў.

І тыя, што праведзены ў турмах, адкуль пайшла бальшавіцкая нянавісць да фашыстоўцаў, як ён сам гаворыць.

Гэта і тыя...

Урэшце, самі бачыце—адну з умоў, якая павінна адпавядаць класічнаму вызначэнню, даводзіцца рашуча адкінуць: Піліп Сямёнавіч, аказваецца, не заўсёды памяркоўны. Але ўсе мы з лёгкай душой—і не толькі дзеля сённяшняга дня — даруем яму гэтакі «грэх», бо самім жа таксама ўласціва класавая нянавісць.

Затое ў пералік да папярэдніх умоў можам дадаць яшчэ адну: пастаянства. Вось ужо праўда—у сваёй любві і нянавісці Піліп Сямёнавіч заўсёды пастаянны, нязменны.

Таму і прыемна з ім сустракацца.

Таму і хораша ад усведамлення, што ў адзін з табой час жыве і працуе ў роднай літаратуры гэты таленавіты і прынцыповы пісьменнік.

Іван ЧЫГРЫНАЎ.

ПА ЖЫЦЦІ ІДУ Я З ПЕСНЯЙ

Антон БЯЛЕВІЧ

ПАМІЖ СОНЦАМ І ЗАРОЙ

Прыгнятаў нас люты голад,
Бульбаедамі былі...
Адкавалі Серп і Молат
Нам у кузні кавалі.

Серп і Молат каласамі
Апранулі плугары.
Апрануліся і самі
Сонцам, водблескам зары.
Нам прывольна,
Нам не цесна
Паміж сонцам і зарой...
Пад руку іду я з песняй,
З доляй яснаю маёй.

Як стаенніка за грыву,
Так бяру за каласы
Нашу ніву —
Наша дзіва
Небывалае красы.

Луг, нібыта за чупрыну,
За яго бяру траву.
Кожны ўзгорак і лагчыну
За сабою я заву.
У наступны дзень, у песні,
Што ўзляцелі, паплылі...
Нам прывольна,
Нам не цесна
Шматмільённым на зямлі.

ПАРТЫЗАН

Былое бачыць, як у сне,
Вяртаюць успаміны
Да смутку ў ціхім будане,
Да горкае часіны,
На тую горку, пад сасну,
Медзяную, старую,
Дзе пахаваў сваю вясну —
Сваю дачку малую.

Яе, параненую, нёс,
Шаптаў: — Жыві, крывінка...
І не данёс,
І кроплі слёз,
Упалі, як іскрынкі
З вачэй на шчокі дарагой,
На косы і на рукі...
Была працятая бядой
Пякучая разлука.

Знаёмай сцежкаю ідзе
Да ціхае магілы.
— Дзень добры, сосны!
— Добры дзень!..
Дайно адгаласіла
У лесе кожная сасна,
Бяроза і рабіна.
І папрасіла там вясна
Свісцёлкі салаўінай.

Зайграла — рэха паплыло
У луг, у поле, у сяло,
На дворыкі, на ганкі:
— Глядзі: у красках расцвіло
Бяссмерце партызанкі!

І слухаў бацька-партызан,
Бывалы, пасівелы.
На вочы плыў журбы туман,
І на душы шчымела.

ЯК Я МІЛАГА ШУКАЛА

Дзе ты, друг мой, заблудзіўся?
Дзе мне след пабачыць твой?..
Мо з пяску дубком прабіўся
Над магільнаю травой?

Мо гранітным абеліскам
На магіле ціхай стаў?..
Абышла я свет няблізкі,
Мяне дождж не раз хвастаў.

Я чарнела пад спякотай.
А яго няма... няма...
Нібы статуя Журботы,
Гэткай стала я сама...

Вецер лётае па свеце,
А няма ж яму мяжы.
Вольны вецер,
Добры вецер,
Дзе мой мілы? Адкажы!

Ускудлаціў вецер травы,
Загалёкаў вецер мне:
— Больш цябе твой кучаравы
Да грудзей не прыхіне!

Прыхінуўся сам ён чубам
Да няскошанай травы.
Не пабачыць ужо любы
Сонейка і сінявы
На высокім небе гэтым,
Над чупрынамі лясоў.
Адзвінела тваё лета
Звонам спелых каласоў...

Сцежкай вузенькай у травы
Я іду ў журбе, бядзе.
Ажно гляну: кучаравы,
Ненаглядны мой ідзе!

Паблукаў па белым свеце,
Вораг куляй не скасіў...
Што наплёў мне вольны вецер?
Што ж ты, вецер, нахлусіў!

СУТЫКНЕННЕ ЭПОХ

Пад страхой саха — крывое гора.
Выгналі мы гора за парог...
Слухаю я музыку маторай,
Бачу сутыкненне дзвюх эпох.

Цэркаўка старая на пагорку.
На страсе гнілой — зялёны мох.
А ў палацы лямпачкі, як зоркі.
Гэта — сутыкненне дзвюх эпох.

Злыдні сеюць буру і калецтва,
І глядзяць пачварамі з бярлог.
Мы вядзём да шчасця чалавецтва.
Гэта — сутыкненне дзвюх эпох.

Стануць Зло і Крыўда на калені,
Скруціць іх жыццё у баранні рог.
Будзе жыць высокае сумленне,
Праўдзе нашай — тысячы дарог!

МНЕ ЦЫГАНКА ВАРАЖЫЛА

Пасвіў я кароў на тым узлеску,
Дзе спынілі фуру цыганы.
Іх агонь пад елкаю патрэскваў,
А над ім віселі чыгуны.

Мне тады цыганка варажыла,
Бачылі каровы і кусты.
Гаварыла: — Буслік, лёгкакрылы,
Аксамітны мой і залаты,
На тваёй далоні прачытала, —
Нібы кніжачка, твая далонь:
Будзеш ты вялікім генералам,
Будзе цябе несці добры конь...
Хітрая цыганка не ўгадала,
Нахлусіла ёй мая далонь:
Я не стаў, вядома, генералам,
Не падбрыквае мой добры конь.

Праз маё жыццё іду я пешкі,
А было часінай цяжка мне,
Аглушылі бомбы, як даўбежкі,
Маладую долю на вайне.

Толькі долю гора не зламала,
Не схіліла гордай галавы...
Я не стаў, вядома, генералам,
А такой бяды!
Я — радавы
У сваім жыцці,
маёй рабоце,
Не зайздрошчу поспехам сяброў.
Толькі не апошні ў дружнай роце
Добрых запявал і песняроў.

ДУБ

Ён выйшаў з яловага змроку
На ўзлесак, на росны лужок.
У летнюю млявую спёку
Дае ён касцам халадок.

Ён іх прыкрывае ад ліўня
Пад шапкай зялёнай сваёй.
Сукі, нібы маманта біўні,
У кроне яго векавой.

Праколе ён біўнямі хмару,
Не пусціць плысці на лясы;
Напоіць лугі і папары,
Напоіць дажджом каласы.

Ад пят і да самай чупрыны
Умыецца сам велікан...
На біўнях трымае хмарыну,
Ахутаны ў ціхі туман.

Туман адплывае патрошку
Па роснай траве, па вадзе.
А дзесьці далёкай дарожкай
Чырвонае сонца ідзе.

Падыдзе, прысядзе на дубе,
Пагладзіць лісты і кару:
Пастукае ў ствол, як у бубен,
У дзень навальнічны пярун.

Папругаю зыркай маланка
Яго падпярэзвае стан.
А ён кавалер-велікан
Вартуе бярозу-бялянку,
Хаця б не зламаў ураган.

Хаця б не пакінуў бяду ён,
Хусціны не змёў з галавы...
Так жонку сваю маладую,
Напэўна, шануеце вы?

ПЕРАПІС НАСЕЛЬНІЦТВА

— Колькі, дзед, табе гадоў?
Гавары. Запішам.
— Як на дубе жалудоў,
Як на елцы шышак.
Палічы і запішы,
Не палічыш — многа.
Не па роўненькай шашы,
А крывой дарогай
Я ішоў і нёс бяду
За плячыма ў торбе.
Еў ваду,
І піў ваду,
Плечы ў горы горбіў.

— Дзед, канкрэтна гавары,
Колькі год пражыта?
— Я ж — канкрэтна...
Лад стары,
Генералаў сытых
Заганяў у жоўты жвір,
Вёў у бой Будзённы.
От быў, хлопцы, камандзір!
Праляціць — пагоны
Залатыя на пяску,
На траве зялёнай,
На прымятым вераску...
Друг мой — сам Будзённы!

— Колькі ж нам пісаць гадоў?
— А гадоў
Як жалудоў
На высокім дубе... —

І, стары, на зрубе
За вянцом кладзе вянец,
Прыганяе гладка.
Дык на тое ж ён баец
Будзёнаўскай хваткі!

Зялёнае рэха

Раман САБАЛЕНКА

АДНЕКУЛЬ здалёку-здалёку далятала сюды рытмічнае дзятлава «тук-тук»... Мо раней, чым звычайна, птушка вылецела на працу? І завіхаецца вунь які Мо дзетляняты падраслі і просяць больш чым раней есці? А мо за ноч сам вычухаўся! У кожнае з жывой істоты свае законы, свае песні, свае клопаты.

Ні ў дзяцінстве, ні ў юнацтве я ніколі падоўгу не жыў у лесе, і, калі праўду казаць, трошкі пабойваўся лясной таямнічасці. Здавалася, за кожным дрэвам мяне падцікоўвае якая невядомасць. А яна ж, невядомасць, заўсёды трывожыць і нават палохае чалавека. І калі ступаю на лясны дол, здаецца мне, што не іду, а крыляю.

Нелесавых людзей калісь звалі палевікамі. На лесавых людзей я калісь глядзеў, як на нейкіх адметных. Памятаю, як кожнае лета навозілі яны да нас грыбы, ягады. Мы куплялі ў іх, ці выменьвалі, як ласунак. Мне здавалася, што лесавікі інакш, чым мы, палевікі, думаюць. Інакш усё робяць.

Як толькі мы прыязджаем у «Крынічнае» (дачны песёлак не дужа далёка ад горада), я стараюся стаць там сапраўдным лесавіком. У наваколлі з большага ведаю дарогі, асабліва адну, што выбягае з нашага пасёлка, прастуе праз густы зараснік лесу, і, вырваўшыся на прастор паўз самае ўзлессе, бяжыць некуды далёка-далёка, пакуль не губляецца ў палявой зеляніне.

Я люблю гэтую дарогу за яе ўвішнасць. Мо таму люблю яе, што яна то палявая, то лесавая.

Кожнае раніцы выходжу надыхацца пахкім паветрам. Змешанае, яно п'яніць, як той кактэйль. Смачнае, водарнае—усё б ты яго піў і піў.

А на невялікім мысочку, які сваім рознатраўем укліняецца ў лес, ляжыць вастрыём угору, мой запаветны камень. Камень той аброс ужо муравою. Чамусьці, як толькі я даходжу да каменя, адчуваю прытомленасць і быццам мімаволі саджуся адпачыць. Зялёнае рэха лесу прыносіць мне розныя гукі, я аж упіваюся, слухаючы іх. Часам нават сам не магу ўшалопаць, дзе я — у полі, ці ў лесе.

Люблю я гэтую дарогу, якая як бы адмяжоўвае поле ад лесу. Яна не дужа ўтаптана. На зялёнай грудзіне яе відны вілюжыны каляін. Яны глыбакаватыя. На момант здаецца, што іх нехта знарок прачарціў, каб людзі не забыліся на калёсныя дарогі, бо машынныя не такія: яны шырэйшыя і тарнейшыя. Гэтыя чамусьці асабліва любы майму сэрцу. Мо таму, што з самага дзяцінства я іх бачыў, я іх тарыў?!

З лесу-гушчарніку дарога выбягае на зарослую палянку. Яшчэ можна заўважыць, што гадоў колькі назад тут была самая сапраўдная палянка. На ёй цяпер паліць свае свечы малады сасонік. І яна хутка зусім зарасце. На кожнай маладой сасонцы, што ні год, то свечка.

Я люблю пастаяць на краю палянкі. Люблю паглядзець на дзве старыя парэпаныя сасны, якія нібы зялёныя весніцы, адчыняюць дарогу ў дрымотна густы лес. Гэтыя дзве сасны як бы хто пасадзіў знарок, і яны адчуваюць сябе вартавымі.

А ўсё ж я не магу стаць канчаткова лесавіком. Не ў адным, дык у другім выявіцца мая, калі можна так сказаць, палявая сутнасць. Зайздрошчу сваёй Марыі Фролаўне. Яна хоць і нарадзілася ў горадзе, а ўсё ж ад лесавічкі ў яе больш. Праўда, мабыць, кажуць: на ўсё трэба мець свой талент! Як не кожнай раніцы, яна выходзіць з нашага дамка і па гліцы, па апаламу лісцю, струхнеламу голлю ідзе і, здаецца, сама дакладна не ведае куды. Ды ідзе і ніколі не вяртаецца з парожнім кошыкам—то грыбы нясе, то ягады: чалавек у лесе можа заўсёды знайсці сабе пажыву...

У «Крынічнае» мы пачалі ездзіць не так даўно. Першы год я ўсё баяўся заблудзіцца. У першы раз, калі мы прыехалі сюды, я перакалаціўся за сваю Марыю Фролаўну. Не паспелі мы злезці з машыны, сёе-тое ўпарадкаваць, як яна знікла. Нікому нічога не сказаўшы, пайшла ў лес. І доўга-доўга яе не было. Думаў—заблудзілася. Шукаць? Паспрабуй яе знайсці: лес—не жартачкі!

Жонка вярнулася ўжо на змяркані з поўным кошыкам грыбоў. Баравічкі, так званыя «жытнікі», былі карычневенькія, крамяненькія.

— Дзе? — аж загарэліся мае вочы.

— Тут! — махнула наўкруг рукою жонка.

Нагледзеўшыся на жончыны поспехі, я вырашыў таксама пахадзіць па лесе. На другі дзень наўмысна выйшаў з дамка амаль на змярканні.

У лесе дужа многа дарог і дарожак пад нагамі. Здавалася, пройдзе чалавек і пакіне за сабой сцежку. Лясная далячынь намітусь спаласавана імі. Яны бягуць, даганяючы адна адну, праз гушчары, праз рэдкалессе, праз нізіны і палі.

Мабыць, такая ўласцівасць лясных дарожак—сцежак: здаецца, кожная з іх вядзе туды, куды табе трэба, кожная з іх—твая.

Спяшаюся дайсці хутчэй да тае мясціны, якую я ведаю. Вось-вось павінен паказацца рубеж яе. А яго ўсё няма і няма. Змрок гусцее і гусцее. Патухлі раздробленыя зялёнай лістотай сонечныя пікі-промні і нібы зніклі дрэвы. Засталося цемрыва.

Дарожка як упёрлася ў глухую мураваную сцяну, не пераскочыш, не пералезеш. Спыніўся і стаў думаць: што гэта? І канчаткова разгубіўся — не ведаю куды ісці. Дайшло да свядомасці: заблудзіўся! Пачаў крычаць: ого-го! Зваць на дапамогу. Як у калодзеж. І рэха не чутно было. Ці і яно таксама заблудзілася? А мо яно купалася ў росным зялёным лісці, і гэтак было занята, што нічога не чула. А мо хто глушыў яго? Куды ісці? Каго клікаць?

Знайшоў валежыну. Відаць, нядаўна паваліў вецер елку-сухастоіну. Наламаў сухога голля і неўзабаве яно весела затрашчала на агні. Добра, што запалкі ў кішэні знайшліся. З таго часу, як кінуў курыць, я іх рэдка калі нашу.

Агонь прыгрэў мяне трохі. Выйшаў я з дому ў адной кашулі-безрукаўцы, і вечаровы халадок браў за голыя рукі. То адным, то другім бокам я паварочваўся да агню, і калі ад вогнішча кідаў вачыма на лес, ён здаваўся непраглядна цёмным.

Недзе, мабыць, далёка затрашчала голле. Схапіў я ў рукі добры дручок. Падумаў сам сабе: «Калі што якое, не дамся жывы ў рукі ні чалавеку, ні зверу». А нешта трашчала і трашчала. Жах —аж валасы мае дыбком. Стаў, замахнуўшыся дручком. Бачу па ледзь улоўных абрысах: чалавек. Чую: уздыхае, стогне. Ступіць яшчэ крок, другі і апынецца ля агню. Мая душа недзе ўжо ў пятках. Дручок мой неяк вымузкнуўся з рук і ўпаў. Калі б і захацеў выцяць прышэльца, дык не выцяў бы.

— Калі добры чалавек, дык добрай ночы, — чую я старэчы голас.

— Як ты добры, дык і да цябе буду добры. Падыходзьце, грэйцеся!

— Дзякую, галубе.

Я гляджу на таго, што прыйшоў, і не магу разгледзець, што за ён. Немалады мужчына—раз кульгець, другі кульгець і стогне. Відно, яму вельмі баліць. Нешта на правую нагу не становіцца.

— Што з вамі? — пытаю.

— Ды от. Гэта ж абязвечыўся, — заікаецца стары голас.

— Дзе гэтак вы?

— Ды от сама нага вінавата. Уночы павінны бачыць не толькі вочы, а і ногі. А от мая аслепла і ўляцела ў той акоп, што ў вайну немцы тут выкапалі. І тут жа з партызанамі ваявалі. Хацелі нас у зямлю ўсіх пазаганяць, нячысцікі... Кажу вам: нага сама вінавата. Ды можа яна і зламалася. Вельмі ж баліць, — уздыхнуў, стогнучы, дзед.

— У вас, мабыць, звіх?

— Ото ж, дзетка, звіх! Звіх! Бо каб зламалася нага, я ж бы на яе не ступіў. А то хоць з дручком ды прыцёгся ж сюды.

На дзеда падаў бляск ад агню і відно было, як яго твар свяціўся не толькі ад полымя, але і ад радасці, што сустрэў мяне.

—Дык вы прыляжце тут,—паказаў я на грудок.—Паспрабую вас палячыць.

— Хіба вы ўмееце правіць косці? — папытаў дзед.

— Калісь, як быў на вайне, дык даводзілася.

— Калі тады ўмеў, то і цяпер успомніш. Такое не забываецца,—сказаў з упэўненасцю дзед, кладучыся на намошчанае мною шумавінне.

Я стаў на каленцы. Узяў дзедаву нагу за лапаць. Пацягнуў на ўсю сілу. Крутнуў. Нешта слаба трэснула. І не трэснула, а шчоўкнула. Дзед аж войкнуў і амаль адначасова са стогнам з палёгкай вымавіў:

— От дзякую! Добра, што, чалавеча, служыў у салдатах...

Дзед быў у кажушанай бравэрцы, якія звычайна людзі апранаюць у халады. Я дапытліва зірнуў на старога, і ён гэта заўважыў.

— Ды ты, мабыць, думаеш: ці з таго я, ці з гэтага свету.

— Не! Чаму! Стары чалавек.

— Не кажы ты мне, дзетка! Бачу, што думаеш. Я з Замошша. Дзед Кажушка. Мяне там не толькі людзі, усе ведаюць. Дык нават сабакі. Ніводны лішне не брахне. А чаму ў лапцях? У нашым Замошшы іх ніхто не носіць. Ніхто іх і плесці не ўмее. Гэта ж я адзін і пляту, і нашу іх. Хадзіць па лесе ды на пакошы, спасабнейшага абутку і не знойдзеш. От, брат, як!—сказаў дзед Кажушка і і стаў на ногі, быццам яму лапці памаглі.

Дужыўся, каб не застагнаць. Ступіў адзін, другі крок і разышоўся. Пачаў хадзіць вакол агню. Хадзіў і радаваўся.

— О, чалавеча, добра. Дзякуй богу, што я натрапіў на твой агонь. А калі б пры гэтым агні ды сядзеў не ты, нагу б мог згубіць.

— Вы, дзед, і фантазёр добры! Лепш раскажыце, што з тутэйшых гісторый: пра гэты лес, пра сваю жытку...

— А што пра нашу жытку! Пражылося, як у ступе стаўклося. И от я вам раскажу не пра лес, пра возера. Вы ж, мабыць, ведаеце наша «Ласінае возера»,—дзед то на «ты», то на «вы» звяртаўся да мяне.

— Бачыў! Там жа нічога цікавага няма. У ім мо і вады па калена?

— А тры купіны пасярэдзіне бачыў?

— Ну, бачыў!

— Дык то ж не купіны. То ж крыніцы.

...— То ж было даўно-даўно. Мабыць, яшчэ за царом. Гэты лес быў панскі і мужычая нага сюды не ступала. А мы, яшчэ тады падшыванцы, дабраліся да самага возера. Ды не з парожнімі рукамі. Прынеслі на сабе човен і дзве насілы. Ні лясніх, ні пан, ні хто нас не асачыў. Прабраліся завідна от туды, дзе высокія пні стаяць. Прыпалі ў траве, прыніклі і ляжым. Аж бачым на тым беразе возера з гушчару нешта вылазіць. Голле трашчыць.

— Спалохаліся?—запытаўся я.

— Ды не спалохаліся. Нас багата было. Дручкі, як пабярэм, дык каго хочаш маглі звяваць.

— Ну і хто то быў?—брала мяне цікавасць.

— Спачатку рогі, як голле сушняку, з гушчару паказаліся. А потым першы сахаты выйшаў. Мабыць, важак іхні? Храпануў ноздрамі. Агледзеўся вакол і ў ваду. Следам за ім рагатыя і бязрогія —ласі і ласіхі. Гэта яны прыгожа плавалі. Мы аж залюбаваліся. Хораша было бачыць, як мудрагелістыя ласіныя рогі, быццам самі адны плылі. Ласёў з вады не відно было. І ласіх не відно было. Бязрогія іх галовы здалёк здаваліся купінамі. Нехта з нас не вытрымаў, кашляну́ў. Ласі наставілі вушы. Важак хуценька вывеў іх з возера і неўзабаве яны зніклі ў гушчары. Мы асмеліліся, сцягнулі з берага човен і гуртам паплылі па той глыб.

— А там сапраўды быў глыб?—запытаўся я.

— Ды які! Звязалі дзве насілы і не маглі дастаць дна. Я ж, мабыць табе яшчэ не казаў, што ў людзях тое возера звалася «Бяздоніцай». Пасля таго, як мы падглядзелі тое ласінае купанне, замашанцы часта хадзілі палюбавацца жывёлінамі. З тых пор і возера перазвалі. Сталі зваць яго «Ласінае возера». Цяпер дык мо і забыліся ўжо, што яно звалася «Бяздоніцай». Нешта абмялела. Мо крыніцы перасталі біць?

— А цяпер ласі тут вядуцца?—зацікаўлена, быццам паляўнічы, запытаўся я ў дзеда Кажушкі.

— Вядуцца! І цяпер яны ходзяць на возера. Толькі не купацца. Ваду піць прыходзяць.

Тым часам нахопліваўся ўжо світанак. Я хоць і не ведаў, у які бок ісці, не баяўся ўжо лесу. Быў я не адзін.

(Заканчэнне на 14 стар.).

РЭЖЫСЁР—АРГАНІЗАТАР СЦЭНІЧНАГА ЎВАСАБЛЕННЯ ТВОРА

ЖАНР ПРАЧЫТАНАГА і ЖАНР ПАКАЗАНАГА

«БЕЗЫМЕННАЯ ЗОРКА» М. СЕБАСЦЬЯНА У АКАДЭМІЧНЫМ ТЭАТРЫ Я. КУПАЛЫ

У ДАЛЕКІМ стэпе (ці сярод лясоў і балот) загубіўся невялічкі горад. Тысяч восем насельніцтва. Ёсць школа, вакзал, універмаг, бальніца і паліклінічны ўчастак. Маецца і тутэйшая інтэлігенцыя. Свае вывучы, свае правілы паводзін — акрэсленыя інструкцыямі і кантраляваныя дазорцамі маралі. Такую экспазіцыю твору дае румынскі драматург М. Себасцьян, падказваючы нам, што тут жывуць адзін ці два вар'яты, тэта значыць людзі, сваімі поглядамі або ўчынкамі вельмі адметныя ад большасці. Іх бяскрыўдныя дзеянні могуць быць матэрыялам для камедыі — ці ж не абярэцца натоўп вакол такіх дзівакоў, каб пасмяяцца з іх недарэчных учынкаў?

Для якога іншага жанру можа даць матэрыял наступны сюжэт. Двое маладых яшчэ хлопцаў, не маючы сродкаў, ахвяруючы астатні грош ад мізэрнае зарплаты, імкнуцца дасягнуць пастаўленай перад сабой мэты. Адзнаму з іх (яго прозвішча Удра) не хапае англійскага ражка, каб выканаць сваю Першую і адзіную пакуль што — сімфонію. Ужо ёсць назвы ўсіх чатырох частак — алегра, андантэ, скерца і зноў алегра: ёсць і падпісны ліст на збор сродкаў для набыцця інструмента... Сябра Удры (яго завуць проста Настаўнік), чым можа, спрыяе таварышу, хоць і сам нядаўна пазычыў патрэбную суму на рэдкую навуковую кнігу. І Настаўнік зрабіў адкрыццё, вартае ўвагі: знойдзеная ім зорка не значыцца ані ў адным каталозе свету...

Пошукі і клопаты двух сяброў, як здаецца, — матэрыял для высокай **драмы**. А ці ж не **трагедыя** гэта, што чалавек, утрапёны ў сваё адкрыццё, можа закахацца ў першую сустрэчную, і, пакінуты ёю, потым назаўсёды гіне для «найвялікшага пачуцця», для сям'і, для ўсяго, што не звязана з яго навуковым адкрыццём?!

І яшчэ — хіба ж не рамантычная **паэма**, песні вартыя юнак, які ўглядаецца ў далёкае неба і чакае Яе, сваю зорку, не зважаючы на самыя яркія мясцовыя святлілнікі, — нават ведаючы, што «зоркі ніколі не адхіляюцца ад свайго шляху», а над яго гарадком арбіты чароўных зор не праходзяць.

П'еса М. Себасцьяна «Безыменная зорка» (пераклад А. Вярцінскага) патэнцыяльна ўтрымлівае ў сабе матэрыял усіх гэтых жанраў — камедыі, драмы, трагедыі, рамантычнай паэмы. Поўны і выразна акрэслены ў ёй сацыяльны фон газэй. І ад рэжысёра залежыць, як загучаць і звяжуцца яна на сцэне: будзе тэта гімн чалавеку-творцу, апафеоз яго мары, ці вострая сатыра на буржуазны свет, што душыць усялякую спробу да саматоднасці, імкненне да паэзіі і хараства. Спектакль можа стаць і псіхаграфічным аналізам таго, як гаротуецца асоба ў змаганні з маралізуючымі індывідуалістаў, **растворанымі** у шэрай масе мяшчанства.

Чым жа стала «Безыменная зорка» на сцэне Акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы ў пастаноўцы рэжысёра Андрэя Андросіка?

Увесь першы акт — камедыйны, за кошт майстэрства З. Стомы і цікавага ансамбля выканаўцаў — М. Захарэвіч і Н. Піскаровай (Невядомая), Б. Дакальскай і Р. Кашэльнікавай (мадмуазэль Куку), А. Луцэвіча (Ікім), Ф. Варанецкага (Настаўнік). Тут рэжысёрскім наганарні зліліся з акцёрскімі пошукамі і далі нешта зусім поўнае ў жанравых адносінах.

Другі акт дае менш магчымасцей для камедыйнага рамені ад свяцілаў надаюць маштабнасць сціпламу лакойчыку Настаўніка і ўздымаюць над светам Яго і Яе — Невядомую. Але А. Андросік чамусьці стрымлівае праявы летуценнасці, акрыленасці і толькі часам дазваляе Настаўніку і Удры нібы ўзляцець на крылах мары і фантазіі. Гэты акт у спектаклі па-рэжысёрску заземлены зусім бытавым характарам спаткання прыгожай сталічнай дамы, якая па свайму капрызу ўцякла ад мужа з казіно сюды, у плебейскую каморку правінцыяльнага фантазёра.

Пачаўшы спектакль у звычайным бытавым плане, А. Андросік і далей па інерцыі робіць акцэнты на поўнай сканасці героіў нормамі паўсядзённых паводзін. Стварэцца ўражанне, што ён не адпускае «ў неба» дзейных асоб на цэлы акт. І другая дзея іграецца так, што персанажы часцей усяго выходзяць жывымі **ілюстрацыямі** на тэму колішняга правінцыяльнага жыцця ў Румыніі. Таму і акцёры іграюць роль тут больш прыземлена, дазваляючы сабе асобныя моманты духоўнага ўзлёту.

Апошні акт. Прыязджае стомлены ад бяссонной ночы і звыклы да капрызаў маладой жонкі багаты сталічны **інтэлігент**, трохі спустошаны рацыяналізмам (у выкананні Л. Рахленкі), або рана расчараваны ў фантазіях свецкі малады чалавек, якому ўжо даўно ясна, што рамантыка не для яго (у выкананні А. Мілаванава). Яго завуць Грыг. На сваім аўтамабілі ён па плану вядзе поўнай экзальтаванай жонкі і знаходзіць яе ў... «экзатычным свінуніку». Выслухоўвае захапленні раздуранай маладзіцы з «вышэйшых сфераў», здзекуецца з праставатых мясцовых «Галілея» і «Моцарта» — і ад'язджае. Праўда, ён плоціць за экзотыку і жончын начлег: падпісваецца на набыццё англійскага ражка для Першай сімфоніі Удры.

Зноў матэрыял для **камедыі**: Настаўнік сур'ёзна просіць рукі Невядомай у Грыга, якога она называе ...братам. Тут смешным выглядае Настаўнік, а Грыг выклікае захапленне ў жыхароў правінцыяльнага гарадка.

У інтрыгу ўсё больш уладна ўступае жорсткі рацыяналізм. Невядомая пакідае Настаўніка і ўздымаюць над светам Яго і Яе — Невядомую. Але А. Андросік чамусьці стрымлівае праявы летуценнасці, акрыленасці і толькі часам дазваляе Настаўніку і Удры нібы ўзляцець на крылах мары і фантазіі. Гэты акт у спектаклі па-рэжысёрску заземлены зусім бытавым характарам спаткання прыгожай сталічнай дамы, якая па свайму капрызу ўцякла ад мужа з казіно сюды, у плебейскую каморку правінцыяльнага фантазёра.

Пачаўшы спектакль у звычайным бытавым плане, А. Андросік і далей па інерцыі робіць акцэнты на поўнай сканасці героіў нормамі паўсядзённых паводзін. Стварэцца ўражанне, што ён не адпускае «ў неба» дзейных асоб на цэлы акт. І другая дзея іграецца так, што персанажы часцей усяго выходзяць жывымі **ілюстрацыямі** на тэму колішняга правінцыяльнага жыцця ў Румыніі. Таму і акцёры іграюць роль тут больш прыземлена, дазваляючы сабе асобныя моманты духоўнага ўзлёту.

Апошні акт. Прыязджае стомлены ад бяссонной ночы і звыклы да капрызаў маладой жонкі багаты сталічны **інтэлігент**, трохі спустошаны рацыяналізмам (у выкананні Л. Рахленкі), або рана расчараваны ў фантазіях свецкі малады чалавек, якому ўжо даўно ясна, што рамантыка не для яго (у выкананні А. Мілаванава). Яго завуць Грыг. На сваім аўтамабілі ён па плану вядзе поўнай экзальтаванай жонкі і знаходзіць яе ў... «экзатычным свінуніку». Выслухоўвае захапленні раздуранай маладзіцы з «вышэйшых сфераў», здзекуецца з праставатых мясцовых «Галілея» і «Моцарта» — і ад'язджае. Праўда, ён плоціць за экзотыку і жончын начлег: падпісваецца на набыццё англійскага ражка для Першай сімфоніі Удры.

Зноў матэрыял для **камедыі**: Настаўнік сур'ёзна просіць рукі Невядомай у Грыга, якога она называе ...братам. Тут смешным выглядае Настаўнік, а Грыг выклікае захапленне ў жыхароў правінцыяльнага гарадка.

У інтрыгу ўсё больш уладна ўступае жорсткі рацыяналізм. Невядомая пакідае Настаўніка-ўзнёслую мару, больш **шырока** акрэслі ў ёй яго асобу.

Дакладней, як здаецца, суаднёс «горнае і салённае» ў характары самадзейнага кампазітара Удры артыст А. Памазан. Яго паэтычны герой асцярожна і стрымана вылўляе сваю наіўнасць, шчырасць, харастве.

Як вядома, п'есу драматург пісаў ва ўмовах фашысцкага рэжыму ў Румыніі (1944 год). Ён вымушаны быў падкрэсліваць прыватны, бытавы характар адлюстраваных падзей і менш акцэнтаваць сімволіку антыбуржуазнага пафасу свайго твора. Гэтым можна растлумачыць некаторую жанравую, умоўна кажучы, «хістжасць» «Зоркі. ..» Тэатр навінен улічваць спецыфіку п'есы і зусім выразна вызначаць жанр спектакля.

У спектаклі на купалаўскай сцэне запамінаюцца і начальнік вакзала, і маруда Ікім (А. Луцэвіч), і своеасаблівая, адметная вучаніца (Н. Качаткова), і Куку, і Грыг, і, канешне ж, Невядомая... Гучыць пранікнёная музыка А. Янчанкі... Але не адчуваецца лейтматыву спектакля.

Вызначэнне жанру — гэта праблема засталася перад тэатрам і цяпер, хоць спектакль ідзе, і трымае ўвагу, і запамінаецца, як большменш паслядоўны сцэнічны пераказ чароўнай казкі: у жабрацкую каморку, дзе жыў паэт, апусцілася далёкая зорка, да якое бясконцымі начамі імкнулася яго душа. Яе прывабіла чыстае трапяткое сэрца, а потым... усё было разбурана надакучлівым рацыяналізмам.

Уладзімір ІСКРЫК.

МАЛЬЕР ПІСАЎ З РАЗЛІКАМ НА АКЦЁРА

КАМЕДЫЯ «ПРЫТВОРНАХВОРЫ» МАЛЬЕРА У ГОМЕЛЬСКІМ АБЛАСНЫМ ТЭАТРЫ

НА ДРАМАТУРГІІ Мальера тэатр вучыцца. Нават самы вопытны калектыў здабывае нейкія карысныя і неабходныя для далейшага творчага росту ўрокі, іграючы яго п'есы. Прыгадаем, што вялікі Станіслаўскі прапаноўваў вучням успоміць мальераўскія пастаноўкі. «У вас заскакуць у вачах... тэатральныя Арганы, Клеанды, Клацільды, Сганарэлі, падобныя адзін да аднаго, як кроплі вады... А дзе ж Мальер? Ён схаваны ў кішэні мундзіра. Яго не бачыш за традыцыямі... Што можа быць больш сумнага, чым мальераўскія традыцыі на сцэне!» З таго часу прайшло многа гадоў, тэатр даваў прыклады і сапраўды творчага пераадолення заштампаваных традыцый выканання п'ес Мальера, і слынога паўтарэння іх. Часцей за ўсё адыход ад старых узораў, ад Мальера «наогул», гэткага сярэднеарыфметычнага ўвасаблення, адчуваецца ў тым, што рэжысура і артысты стваралі знешнае яркае відовішча «паводле» Мальера.

Ці не тое ж адбылося на сцэне Гомеля, калі на ёй рэжысёр Г. Вагаў паставіў «Прытворнахворага»? Прынамсі, нам здаецца, што і тэкставая перабудова камедыі, і змены ў складзе дзейных асоб, і перанасычанасць спектакля рухам, танцамі і музыкай даюць права гаварыць пра тое, што мелася на ўвазе—стварыць менавіта відовішча. Таму з «Прытворнахворага» выкраслены чатыры аўтарскія персанажы — доктар Пургон, аптакар Флеран, натарыус Банфуа і дачка Аргана Лізон; з іншай п'есы з'явіўся слуга Каўель; удзельнікі некаторых інтэрмедый таксама завандравалі сюды аднекуль «збоку». Калі па-творчы задумацца над сэнсам такой рэжысёрскай пераманціроўкі, то поўную рацыю ў ёй адчуваеш: цяпер тэатр і кіно нагул адкідаюць састарэлае, зацягнутае, залішне падрабязнае нават у Шэкспіра. Ёсць моманты і ў Мальера, каторыя для нашых сучаснікаў гучаць або архаікай, прыкметамі далёкага XVII стагоддзя ў Францыі, або не абавязковымі элементамі сюжэтнага развіцця камедый. Такім чынам, Г. Вагаў як рэжысёр меў права «ўмешвацца» ў тэкст.

Праўда, заўважым, што «Тарцюф» Станіслаўскага, паказаны ў канны трыццатых гадоў, ставіўся з мэтай паглыблення ў кожнае слова і кожнае сцэнічнае рашэнне, напісаных і прадугледжаных аўтарам. Нагул, відаць, салую арыгінальную трактоўку класічнаму твору драматургіі можна даць «унутры» кананічнага тэкста. Бо дыскаверы, напрыклад, каб раскрыць нешта нават такое ў сімфанічных або оперных творах, кардынальных змен у партытуры не ўносяць! Чытальнік не перастаўляе строфы ў вершах... Апрацаванай можа быць пераробка п'есы тады, калі тэатр сваім варыянтам удакладніце і ўзмацніце ідэйна-мастацкае гучанне даўно вядомага твора, з пазіцый сучаснасці асвятляе сутнасць адлюстраваных драматургам з'яў.

«Прытворнахворы» на гомельскай сцэне атрымаўся вясёлым і вынаходлівым спектаклем-відовішчам. Тэатр смяецца і здзекуецца з таго, што дурнаваты, але багаты парыжскі буржуа Арган прыкідваецца хворым, каб не траціць улады над людзьмі і ажыццяўляць свае мэты. Выканаўца ролі павінен псіхалагічна абгрунтаваць яго паводзіны, раскрыць матывы ўчынкаў. Ды скарачэнні ў тэксце не толькі самога Аргана, а і яго партнёраў па сцэне — Беральда і Беліны, не магілі не адбіцца на ігры акцёра В. Онікі. Ён вымушаны карыстацца знешнімі прыёмамі паказу ўнутранага стану героя. А іх не набярэш так, каб яны не паўтарыліся. Вось і атрымлівецца, што сцэнічны партрэт галоўнага прайдзісвета (Арган — спружына інтрыгі камедыі) выглядае аднастайным — у жэстах, мімідзы, інтанацыях. Прыёмы пакрысе з неабходнасці падмацаваць духоўнае жыццё героя ператвараюцца ў самамэту—яны прызначаны толькі для таго, каб павесяліць публіку.

Дазволім сабе яшчэ раз працытаваць Станіслаўскага. Мальераўскі «Тарцюф — не проста пан Тарцюф, а ўсе чалавечыя Тарцюфы, разам узятыя». Такая ж ступень мастацкага абагульнення ёсць і ў вобразе Аргана ў Мальера. Ды манера выканання ролі, прадыктаваная рэжысурай і адкрыта відовішчным характарам спектакля, зводзіць усе акцёрскія намаганні В. Онікі да таго, што на сцэне дзейнічае толькі... «пан Арган». Замест гіпербалізацыі пэўных рысаў і нават «філасофіі» гэтага буйнага прайдзісвета — дробныя рысачкі, прыватныя заганы, жанравыя фарбы.

Побач з Арганам мы чакаем убачыць і медыкаў-прайдзісветаў. Драматург, дарэчы, заўсёды ваяўніча выкрывае розных невукаў і прыстасаванцаў. Вобраз Беральда і напісаны ім з гэтай мэтай. Сатырычнага завастрэння персанажа ў артыста М. Пало не атрымалася. І зноў жа тут больш вінаваты рэжысёр, які скараціў яго тэкст. Як і выканаўца ролі другой жонкі Аргана Беліны артыстка Г. Макоўская, М. Пало з пэўным рамесніцкім умельствам выконвае мізансцэны, прапанаваныя рэжысёрам, вымаўляе тое, што засталося ад тэксту, а вось паглыблення ў характар няма.

У гутарцы з удзельнікамі «Тарцюфа» Станіслаўскі гаварыў, што яго не задавальняюць асобныя яркія выканаўцы. Бо тэрэба «мысліць спектакль як адзінае гарманічнае спалучэнне ўсіх яго элементаў?..» На нашу думку, Г. Вагаў так рэпецыраваў «Прытворнахворага», што на першы план выступалі якраз «элементы» яркага відовішча, а галоўная мэта і пафас пастаноўкі павінны былі скласціся самі па сабе, з сумы «элементаў». А гэтак не бывае ў мастацтве. Калі ж і бывае, то выпадкова.

Спектаклю гамяльчан кадае непасрэдны характар вясёлых і жыццёва-рэальных падзей, асэнсаваных мастаком-гуманістам, выкананне такіх ролей, як Туанета (артыстка Л. Собалева), бацька і сын Дзіафаярусы (В. Касценка і Ф. Іваноў). Па іх паводзінах на сцэне адчуваеш і «руку» рэжысёра Г. Вагаў. Як дасціпна і шчыра жыве ў камедыйным бляску падзей п'есы Туанета! Яе ўчынкі не толькі парываннi юнага сэрца, а і вынік роздуму аб прызванні чалавека. Побач з асноўнай выканаўцай выступае ў ролі Туанеты і актрыса А. Аляксандрава, якая пакуль што выглядае менш разнастайнай у правях характару гераіні. Што датычыцца абодвух Дзіафаярусаў, то неабходны сатырычны напал яны падтрымліваюць даволі арганічна і паслядоўна. Праўда, сыну Тама (Ф. Іваноў) варта заставацца Дзіафаярусам і ў паўзах, а цяпер ён чамусьці вельмі «ахвотна» адключаецца ад падзей і потым, схамянуўшыся, падключаецца да іх.

Празмерную даніну традыцыйнаму мальераўскаму перснажу—слуга Каўель — аддаюць П. Вараб'ёў і У. Драбышэўскі. Не пашкодзіла б ім, калі б яны здолелі паказаць і тое, што «аб сабе і аб панах» думае такі слуга... Выкананне ролей Анжэлікі і Клеанта (І. Чальцова і В. Смірноў), як кажуць, не засмучае гледачоў адсутнасцю жывых інтанацый, хоць артысты маюць здольнасці да большага.

Тым часам на сцэне ўспыхваюць яркія суквецці з танцаў, песень, буфанадных трукаў, пацешных інтэрмедый. Акцёры зноў робяцца толькі «элементамі» відовішча. Смешнага, нават эфектнага. І гледачы, асабліва моладзь, добра ўспрымаюць тое, што ім прапануе тэатр. Нам жа хацелася б, каб пасля таго, як першыя ўражанні рэжысуры і выканаўцаў ад сустрачы з публікай увойдуць у спакойнае рэчышча, у тэатры сур'ёзна абмеркавалі плён звароту да камедыяграфіі Мальера. Гэта дасць матэрыял і для дыскусійнай размовы. Нашы зубры скіраваны супроць рэжысёрскай адвольнасці, калі яна не выклікаецца меркаваннямі творчымі і мае ў якасці першай задачы імкненне стварыць «наогул» яркае відовішча.

Сцяпан ГАЛАВАНАЎ.



«Цішэй! Ідзе рэпетыцыя!» — гэтыя словы папярэджваюць наведвальнікаў тэатра ўдзень. Тут рыхтуецца новы спектакль. Фарміруецца і выяўляецца ідэйна-мастацкая задума, усталёўваюцца ўнутраныя кантакты памёж партнёрамі, шукаецца атмасфера дзеі... Зноў і зноў паўтараюцца рэплікі, зноў і зноў вяртаюцца выканаўцы да аналізу сутнасці канфлікту драмы і чалавечых узаемадносін. «Узыходжанне на Фудзіяму» Чынгіза Айтматава і Калтан Мухамеджанава ў Рускім тэатры БССР імя М. Горкага ставіць рэжысёр Уладзімір Маланкін. На здымку, зроблёным на рэпетыцыі Ул. Крукам, вы бачыце яго (у цэнтры) разам з артыстамі Т. Яблаковай і В. Шушкевічам.

СТРАКАТЫЯ СТАРОНКІ

«ХАРАКТАРЫ» В. ШУКШЫНА (П'ЕСА А. ГАНЧАРОВА) У БРЭСЦКІМ ТЭАТРЫ ІМЯ ЛЕНІНСКАГА КАМСАМОЛА БЕЛАРУСІ

Канстанцін СТАНІСЛАЎСКІ гаварыў: «У наша жыццё неад'емнай часткай увайшла палітыка, а гэта азначае, што ўвайшоў роздум аб дзяржаўным ладзе, аб задачах грамадства ў наш час, значыцца і нам, рэжысёрам, цяпер трэба многа думаць пра сваю прафесію і развіваць у сабе асаблівае рэжысёрскае мысленне. Рэжысёр не можа быць толькі пасрэднікам паміж аўтарам і тэатрам, ён не можа быць толькі павітухай і памагаць нарадзіцца спектаклю. Рэжысёр павінен умець думаць сам і павінен так будаваць сваю працу, каб яна абуджала ў гледачоў думкі, патрэбныя сучаснасці».

Практыка савецкага тэатра дае прыклады сапраўды бліскучага рэжысёрскага ўвасаблення драматургічнай задумы. Лепшыя пастаноўкі дасягаюць гарманічнай ідэйна-мастацкай цэласнасці тады, калі іх аўтары дакладна вызначаюць, як іграць дадзены спектакль, якія творчыя задачы павінны вырашаць выканаўцы і ўдзельнікі, каб надаць сцэнічнаму відовішчу стылявую і жанравую яснасць, якім мэтам падначальваюцца ўсе кампаненты тэатральнага мастацтва — акцёр, дэкаратар, кампазітар...

Гледачы ўспрымаюць сцэнічны твор праз артыстаў у першую чаргу. Мабыць, гэтым тлумачыцца і тое, што рэцэнзенты часцей больш падрабязна пішуць аб выканаўцах ролей. Сёння «Літаратура і мастацтва» прапануе тры водгукі на спектаклі драматычных тэатраў Мінска, Брэста і Гомеля, аўтары якіх акцэнтуюць увагу на рэжысуры.

У ЗАЛЕ ў той вечар многа смяяліся. І ты таксама смяяўся. Дык чаму ж тады, задаўшы сабе пытанне—«Ці спадабаўся спектакль?», тады гаворыш: «Спадабаўся, але...» Ну, чаму рэцэнзент не можа абысціся без «але»?.. Тады ты фармулюеш думку трохі інакш: «Увогуле спадабаўся...» Чым лепш такое «ўвогуле» за «але»? Давай спачатку напішы аб тым, што і хто табе спадабаўся, у што і каму ты паверыў, што і хто табе адкрыў нешта новае, Ты слухаешся—і пішаш.

Пішаш аб тым, што рэжысёр Маскоўскага акадэмічнага тэатра імя Ул. Маякоўскага А. Ганчароў даволі арыгінальна пабудаваў сюжэтную схему п'есы паводле апавядання Васіля Шукшына. Фактычна гэта і драматургічны твор, і поўны пастановачны план. У вясковым клубе слухаецца справа аб злачынстве хлопца Вені Заблікава. Ён амаль анекдатычна адпомсціў за крыўды сваёй цяперашняй Лізавеце Васільеўне. А там мае свой гонар і патрабуе, каб зяця пакаралі, бо...

І далей на сцэну ўзнімаюцца на чарзе аднавяскоўцы Вені і Лізаветы Васільеўны, каб нешта «паказаць па ходу справы» або расказаць пра жыццёвы выпадак, які сам па сабе кладзецца на вагу суда—або на карысць Вені, або на «суцэрацлегты бок», гэта значыць, Лізавеце Васільеўне.

Выступленні «сведак» і аднавяскоўцаў — гэта інсцэніроўкі асобных апавяданняў, якія ў кнізе В. Шукшына «Характары» нікчай сувязі паміж сабой не маюць. Заслуга аўтара п'есы, як і рэжысёра спектакля ў Брэсце, у тым, што са стракатых старонак пакрысе складаецца пэўная сістэма тэатральнага спектакля, твора, а наўздагон яму ляціць злоснае і з'едлівае—«Ідзі, ідзі! Музыку паслухай, вальс Чаму гроны не вядуцца...» Дыялог А. Беражнога з А. Мельнікавым успрымаецца як скадэнсаваная на думцы байка, дзе перамога за тым з перснажаў, хто... лазні з суседам або Яфім П'яных расказвае і «пакажа» гісторыю свайго недарэчнага клопату пра «аўтарытэт». Гледачы не вельмі шкадуюць, што вось зараз адбудзецца «змена герояў спектакля. Здагадваешся, што прыме варту ў каргодзе сакавітых жанравых партрэтаў? вясковых дзівакоў не менш яркі персанаж. Ну, прынамсі, не менш рыфмальны па лёсу і па знешняму абліччу.

Гэта сведчыць пра тое, што задума рэжысёра і прадугледжвала пэўную калейдаскапічнасць. Калі так яно было, то, выходзіць, мэта дасягнута? Не, гаворка ідзе аб прыблізна вызначанай мэце пастаноўшчыкам С. Яўдашэнкам. Захапіўшыся магчымасцю паказаць на сцэне сапраўды смешныя гісторыі з сучаснага вясковага жыцця, ён згубіў тое, што мы называем звышзадачай сцэнічага твора. Артысты з большым або меншым поспехам іграюць інсцэніраваны пратакол. А драматург (ён жа і рэжысёр і па прафесіі) А. Ганчароў напісаў п'есу. На перны погляд, яна расплывістая, стракатая, і ўсё ў ёй трымаецца нібы на вельмі ўмоўнай сюжэтнай спружыне. А на самой справе?

На самой справе ў «Характарах» В. Шукшына і А. Ганчарова ёсць аскрэсленая думка. П'еса аб тым, як імклівы рытм жыцця, так званая акселярацыя, робіць непазнавальнай сённяшнюю вёску. Патрыярхальнае ў ёй неяк дзіўна перабытнае ўзнікае з новым, гэтая навіна то грубавата, то заўчасна ўносіць свае змены ў псіхалогію, у стыль і атмасферу штодзённых будняў, у манеру гаварыць і паводзіць сябе людзей усіх пакаленняў. Мне падалося, што С. Яўдашэнка не прыслухаўся да некаторых важных выказванняў персанажаў п'есы.

Ніхто не будзе спрачацца, што Цімафей Худзякоў—тып даволі агідны. Разбэшчаны, не надта сарамлівы з жанчынамі, у хмельным «загуле» яму карціць нагаварыць каму-небудзь розныя агідныя словы. Ды вось «пад заслону» свайго спаткання з намі, гледачамі, застаўшыся сам-насам са сваёй адзінотай, гэты Цімафей Худзякоў кажа: «Стаміўся, відаць, так жыць... Пражыў жыццё, як песню праспяваў, ды праспяваў—кепска. Шкада. Песня ж была харошая...» Артыст С. Юркевіч разам з рэжысёрам так глыбока «пнырнуў» ў фельетонна пададзены характар вясковага Фальстафа, што на гэты праспетлены сум не хапае ні фарбаў, ні сцэнічнага часу.

І яшчэ прыклад. Сенька Громаў у роспачы—дзяўчына, якую ён кахае, на трыццаць сем сантыметраў вышэй за яго. Смешна? Вядома. Тым больш, што малады акцёр С. Магілеўскі іграе хлопца з добрай усмешкай на вуснах. Яго Сенька не хоча мірыцца нават з «хітрыкамі прыроды». І пачынае гучаць у душы хлопца музыка. На яе ён разлічвае. З яе дапамогай Сенька і брата прымусіць застацца ў вёсцы, і Вальку заваюе... І раптам—крах. У п'есе гэта якраз той прыклад заўчаснай самаўпэўненасці маладога чалавека, якая пакуль што не гарантуе поспеху ў любоўных прыгодах. Сенька здагадваецца, што яго «душа», якая «кіпіць», яго энтузіязм, на жаль, яшчэ выглядае наіўным побач з зямнымі разлікамі брата і Валькі. Зноў жа, здаецца, шчымлівая нота развіна са старонак прозы на рэйсці ў плынь сцэнічнай дзеі, але іграецца ў тэатры яшчэ адзін варыянт спетча з традыцыйным «трохкутнікам».

Зусім не чуецца і той сумленны роздум Васіля Юр'евіча, дзе пісьменнік ужо не жартуе, а запрашае з нас, чытачоў апавядання «Дзядзька Ермалай», задумацца каля магілы простага чалавека аб сэнсе жыцця. Вінаваціць выканаўцу ролі А. Козака за гэта наўрад ці правільна, бо і Г. Токараў так жыва малюе забаўную мітуслівасць дзядзькі Ермалая, і рэжысёр так ставіць увесь эпізод, што надзвычай істотная думка для пэўнага эмацыянальнага «праворту» спектакля была загадзя асуджана на прыглушанае гучанне. У шуме вясёлага прадстаўлення «Характараў», на якім я прысутнічаў, не было чутна і яго...

«Характары»... Так, яны ёсць у брэсткім. Многія з іх у нечым галоўным адпавядаюць шукшынскім. Але няма ў спектаклі кіруючага рэжысёрскага стрыжкаю. Таму, сказаўшы, што табе многае падабаецца ў «Характарах» на сцэне тэатра Ленінскага камсамола Беларусі, ты можаш да названых вышэй артыстаў далавань і К. Нераніяціну (старшыня Мар'ева), і А. Грозева (прадстаўнік з раёна), і Н. Ганчарэнка (Зоя Ерына), і Р. Семчонку (Зоя Ціпляшкіна), і сам жа будзеш чакаць, калі дабярэшся да традыцыйнага ў рэцэнзентаў «але».

Справа ў тым, што літаратуразнаўцы даўно зрабілі слушную, на мой погляд, выснову — Васіль Шукшын не такі «просты» і не такі «фельетонны» празаік, якім яшчэ падабаецца выглядаць і якім ён пры нерэгулярным чытанні выглядае. Рэжысура брэсцкага спектакля спынілася на агульнавядомай і распаўсюджанай рэпутацыі пісьменніка і з добрым пачуццём захаплення ставіла «простага» і «фельетоннага» В. Шукшына. Прычыны несапкой за людзей, якія то апярэджваюць падзеі, то плятуцца ў хвасце імклівага часу, не апалі спектакль брэсткі. Таму гэтая сцэнічная версія «Характараў» успрымаецца як аблегчаная. Ёй бы яшчэ крылы па-мастацку смелай задумы—спалучыць сапраўды «смешнае» з рэальным драматызмам! Ёй бы паслядоўна перанесці ў вобразную плынь спектакля пазію, характэрную для лепшых старонак шукшынскай прозы! Гэтага няма. І таму спектакль замацаваўся як тэатралізаваны калейдаскоп перакладзеных на мову акцёрскага мастацтва жанравых павел-мініяцюр, кожная з якіх мае зусім прыватнае значэнне.

...Унутраны голас падказвае: ты ж пачынаў з таго, што табе «Характары» падабаліся. Так, падабаліся. Але... Аб тым і была гаворка.

Барыс БУР'ЯН.

ШТРЫХІ ДА ПАРТРЭТА

ТВОРЧАЕ АДЛЮСТРАВАННЕ

МАЙСТЭРСТВА — доўгі, цярністы шлях нястомных пошукаў, сумненняў, адкрыццяў... З прыходам майстэрства мастаку працаваць не лягчэй, таму што ад майстра чакаюць большага, майстар не мае права на няўдачы. Мікволі прыйшло на думку ўсё гэта, калі пабываў у вялікай, своеасаблівай майстэрні мастака Яўгена Красоўскага. Улюбёны ў народнае мастацтва, ён збірае розныя прадметы народнай творчасці — ручнікі, разныя ларцы, скрынкі, зробленыя таленавітымі рукамі ўмельцаў.

У майстэрні заўсёды ў дзеянні афортны станок.

Мне даўно падабаецца гэты пажылы чалавек з маладым ясным пранізлівым позіркам. З ім заўсёды ёсць пра што пагаварыць, параіцца.

Яўгену Красоўскаму пашанцавала. У юнацтве ён працаваў рэквізітарам у І-м Беларускім дзяржаўным драматычным тэатры (БДТ-І). Тут ён сустракаўся з вядомымі мастакамі А. Марыкам, К. Ціханавым, А. Грубэ, сюды на гастролі прыязджалі тэатры Меерхольда і Александрыйскі з Ленінграда, многія тэатральныя калектывы краіны. Цікавыя спектаклі, высокае майстэрства акцёраў, рэжысуры, заўсёды паланілі душу маладога мастака.

Зусім яшчэ маладому Яўгену давяралі рэстаўрыраваць старыя дэкарацыі. Аднойчы, гэта ён ніколі не забудзе, яму давялося аднаўляць дэкарацыі, напісаныя вядомым рускім мастаком А. Галавіным.

Як успамінае Яўген Еўстаф'евіч, гэта быў перыяд станаўлення і ўздыму беларускага мастацтва. Аднаўляліся нацыянальныя традыцыі. На сцэне адзін за другім з'яўляліся спектаклі па п'есах беларускіх пісьменнікаў: «Машэка», «Кастусь Каліноўскі», «Каваль-ваяводаў» Е. Міровіча, «На Купалле» М. Чарота, «Вір» Я. Рамановіча і іншыя. Таленавіта заявілі аб сабе артысты Б. Платонаў, В. Галіна, Л. Ржэцкая, У. Уладамірскі, У. Крыловіч. Яўген Красоўскі з усёй сілай маладосці захапіўся тэатрам.

Першыя карціны Я. Красоўскага былі прысвечаны працы («Дажынкі», «Выхад на работу», «Калгасны двор»). Гэта былі новыя тэмы ў беларускім выяўленчым мастацтве. Першыя работы радавалі шчырасцю, цёплай маляўнічай гамай. Яны экспанаваліся на 4-й Усебеларускай мастацкай выстаўцы. Крыху пазней ён паказвае новыя работы — «Трамвай у рабочы квартал», «Штаб Заходняга фронту», «Беларускія ткачыхі», умела адгукаецца на штодзённыя падзеі, асэнсоўваючы іх.

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, Я. Красоўскі эвакуіраваўся ў Новасібірск, дзе працаваў галоўным мастаком Гарнізоннага дома афіцэраў. Неўзабаве быў адазваны ў Маскву. Яго прызначылі галоўным мастаком Беларускага выдавецтва, дзе друкавалася мастацкая літаратура на беларускай мове, новыя падручнікі для вызваленых ад фашыстаў раёнаў.

Яшчэ ішла вайна, а ў Трацяконскай галерэі адкрылася выстаўка твораў беларускіх мастакоў на ваенна-патрыятычную тэму, у асноўным, гэта былі работы, прысвечаныя нашым савецкім людзям, перамогшым у цяжкіх баях фашызм. На выстаўцы была прадстаўлена і новая работа Я. Красоўскага «Зямля». Карціна апявала нязломнасць характару савецкага чалавека, які ў цяжкі час, пакідаючы родныя мясціны, браў з сабою жменю зямлі, як сімвал вяртання.

Вярнуўшыся ў вызвалены Мінск, мастак піша аб тым, як адраджаецца гэты разбураны, але не скораны горад. Але па-ранейшаму галоўнай яго тэмай застаецца праца. У ёй ён знаходзіць глыбокі сэнс, крыніцу натхнення. Ён працуе над серыяй шматфігурных кампазіцый, партрэтаў узнімаюцца да філасофскага абагульнення. Тэматычныя карціны мастака аснове створаных эцюдаў на Мінскім трактарным заводзе, дзе ён вельмі любіў бываць, мастак піша карціны «Выплаўка сталі», «Кавальскі цэх», «Электразварачыца», «На Мінскім трактарным», «Паведамленне ТАСС».

Карціна «Выплаўка сталі» пераносіць нас у напружаную атмасферу працоўных будняў рабочых. Вялікі сучасны сталеліцейны цэх. Печы для варкі сталі. Краны, велізарны молат. Дакладныя праўдзівыя эцюды. Але галоўнае — людзі. Група ліцейшчыкаў пластычна і ўмела скампанавана. Захапляюць нястрымныя адценні фарбаў, гучная яркая гама. Аранжавае полымя расплаўленай сталі, клубы белай пары, крыху блакітнае дзённае святло, што ўрываецца ў верхнія вокны цэха — усё нечакана і гарманічна. Дзяючы багатаму спалучэнню цёплых і халодных таноў мастак дабіваецца вялікага эфекту.

Я. Красоўскі ўлюбёны ў жыццё. Дзе б ні знаходзіўся мастак, у любой абстаноўцы, ён умее ўбачыць самае характэрнае, галоўнае. Прыватны факт і падзея ў яго работах узнімаюцца да філасофскага абагульнення. Тэматычныя карціны мастака знаходзяць рытмічнае кампазіцыйнае вырашэнне. Заўсёды радуе актыўнасць пазіцыі мастака, свет яго герояў. Вобразна кажучы, ён становіцца сябрам сваіх герояў. («Даяркі», «Узнагарода гераіні», «Прыёмка рыбы»).

Цікава працуе Я. Красоўскі ў жанры пейзажу. Яму ўдаецца перадаць стан прыроды, «паветраную перспектыву». У яго пейзажах — паэзія роднага краю з ціхімі лясамі, празрыстымі азёрамі, велічнымі рэкамі, бясконцымі далячынямі... Аб высокім майстэрстве мастака, аб яго ўменні шукаць і знаходзіць тонкія каляровыя адносіны, гавораць такія работы, як «На берагах Бярэзіны», «Вечар», «Вясна», «Белавежская пушча». Гарадскі пейзаж з архітэктурнымі ансамблямі, транспартам, натоўпамі людзей займае немалое месца ў творчасці мастака. З захапленнем піша ён і нацюрморты, умела і цікава падбіраючы кампаненты. Велізарным поспехам карыстаюцца на розных выстаўках пейзажы малога фармату, якія здзіўляюць вострым бачаннем натуры, трапятлівасцю пастознага мазка, колеравай гармоніяй.

З паездак у Данію, Англію, Францыю, Італію, Грэцыю, Турцыю, Румынію, Балгарыю і іншыя краіны Яўген Красоўскі прывёз шмат пейзажаў-малюнак з відамі гарадоў, вуліц, набярэжных, мастоў, помнікаў, выхапленых вострым позіркам мастака.

Шчодра нанесены на малое палатно пастозны мазок, згусткі пашчотна-жоўтых, ружовых, мякка-ліловых, карычневых, бірузовых, блакітных фарбаў майстэрскі лепяць абём, перадаюць святло і цені, іскрацца, тухнуць і ўспыхваюць зноў, сцвярджаючы трапяткое жыццё партоў, бухт з караблямі, вуліц гарадоў.

Кожны малы пейзаж — адкрыццё мастака, ён пераносіць гледача ў асаблівы свет маляўнічай экзотыкі. Колерная гармонія, цэльнасць каларыту выклікае мноства эмоцый.

Пасля паездкі на Лукомльскую ДРЭС — буйнейшую будоўлю Беларусі, мінулым летам мастак прывёз серыю цікавых псіхалагічна выразных партрэтаў будаўнікоў, лепшыя з іх экспанаваліся ў філармоніі на групавой выстаўцы «Мастакі на будоўлях і заводах».

Віднае месца ў творчасці Я. Красоўскага займаюць невялікія па фармату пейзажы-малюткі, выкананыя маслам. Яны падкупляюць выразнасцю, лірычным настроем.

Пільнасць назіральніка, спадарожніка ў спалучэнні з фантазіяй мастака памагаюць Я. Красоўскаму бачыць свет шырока, пранікаючы ў сутнасць з'яў. Незвычайны каларытны талент, творчы тэмперамент дазваляюць яму ствараць маляўнічыя сімфоніі, перадаць убачанае ў ажыццёўленым паэтычным вобразе.

Я. Красоўскі выдатны графік, працуе ў лінагравюры, літаграфіі, афорце, працягвае графічную серыю партрэтаў дзеячоў літаратуры і мастацтва Беларусі. Шмат надае ўвагі кніжнаму знаку — экслібрысу (лінагравюра, афорт). Ён удзельнічаў на міжнародных выстаўках ЭКСПО ў Японіі, на выстаўцы кнігі ў Лейпцыгу.

Маляўнічыя творы Я. Красоўскага былі на выстаўках у Маскве, у саюзных рэспубліках і за межамі нашай краіны — у Англіі, Кітаі, Францыі, Фінляндыі, у Польшчы.

Мастак — аматар прыкладнога мастацтва.

У майстэрні яго ўтульна: на паліцах кнігі, альбомы з малюнкамі, рэчы хатняга ўжытку, а на сценках да самай столі развешаны шматлікія работы. Яны ствараюць своеасаблівы мастацкі музей. Тут натхнёна працуе дапытлівы, дзейны мастак-камуніст, чалавек вялікай душы і таленту Яўген Еўстаф'евіч Красоўскі.

Ул. САКАЛОЎ,
мастак.

Я. Красоўскі. Даяркі. 1964 г.

ЖЫЦЦЯ

СУНІЦЫ НА КАФЛІ

УКОПЫСІ мне хацелася пабываць даўно. З гэтым невялікім пасёлкам на Аршаншчыне звязана нямала цікавых старонак у гісторыі мастацтва.

У кніжцы Ю. Аўсяннікава «Сонечныя пліткі» чытаю: «У пяцідзесятыя гады семнаццатага стагоддзя знатныя баяры і прыбліжаныя маскоўскага цара ахвотна пераводзілі з вызваленых ад палякаў старых рускіх гарадоў таленавітых умельцаў. Так, з горада Копыся вывез Нікан кафлянага майстра Ігнація Максімава. Патрыярх пасяліў ганчара ў Іверскім манастыры, на Валдаі. Тут, у манастыры, удалечыні ад Масквы, наладзіў Ігнацій Максімаў вытворчасць першай у Расіі паліхромнай кафлі». Не толькі кафлянымі вырабамі славіліся майстры старажытнага горада Копыся. Не менш вядомымі былі і мясцовыя рэзчыкі па дрэве. Напрыклад, славуты Каломенскі палац і многія маскоўскія збудаванні аздаблялі выхадцы са Шклова, Оршы і іх ваколіц. Выразалі ў Копысі і драўляныя формы для ўзору на пернікаў, што пудамі збываліся на славутых мясцовых кірмашах. Так што для мастацтвазнаўцы Копысь тоіць нямала знаходак і адкрыццяў.

Незайздросны лёс такіх калісьці буйных і вядомых паселішчаў, як Копысь (або Тураў, Мір, Давыд-Гарадок). Новыя дарогі прайшлі ўбаку, выраслі на іх новыя буйныя паселішчы, а ў такіх вось гарадках жыццё «не бурліла».

З такімі думкамі я паволі ішоў па цэнтральнай вуліцы Копыся, што выцягнулася ўздоўж Дняпра. Злева — густая зеляніна невялікага сквера, справа — магазін... Мост праз рачулку, побач абломак старажытнага верставога слупа. Рачулка ўецца ля падножжа ўзгорка квадратнай формы з крутымі схіламі, відаць, старажытнага гарадзішча. А гэта старадаўняя драўляная і каменныя будынкі, на адным дата — «1899»... Цікавая клямка на варотах, вось яшчэ адна... Прыгожы драўляны ўзор пад страхой старога дома. На суседніх дамах такіх узораў не відаць. Цікава, гэты ўзор тут выпадковы ці не? Трэба будзе высветліць... Невялікі кафляны заводзік, прадукцыя якога штабялямі ляжыць ля многіх дамоў. Заводзікам заканчваецца галоўная вуліца мястэчка.

А яшчэ ж зусім нядаўна, паўстагоддзя назад, такіх прадпрыемстваў тут было болей. У невялічкай кніжачцы І. Ялатамцавай «Мастацкая кераміка Савецкай Беларусі», якую я прыхапіў з сабой, напісана: «У пачатку XX ст. у Копысі было 16 заводаў, напярэдадні рэвалюцыі іх лік вырас да 19...» Гэтыя дадзеныя прыведзены ў статыстычных зводках і супадаюць з успамінамі старых копыскіх рабочых.

...Спыняю хлапчукоў, што катаюцца на веласіпедах па вуліцы. Яны раюць мне пагутарыць з выкладчыцай гісторыі ў мясцовай школе Л. Ц. Праневіч.

Дзверы адчыніла сярэдніх год жанчына, ветліва запрасіла ў пакоі. З першых слоў Лізавета Цярэнцьеўна зразумела, што мяне цікавіць, і гутарка хутка наладзілася. Я заслухаўся яе расказам. Цікава было ўсё.

— Так, калісьці ў Копысі выпускалі каляровую кафлю і іншыя вырабы з гліны: гарлачы, бачонкі, чарнільныя прыборы, попельніцы, падсвечнікі. Прадукцыя мела вельмі вялікі попыт. Маскоўскія палацы ўпрыгожвалі нашай кафляй. Зразумела, што і ў многіх жыхароў мястэчка печы былі таксама з мясцовай кафлі, але час і войны знішчылі многае. Але дзве печкі мы зараз паглядзім, у суседзяў захаваліся. Магчыма, дзе-небудзь і кафліна заваялася. А вось пра дошкі для друкавання пернікаў нічога сказаць не магу. Крыху прыпамінаю, што была тут калісьці такая прадукцыя, але падрабязнасцей не ведаю. Так, разьба на будынках была багатай, ды мала што засталося. Майстроў па дрэве ў нас было многа. Былі ў час і добрыя майстры-меднікі; але цяпер іх вырабы аднукаць цяжкавата. Этнаграфічны аддзел у школьным краязнаўчым музеі? Добра было б, ды на жаль, няма ў нас музея, школа цеснаватая. Відома, было б памяшканне, можна было б арганізаваць добры краязнаўчы музей.

Копысь багаты гісторыяй. Вось, напрыклад, тое ўзвышша над Дняпром. Гэта не гарадзішча, а так званы Пятроўскі вал. Тут у час вайны са шведамі спыняўся Пётр Першы. А гэты ўзгорак быў васнным умацаваннем. У мінулым годзе экспедыцыя БДУ вяла там раскопкі, вельмі многа каштоўных знаходак знайшла. Частку знаходак перадалі пасяльковай бібліятэцы, дзе ёсць краязнаўчы куток. Вельмі бурны быў у нас рэвалюцыйны рух, але пра гэта лепш раскажа мой бацька, Навумовіч Цярэнцій Сямёнавіч. Яму цяпер за восемдзесят, і мясцовую гісторыю ён ведае добра. А зараз пойдзем паглядзім печку...

Печка аказалася сапраўды цудоўнай. Складзена яна з кафлін рознага малюнку. Праўда, на ўсіх пераважаў зялёны колер, і печка не здавалася вельмі стракатай. У большасці малюнак уяўляў з сябе букецік кветак з двуматрыма лісткамі, накшталт кусцікі — суніц, а таксама штосьці падобнае на вянок, перавіты стужкай. Колеры яркія, але не стракатыя. Кафля не вельмі старажытная, канца XIX стагоддзя.

Прыйшоў час спытаць у гаспадыні, ці не заваялася дзе-небудзь лішняя кафліна.

— Не, не засталося нідзе, усе параздавалі. Да нас жа ўжо не раз прыязджалі, і з Мінска, і з Магілёва, і з Віцебска, не раз фатаграфавалі печку, і ўсе прасілі кафліну. Зайдзіце да суседзяў, магчыма, у іх ёсць. Дарэчы, іх печка мне падабаецца нават больш, чым наша.

Якраз у гэты момант вярнуўся гаспадар. Аказалася, што адна кафліна ўсё-такі захавалася. І пасля некаторых угаворваў гаспадар аддаў яе.

Пайшлі да суседзяў. Дома аказалася гаспадыня з дзецем ды хлопчык-падлетак. Такія наведванні тут не былі навіной, і маладзіца ахвотна запрасіла паглядзець «музейны экспанат».

На малочна-белым фоне печкі — бледна-ружовыя кветкі, па краях — залатая абводка. Вымаю з кішэні сваю кніжачку-спадарожніцу, чытаю: «З лешых вырабаў копыскіх заводаў можна назваць кафлі для печаў белай з золатам расфарбоўкі».

Можна ўжо было б ісці, але мой позірк, наткнуўся на невялікую керамічную шкатулку яўна старой работы мясцовых майстроў, карычневага колеру, з жоўтай рыбкай на вечку. Я нясмела выказаў жаданне набыць гэтую шкатулку. Маладзіца не стала і гаварыць пра грошы, аддала яе мне.

...Гутару з Цярэнцієм Сямёнавічам:

— Прадукцыю заводаў Копыся вы ўжо бачылі, — гаворыць ён. — А якія бурныя падзеі адбываліся тут у 1901—1906 гадах! Мітынгі, стачкі, забастоўкі, сходкі на навакольных лясах ды ўрочышчах... Нават казакі прыязджалі на ўтаймаванне. Шмат нашых на катаргу пайшло, некаторыя аж да семнаццатага года там прабылі, некаторыя і зусім не вярнуліся. Я на радыё часта чую, як называюцца многія гарады, дзе быў буйны рух у першую рэвалюцыю, але Копыся не называюць. Мала яшчэ вядома людзям пра наш Копысь. Праўда, школа крыху нешта робіць, каб аднавіць у памяці людзей падзеі тых дзён, але трэба рабіць больш.

Ужо значна пазней, вярнуўшыся дамоў, я з задавальненнем пераканаўся, што Копысь не такі ўжо і пасёлак спецыяльны артыкул пад назвай «Копыская арганізацыя РСДРП». У артыкуле пацвярджалася ўсё, што расказаў мне Цярэнцій Сямёнавіч. Але тады я гэтага не ведаў, і нічым не мог суцешыць субяседніка, акрамя сцвярджэння, што рана ці позна падзеі ў Копысі таксама стануць вядомы ўсім.

Размаўляючы з Цярэнцієм Сямёнавічам я думаў аб тым, што сваю гісторыю трэба нам вывучаць і ведаць лепш. Багатыя і разнастайныя матэрыялы можна тут сабраць. Ёсць, праўда, невялікі краязнаўчы куток у пасяльковай бібліятэцы, даволі значны і цікавы матэрыял сабрала Лізавета Цярэнцьеўна, вымушаная з-за адсутнасці месца ў школе трымаць яго дома. Значыць, энтузіясты ў Копысі ёсць, патрэбна толькі пэўная дапамога. Гэта добра, што ёсць яшчэ сведкі падзей часоў нават першай рэвалюцыі, што яшчэ можна аднукаць старажытныя керамічныя вырабы славутай мясцовай мануфактуры...

Апошнюю знаходку я набыў ужо пад вечар. Дырэктар школы Уладзімір Іванавіч уручыў мне цудоўны званок з надпісам па краі «Дар Валдая».

Да наступнай сустрэчы, Копысь!

Яўген САХУТА.

Узоры кафлі.

НА ЛІСТАВОЙ МЕДЗІ

Мастак Баранавіцкай швейнай фабрыкі Эдуард Сурэнавіч Карапетаў ужо некалькі гадоў займаецца чаканкай па металу. Чаканкай па ліставой медзі пачаў ён займацца параўнаўча нядаўна.

Работы мастака тройчы дэманстраваліся на гарадскіх выстаўках творчасці народных умельцаў. На апошняй выстаўцы, якая адбылася нядаўна, яго работа «Птица» мінскім мастацкім саветам мясцовай прамысловасці зацверджана як эталон-узор для серыйнай вытворчасці.

Зараз Эдуард Сурэнавіч рыхтуе серыю работ для абласной і рэспубліканскай выставак.

Фота Р. АЛЫМАВА.

ШЭФСКАЯ ДАПАМОГА

Нядаўна ў залах Пінскай карціннай галерэі мясцовыя мастакі сустрэліся з заслужаным дзеячом мастацтваў БССР, дацэнтам Мінскага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута Уладзімірам Паўлавічам Сухаверхавым.

На гарадской выстаўцы выяўленчага мастацтва, дзе было прадстаўлена больш як 200 твораў, сабраліся аўтары, рабочыя, служачыя, калгаснікі, студэнты.

Асаблівую цікаўнасць выклікалі карціны «Вязальны цэх КВТ», «Мой таварыш», «Мастак за работай» Аляксандра Шыдлаўца, «Багаты ўраджай», «Бывалы ветэран» Івана Грыцуты, «Паўночны мікраёён» Васіля Пуша, «Раніца майго горада» Анатоля Сяліцкага і многія іншыя.

Шчырая размова адбылася ля карціны Івана Грыцуты «Багаты ўраджай».

Прысутныя выказалі сардэчную падзяку госцю з Мінска У. П. Сухаверхаву за шэфскую дапамогу мастакам старажытнага і заўжды маладога горада над Пінай.

Былі выказаны пажаданні, каб Саюз мастакоў БССР накіроўваў у Пінск мастакоў для сустрэчы з мясцовымі аматарамі мастацтва і аказання ім метадычнай дапамогі.

Ул. БАРАВІКОЎ,
А. СТУПАК.

ЗАПРАШЭННЕ Ў КАЗКУ

Чароўны свет шырока расчыняе дзверы, нібы запрашаючы зазірнуць у яго. Заворожаны стаіць падарожнік. Перад ім ажываюць знаёмыя з дзяцінства казачныя героі.

«Паляна казак» — так і назвалі крымскія мастакі маляўнічае месца, размешчанае пад Ялтай у даліне ракі Вадападнай, у густым змешаным лесе, што патанае ў далёкай сіняе гор. Высокія кедры, сіняе неба, цішыня, якая парушаецца толькі птушыным спевам і шумам вадападу.

Чарадзейства прыроды захапляе не толькі турыстаў. Колькі гадоў назад яно прыцягнула ўвагу скульптараў-прафесіяналаў, народных умельцаў Крыма. Прырода сама па сабе надае незвычайныя формы лесу, а чалавечая фантазія і рукі мастака ўвасабляюць мудрагелістыя ствалы дрэў, пні, карчы і карэнне ў казачныя фігуры. Гэты від мастацтва называецца «флярызмам».

«Паляна казак» — філіял ялцінскага краязнаўчага музея. Гэта вялікая выстаўка флярыстаў (прафесіяналаў і аматараў) пад адкрытым небам, дзе знаходзіцца больш за 250 розных экспанатаў.

У выставачным павільёне — своеасаблівым лясным гроце — паказваюцца работы народных умельцаў, зробленыя з дрэва.

Нялёгка было стварыць уваход на «Паляну», які павінен быў адкрыць перад наведвальнікамі захапляючы свет казак. Прынялі праект ялцінскіх мастакоў С. Фёдарава і В. Нораха.

Частакол — здаўна вядомы элемент архітэктуры. Аўтары выкарысталі яго, каб паказаць усіх «трыццаць віцязяў цудоўных» на чале з іх дзядзькам. У казцы, што чакае нас за гэтай брамай, выдатная панарама, створаная рукамі двух ялцінскіх мастакоў.

І. КЛІМАВА.
(АДН).

МАРШРУТЫ АЎТАКЛУБАЎ

У НАШАЙ РЭСПУБЛІЦЫ налічваецца звыш ста аўтаклубаў. Яны занялі прыкметнае месца ў арганізацыі ідэалагічнай работы на вёсцы. У той жа час жыццё ставіць перад намі ўсё больш складаныя задачы.

І сапраўды, ці вывучана дасканала спецыфіка работы аўтаклубаў, як правільна вызначыць радыус іх дзеяння, зоны абслугоўвання? Што трэба зрабіць, каб па-сапраўднаму наладзіць павышэнне кваліфікацыі аўтаклубных кадраў? Якія шляхі прыцягнення мясцовага актыву да дзейнасці аўтаклуба? Ці дастаткова эфектыўна выкарыстоўваюцца тэхнічныя сродкі (кіно і радыёапаратура, гуказапісваючыя і праекцыйныя прыборы), кніжныя перасоўкі і наглядныя дапаможнікі?

Гэтыя і шмат іншых пытанняў узнікла перад слухачамі Рэспубліканскага інстытута павышэння кваліфікацыі работнікаў культуры, якія сабраліся на семінар па абмену вопытам работы перасоўных клубаў.

Здавалася б, што тут абмяркоўваць? Як вядома, аўтаклубы створаны былі ў свой час для абслугоўвання маланаселеных пунктаў, якія не маюць клубаў і знаходзяцца на значнай адлегласці адзін ад аднаго. Дайсці да кожнага працаўніка, данесці да яго гарачае і праўдзівае слова партыі, своечасова інфармаваць аб важнейшых падзеях унутранага і міжнароднага жыцця, аб справах свайго раёна, гаспадаркі, дабіцца таго, каб кожны чалавек імкнуўся да грамадскай і вытворчай актыўнасці, — у гэтым бачыць асноўную мэту сваёй дзейнасці большасць загадчыкаў аўтаклубаў.

Удзельнікі семінара гаварылі аб неабходнасці распрацоўкі дакладнай сістэмы абслугоўвання насельніцтва аўтаклубамі ў кожным раёне. Паслядоўнасць і сістэматычнасць — адзін з вядучых прынцыпаў выхаваўчай работы. Да таго часу, пакуль не будзе арганізавана рэгулярнае абслугоўванне маланаселеных пунктаў, нельга сцвярджаць, што аўтаклубы поўнасцю выконваюць свае функцыі. У сувязі з гэтым, важнае значэнне набывае замацаванне аўтаклубаў за ўсімі невялікімі вёскамі і вытворчымі ўчасткамі, зацвярджэнне маршрутаў і графікаў іх работы. Асабліва сур'ёзна стаіць пытанне своечасовай падрыхтоўкі аўдыторыі. Жыхары кожнай вёскі, кожнага насёлка павінны загадзя ведаць дзень і гадзіну прыбыцця аўтаклуба, рыхтавацца да сустрэчы з ім.

Менавіта так рэгламентавана дзейнасць аўтаклуба аддзела культуры Бярозаўскага райвыканкома. У зону яго абслугоўвання ўваходзяць 30 маланаселеных пунктаў. Загадчыца аўтаклуба Ніна Чыж мае карту маршруту, спісы двароў і колькасць насельніцтва кожнай вёскі. У рабочым графіку аўтаклуба дакладна вызначаны дзень і час прыезду машыны на месца. Пры такой арганізацыі справы кантроль за работай аўтаклуба вядзецца не толькі з боку аддзела культуры, але і самім насельніцтвам. З гэтай мэтай, напрыклад, графік работы аўтаклубаў Мядзельскага і Любанскага аддзелаў культуры друкуецца ў раённай газеце.

Супярэчлівыя думкі ёсць адносна зместу і формы работы аўтаклубаў.

Як вядома, большасць іх практыкуе свае выезды з праграмай, аснову якой складаюць выступленне прапагандыста і канцэрт мастацкай самадзейнасці з абавязковым уключэннем так званага «мясцовага матэрыялу». Часам гэтая праграма дапаўняецца выпускам баявога лістка, «Маланкі», афармленнем кн'жнай выстаўкі. Прынамсі, так выглядалі на ўборцы ўраджаю сёлета выступленні аўтаклубаў Дубровенскага, Капыльскага, Чашніцкага, Крычаўскага, Лепельскага, Касцюковіцкага і некаторых іншых раёнаў.

Карысць ад такіх выступленняў, вядома, ёсць, і нават не малая. Асабліва, калі ў праграмах канцэртаў прадстаўлены творы, прысвечаныя лепшым людзям раёна, гаспадаркі, дзе расказваецца аб іх вытворчых дасягненнях у трэцім, рашаючым годзе пяцігодкі. Але нельга абмяжоўваць творчы дыяпазон дзейнасці аўтаклуба толькі гэтым. Не дзіва, што няўрымслівыя клубныя работнікі вядуць настойлівыя пошукі іншых, больш дасканалых форм абслугоўвання насельніцтва. І вось некаторыя вынікі гэтых пошукаў. Аўтаклуб аддзела культуры Бярозаўскага райвыканкома прыцягнуў для абслугоўвання хлебаробаў у час уборачнай кампаніі тры лепшыя агітмастацкія брыгады раёна, а ў заключэнне правёў у калгасе «Чырвоны сцяг» тэматычны вечар «Славім працу калгасную і яе герояў». У практыцы работы аўтаклуба аддзела культуры Глускага райвыканкома — сустрэчы з перадавікамі сельскай гаспадаркі, выпуск светагукавой газеты «Працоўныя будні», арганізацыя канцэртаў па заяўках перадавікоў, гутаркі спецыялістаў і дэманстрацыя навукова - папулярных кінафільмаў для работнікаў жывёлагадоўчых ферм.

Змястоўна працуе аўтаклуб Маладзечанскага раённага аддзела культуры. За апошнія тры месяцы ён зрабіў 76 выездаў у маланаселеныя пункты. Былі праведзены тэматычныя вечары «Свет вакол нас», «Імя табе — камсамол!», «Арляняты вучацца лятаць», вечар пытанняў і адказаў, бібліяграфічныя агляды, лекцыі, гутаркі, канцэрты.

У апошні час гэты аўтаклуб спецыялізуецца як клуб палітычнай інфармацыі. Сваёй галоўнай задачай ён лічыць тлумачэнне насельніцтву знешняй і ўнутранай палітыкі Савецкага Саюза, прапаганду эканамічных ведаў, дасягненняў літаратуры, навукі і мастацтва. Можна было б прыводзіць і іншыя прыклады таго, як аўтаклубы імкнуцца шырэй выкарыстоўваць разнастайныя формы культурна-выхаваўчай работы.

Але калі гаварыць аб спецыфіцы дзейнасці аўтаклубаў і іх задачах, натуральна ўзнікае пытанне, а ці шмат могуць зрабіць два чалавекі: загадчык і шафёр? Калі разлічваць толькі на сябе, то, мабыць, якімі б таленавітымі энтузіястамі яны ні былі, усяго ім не здужаць. Неабходна апора на грамадскасць, на мясцовы актыў. Якія магчымасці да прыцягнення актыву мае аўтаклуб, якія ўзаемаадносіны экіпажа аўтаклуба з мясцовымі работнікамі? Вакол гэтага пытання на семінары разгарнуліся спрэчкі. Вопыт паказвае, што высокі ўзровень работы магчымы ў тым выпадку, калі загадчык не абмяжоўваецца толькі асабістым удзелам у ідэйна - выхаваўчай рабоце, а ўмела выкарыстоўвае ўсе культурныя магчымасці раёна: РДК, бібліятэку, музычную школу, народны тэатр, агульнаадукацыйныя школы, раённую газету, прыцягвае да спраў аўтаклуба савецкіх, партыйных, прафсаюзных, камсамольскіх работнікаў.

Значная роля ў гэтай справе належыць савету аўтаклуба, яго члены прымаюць удзел у абмеркаванні і складанні графіка і плана работы, разглядаюць тэматыку і праграмы вечароў, канцэртаў, вусных часопісаў, распрацоўваюць меры па ўдасканаленню дзейнасці аўтаклуба. Напрыклад, у склад савета Расонскага аўтаклуба ўваходзяць сакратар раённага аддзялення таварыства «Веды», які адказвае за лекцыйную прапаганду. Дырэктар музея Народнай славы займаецца патрыятычным выхаваннем моладзі. Педагог дзіцячай музычнай школы ўзначальвае эстэтычную работу. І гэтак — кожны член савета. Мастак РДК сочыць за актыўнасцю афармлення, урач раённай паліклінікі — актыўны арганізатар распаўсюджвання медыцынскіх ведаў.

Але стварэнне савета — гэта толькі адзін бок узаемадзеяння клуба са сваім актывам. Другі — пастаянныя памочнікі ў кожным населеным пункце, куды па графіку выязджае аўтаклуб, тыя людзі, якія змаглі б прадоўжыць работу пасля яго ад'езду. Гэта грамадскія кіраўнікі гурткоў, часам — настаўнік, спецыяліст сельскай гаспадаркі, бібліятэкар. На жаль, такімі сувязямі з мясцовымі актывістамі могуць пахваліцца не многія аўтаклубы.

Шмат увагі на семінары было ўдзелена пытанням выкарыстання тэхнічных сродкаў у практыцы аўтаклубаў. Нярэдка можна бачыць, як у асобе загадчыка аўтаклуба адначасова спалучаюцца мастак і кінамеханік, фотааматар і гукааператар. Запіша ён выступленне лепшага механізатара раёна на магнітную істужку — потым гэтае выступленне разам з каментарыямі агранома слухаюць у другіх гаспадарках. Сфатаграфуе ў пэўнай паслядоўнасці рабочыя аперацыі, якія выконвае лепшая даярка, — і вось праз светавую газету знаёмяцца з яе вопытам другія даяркі. Возьме ў кінапракаце вучэбны фільм аб тым, як правільна арганізаваць зімоўку жывёлы, даставіць яго па прызначэнню і, стаўшы ля праектара, зможа паказаць кіно сам. Менавіта так шырока выкарыстоўваюць тэхніку аўтаклубы Глускага, Лельчыцкага, Лепельскага і некаторых іншых раёнаў.

Але, як паказала абмеркаванне, аўтаклубы рэспублікі яшчэ недастаткова аснашчаны тэхнічнымі сродкамі. У многіх з іх адсутнічаюць, альбо няспраўныя магнітафоны, эпідыяскопы, дэманстраваны кінаўстаноўкі.

— У Дуброўна кінаўстаноўка стаіць мёртвым грузам, бо ніхто не можа на ёй працаваць, — сказала загадчыца аўтаклуба Анастасія Мігай.

Цяжкія ўмовы эксплуатацыі аўтаклубаў у перыяд веснавога і асенне-зімовага бездарожжа прыводзяць нярэдка да паломак дэталей, заўчаснага выхаду са строю машын. Між тым, у вадзіцеляў аўтаклубаў няма запасных частак, а ў перыяд напружанай працы недастае і бензіну.

Не менш важнае пытанне — асоба самога загадчыка клуба на колах. Узначальваць аўтаклуб можа не кожны. Праца тут далёка не простая. Яна вымагае шырокага кругагляду, спецыяльных ведаў, арганізатарскіх здольнасцей. Між тым, гэта катэгорыя клубных работнікаў не заўсёды заахвочваецца. Некаторыя абласныя ўпраўленні і раённыя аддзелы культуры не клапоцяцца аб своечасовым павышэнні іх дзелавой кваліфікацыі. Толькі гэтым можна растлумачыць той факт, што ў кастрычніку гэтага года на заняткі ў наш інстытут было накіравана ўсяго 35 чалавек замест 60. Не даслалі вызначаную колькасць слухачоў Брэсцкая, Гомельская, Гродзенская вобласці.

Інстытут павышэння кваліфікацыі прыкладае намаганні, каб да канца года ўсе загадчыкі аўтаклубаў рэспублікі прайшлі курс удасканалення прафесійных ведаў. За месяц знаходжання ў інстытуце слухачы вывучаюць надзённыя пытанні палітычнай і эканамічнай прапаганды, методыку клубнай работы, асвойваюць перадавы вопыт культурнага абслугоўвання насельніцтва, знаёмяцца з новымі тэхнічнымі і наглядным сродкамі прапаганды. Па жаданню слухачоў ім прадастаўлена магчымасць асвоіць тэхніку кінапаказа і здаць экзамен на правы дэманстратара хранікальна-дакументальных і навукова-папулярных фільмаў. Вывучэнне і прымяненне тэхнікі дасць магчымасць арганізаваць на месцах пастаянныя кіналекторыі, яшчэ больш павысіць узровень эмацыянальнага ўздзеяння праводзімых мерапрыемстваў.

Вялікае значэнне ў рабоце з насельніцтвам мае добра наладжаная інфармацыя і абагульненне вопыту. І тут перад аўтаклубамі ў даўгу нашы метадычныя цэнтры: Рэспубліканскі навукова-метадычны кабінет культурна-асветнай работы, Рэспубліканскі і абласныя дамы народнай творчасці. Сур'ёзных матэрыялаў, якія аналізавалі б, абагульнялі б найбольш цікавы вопыт лепшых аўтаклубаў рэспублікі, мы не знаходзім пакуль ні ў перыядычным друку, ні на старонках спецыяльных метадычных дапаможнікаў.

Усе мы з'яўляемся сведкамі вялікага сацыяльнага працэсу і пераўтварэнняў, што адбываюцца зараз у вёсцы, у тым ліку і ўзбуйнення населеных пунктаў. Але гэта зусім не значыць, што адпадае патрэба ў аўтаклубах. Пры самым актыўным ссяленні невялічкіх вёсак, застаюцца аддаленыя ад цэнтральных сядзіб вытворчыя і будаўнічыя ўчасткі, лесапункты, фермы, дзе працуюць і будуць працаваць параўнаўча невялікія калектывы людзей, якія маюць патрэбу ў пастаянным культурным абслугоўванні, у сустрэчах з мастацтвам, з жывым словам лектара. Сетка аўтаклубаў у бліжэйшыя гады, з улікам усіх пераўтварэнняў у жыцці вёскі, будзе пашырацца. І каб надалей маршруты аўтаклубаў былі паспяховымі, неабходна ўважліва ставіцца да іх патрэб, вывучаць перадавы вопыт, зрабіць яго ўсеагульным здабыткам.

Л. НЯВАРКА,
загадчык аддзялення культурна-асветнай работы Рэспубліканскага інстытута павышэння кваліфікацыі работнікаў культуры.



Група загадчыкаў аўтаклубаў на занятках па кінасправе ў Рэспубліканскім інстытуце паавышэння кваліфікацыі работнікаў культуры.

Фота Р. КУЗЬМІЦКАЙ, загадчыцы аўтаклуба аддзела культуры Мядзельскага райвыканкома.

ПЕСНІ НАД ДНЯПРОМ

Як на Аршаншчыне, так і на ўсёй Віцебшчыне добра ведаюць самадзейны мужчынскі хор пасёлка Барань. Створаны ў 1958 годзе, ён выступаў на раённых, абласных, рэспубліканскіх аглядах мастацкай самадзейнасці, прымаў удзел ва ўсіх дэкадах беларускага самадзейнага мастацтва.

З першага дня калектыў пачаў вывучаць складаныя харавыя творы, як чатырохгалосны. Удзельнікі яго валодаюць добрымі музычнымі і вакальнымі данымі. Гэта тт. Піваварчык, Зуеў, Сініца, Аўчыннікаў, Халімановіч, Лазарсон, Сіманенка, Савіцкі, Іваноў, Лісічэнкаў і іншыя.

Чуецца шырокая мелодыя. Гэта пяе мужчынскі хор пасёлка Барань. Ён выконвае песню Тулікава «Радзіма любімая мая». Слухачы ўзнагароджваюць яго дружнымі апладысментамі. Адказваючы на іх, харысты выконваюць «Лясную песню» Алоўнікава. Потым гучыць «Песня аб трывожнай маладосці» Пахмутавай і беларускія народныя песні «Пасеяў дзед грэчку» і «Мікіта».

Вечарамі, пасля працоўнага дня, у новы палац культуры пасёлка Барань спяшаюцца самадзейныя артысты: рабочыя, інжынеры, служачыя. Каля пяцідзесяці чалавек удзельнічае ў гэтым таленавітым калектыве, увесь свой вольны час яны аддаюць музыцы, песеннай творчасці. Зараз хор рыхтуе новую праграму, у якой праславіць свой прыдняпроўскі край.

Для заняткаў хору ў палацы культуры ёсць спецыяльны пакой, тут створаны ўсе ўмовы для рэпетыцый, для развучвання новых твораў савецкіх кампазітараў, народных песень.

Хору спаўняецца пятнаццаць год. Пажадаем жа яму добрых поспехаў, новых выступленняў на радасць людзей. Звініце і далей, песні над Дняпром!

Н. ВАЛЬКОВІЧ.

РАДКІ З ПІСЕМ

Яшчэ на 230 кніг мастацкай, палітычнай і сельскагаспадарчай літаратуры папоўнілася Жгупа-Будская сельская бібліятэка Добрушскага раёна. Зараз у яе фондзе звыш адзінаццаці тысяч кніг. Паслугамі бібліятэкі карыстаецца каля тысячы сельскіх чытачоў.

Савет бібліятэкі, які ўзначальвае Н. Шлыкава, вядзе вялікую работу па прапагандзе літаратуры, арганізоўвае тэматычныя выстаўкі кніг, дыспуты, літаратурныя вечары, канферэнцыі чытачоў.

А. КУРЛОВІЧ.

З цікавай праграмай у палацы культуры Белсаўпрофа выступіў хор ветэранаў працы горада Мінска.

Ён выканаў літаратурна-музычную кампазіцыю «СССР—Радзіма мая». У канцэрце прагучалі «Лясная песня» Ул. Алоўнікава, «Нёман» Н. Сакалоўскага, «Любы зоры залацістыя» П. Галавасцікава і іншыя творы беларускіх кампазітараў.

Г. ВІНАГРАДАЎ.

У Іўеўскім раённым аб'яднанні «Сельгастэхніка» рэгулярна выпускаецца фотагазета. Яна расказвае аб перадавіках вытворчасці, аб працы і адпачынку рабочых. На фотаздымках можна ўбачыць лепшых чытачоў бібліятэкі, удзельнікаў калектыву мастацкай самадзейнасці. Цікава афармлены сатырычны куток.

Газету выпускаюць фотааматары аддзялення «Сельгастэхнікі», якімі кіруе электрык Рыгор Няхаеў.

Я. МАКОУСКІ.

Славіцца сваім выкананнем беларускіх народных песень сямейны ансамбль цымбалістаў з калгаса «Ленінскі шлях» Дзяржынскага раёна. У складзе ансамбля— пенсіянер Фёдар Фёдаравіч Калеснік, яго ўнукі Міхась і Алесь, а таксама зяць, калгасны каваль Міхаіл Акаловіч.

Цымбалісты часта выступаюць перад сваімі аднавяскоўцамі.

В. ЖЫБРЫК.

Даўно працуе ў калгасе «Міжэвічы» Слонімскага раёна драматычны калектыў. Над ім шэфствуюць акцёры-аматары Слонімскага народнага тэатра. Яны расказваюць сельскім артыстам пра гісторыю савецкага тэатра, праводзяць практычныя заняткі. Нядаўна ў «Міжэвічы» прыехаў рэжысёр народнага тэатра М. Варвашэвіч. Ён рыхтуе да пастаноўкі спектакль паводле п'есы К. Губарэвіча «На крутым павароце».

У новай рабоце сельскага драматычнага калектыву прымаюць удзел настаўніца В. Фядута, бібліятэкарка Н. Валюк, работнік клуба Н. Куршук і іншыя энтузіясты самадзейнай сцэны.

Р. МІХАЙЛАЎ.

ГЛЫБОКІЯ КРЫНІЦЫ

Крочыць па Міншчыне свята народнай творчасці, свята самадзейных мастацкіх калектываў. У мінулую суботу ў Мар'інай Горцы пачаўся абласны фестываль фальклору і этнаграфіі «Глыбокія крыніцы». У занальным аглядзе выступілі калектывы мастацкай самадзейнасці Бярэзінскага, Чэрвеньскага і Пухавіцкага раёнаў.

Слухаеш песні выканаўцаў і думаеш, што сапраўды, з саміх глыбінь народных прынеслі яны гэтыя творы на сцэну і старажытныя песні загучалі самабытна і свежа, цікава і захапляюча.

Парадавалі сваёй праграмай самадзейныя артысты Бярэзінскага раёна, якія адкрылі свята. Канцэрт пачаўся выступленнем жаночага вакальнага ансамбля «Рэчанька» і танцавальнага калектыву калгаса «Гвардзеец». Ансамбль выканаў песню «Прыбярэзінскі край», словы напісала ўдзельніца самадзейнасці, свінарка Вольга Сарока. У хоры была створана і музыка. У тым жа выкананні прагучалі беларускія народныя песні «Крапіўка жыгліваяя», «Цёмна ночка», «А я ў печы не паліла». Прыемна, што разам з пажылымі выканаўцамі народных песень, у ансамблі шмат моладзі. Гэта загадчыца калгаснага клуба Тамара Казачонак, настаўніцы Валянціна Зайцава, Валянціна Крыварот, Галіна Савіч і іншыя.

Славіцца не толькі ў Бярэзінскім раёне, але і далёка за яго межамі народны вакальна-этнаграфічны ансамбль «Лявоніха» з саўгаса «Сцяг Кастрычніка». На фестывалі гэты калектыў быў прадстаўлены беларускімі народнымі песнямі «Калядкі», «Я думала маладзенька», «А ў нядзелю рана», «Ранняй вясной», «Купалінка» і іншымі. Шчырую ўсмешку выклікала песня-жарт «Бабка да ўнучкі...», запісаная ад сваіх аднавяскоўцаў.

Хораша прагучалі беларускія народныя песні «Пастушок» і «Жартоўная» ў выкананні жаночага вакальнага ансамбля саўгаса «Паплавы». Сваё майстэрства прадэманстравалі таксама харавыя калектывы саўгаса «Бярэзінскі», калгасаў «Рассвет» і «Перамога».

Разнастайнай на фестывалі была праграма канцэрта калектываў мастацкай самадзейнасці Пухавіцкага раёна. Асабліва паспяхова выступіла жаночая вакальная група Рудзенскага дома культуры. Не памылімся, калі скажам, што народныя песні «Чаму не прыйшоў» і «А ў лузе каліна» былі выкананы амаль што прафесіянальна, на высокім узроўні. Парадавалі прысутных сваім майстэрствам удзельнікі калектываў мастацкай самадзейнасці Пухавіцкага, Талькаўскага, Турынскага сельскіх дамоў культуры.

Сярод выканаўцаў з Чэрвеньскага раёна варта адзначыць фальклорна-этнаграфічны калектыў медработнікаў. Пад кіраўніцтвам Зінаіды Мурашка ён падрыхтаваў і выканаў цікавую сцэнку «На вячорках». Здаецца, сапраўды прысутнічаеш у сялянскай хаце, куды сабраліся жанкі прасці кудзелю, вышываць ручнікі, вязаць рукавіцы. І, працуючы, пяюць яны песню, сардэчную і мілагучную, пяюць пра крыніцу, з якой «дзеўка ваду брала». А потым прыйшлі на вячоркі музыкі і, адклаўшы работу, закружыліся кабеты ў імклівай полечцы.

Добра прагучалі ў выкананні хору саўгаса «Горкі» народныя песні «Ванечка-Ваніюша» і «Ехаў бацька па лучыну». Трэба, аднак, адзначыць, што Чэрвеньскі раён на фестывалі быў прадстаўлен слабей, чым Бярэзінскі і Пухавіцкі. З гэтага раёна было мала калектываў, небагатым быў і рэпертуар.

Фестываль фальклору і этнаграфіі «Глыбокія крыніцы» на Міншчыне праводзіцца ўпершыню. Следам за аглядам у Мар'інай Горцы, занальны агляд адбыўся ў Салігорску, на якім выступалі калектывы мастацкай самадзейнасці Слуцкага, Любанскага, Старадарожскага і Салігорскага раёнаў. Наперадзе — занальныя святы народнай творчасці ў Стаўбцах, Маладзечна і Барысаве.

У канцы снежня ў Мінску адбудзецца заключны канцэрт фестывалю фальклору і этнаграфіі.

Хочацца ўхваліць ініцыятыву абласнога Дома народнай творчасці, упраўлення культуры аблвыканкома, якія праводзяць такое цікавае мерапрыемства.

Няхай бруяцца глыбокія крыніцы народнай творчасці песеннай Беларусі!

В. ШЫМУК,
спец. кар. «Літаратуры і мастацтва».
Пухавіцкі раён.

На гэтым здымку вы бачыце салістак Я. Юрчанку і Л. Бірукову з народнага жаночага хору г. п. Пухавічы.

Фота Ул. КРУКА.

НОВЫЯ НАРОДНЫЯ

За шматгадовую плённую дзейнасць у развіцці дзіцячага самадзейнага мастацтва, творчыя дасягненні, высокае выканаўчае майстэрства і шматгадовую канцэртную дзейнасць, а таксама за плённую работу па мастацкаму выхаванню дзяцей прэзідыум Беларускага рэспубліканскага савета прафсаюзаў прысвоіў ганаровае званне Народны калектывам дзіцячай балетнай студыі Палаца культуры прафсаюзаў і дзіцячай студыі выяўленчага мастацтва Мінскага палаца культуры тэкстыльшчыкаў.

Дзіцячая балетная студыя — папулярны самадзейны калектыў. Ён быў створаны ў 1956 годзе. Канцэрты студыйцаў карыстаюцца нязменным поспехам. Рэпертуар калектыву разнастайны: гэта балеты «Чырвоная шапачка», «Падарожжа ў мару» і спартыўна-харэаграфічная кампазіцыя «Чырвоныя д'ябляты», сюіты «Свята кветак», «Веснавыя галасы» і рускі класічны танец на музыку П. І. Чайкоўскага, танец-гульня «Жмуркі» на музыку І. Штрауса і беларускія танцы «Андрэйка», «Мінскі вальс» і іншыя.

У калектыве займаецца 150 дзяцей рознага ўзросту. Кіруе ім балетмайстар Раіса Чарахоўская.

●

Выпускнік Мінскага тэатральна-мастацкага інстытута Васіль Сумараў арганізаваў у 1965 годзе дзіцячую студыю выяўленчага мастацтва пры Палацы культуры камвольнага камбіната.

У калектыве праводзіцца вялікая масава-выхаваўчая работа. Студыйцы ахвотна ўдзельнічаюць у традыцыйных ранішніках «Мы малюем». Да 600 дзяцей спаборнічаюць у такіх конкурсах. З поспехам раскрываецца багатая фантазія студыйцаў у другім конкурсе «Зіма —скульптар і мастак». Тады ў нашых парках і дварах з'яўляюцца, нібы з казкі, дзівосныя снежныя скульптуры. Юныя мастакі памагаюць упрыгожваць свой палац і падшэфныя школы, дашкольныя ўстановы да свят, вечароў, ранішнікаў. Наладжваюцца тэматычныя выстаўкі работ студыйцаў у палацы культуры, школах мікрараёна, кінатэатры «Сцяг».

Студыйцы ўдзельнічалі ў апошніх чатырох рэспубліканскіх выстаўках, у юбілейных выстаўках, прысвечаных 50-годдзю Вялікага Кастрычніка, 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна, ва Усесаюзнай і Міжнароднай выстаўках «Я бачу свет». У экспазіцыі апошняй пяць юных мастакоў студыі паказвалі шэсць сваіх работ.

ДЗВЕ ГАСПАДАРКІ, ДВА ПАДЫХОДЫ

На тэрыторыі Глыбаўскага сельскага Савета Рэчыцкага раёна размешчаны тры сельскія клубы і чатыры бібліятэкі. Гэтыя ўстановы культуры сталі любімымі месцамі адпачынку хлебаробаў. Ва ўсіх клубах рэгулярна праходзяць заняткі ў розных гуртках. Створаны калектывы мастацкай самадзейнасці. Асабліва падабаецца гледачам фальклорны ансамбль Глыбаўскага дома культуры. Ён неаднаразова выступаў на аглядах самадзейнага мастацтва. З поспехам выступае Горвальскі аркестр народных інструментаў.

Прыкладная работа гэтых устаноў — вынік не толькі ініцыятывы саміх культасветработнікаў, але і кіраўнікоў калгасаў і саўгасаў. Часта бываюць у клубах і бібліятэках дырэктар эксперыментальнай базы «Падлессе» Р. Грыгор'еў і сакратар парткома В. Жалезка. Яны даюць многа карысных парад, звяртаюць увагу на мастацкае афармленне, дапамагаюць своечасова падрыхтавацца да зімы. Таму і справа тут пастаўлена адмыслова.

Зусім іншыя адносіны да ўстаноў культуры ў Чарнянскім сельсавеце. Ёсць у вёсцы Белае Балота двухпавярховы клуб. Чаго ў ім толькі няма. Тут размешчана і саўгасная кантора, і вузел сувязі, і майстэрні камбіната бытавога абслугоўвання, і фельчарска-акушэрскі пункт. Няма толькі ніводнага гуртка, ніводнага мастацкага калектыву, няма дзе праводзіць масавыя мерапрыемствы. Але дырэктара саўгаса В. Гураўскага мала клапоціць гэта.

Праўда, Рэчыцкі райвыканком прапанаваў «кватарантам» вызваліць плошчу для работы клуба. Ды яны выбіраюцца пакуль што і не думаюць.

І. САВІЦКІ.

ХРОНІКА КУЛЬТУРНАГА ЖЫЦЦЯ

У калгасе «Кастрычнік» Слонімскага раёна створан хор. На першую спеўку ў Паўлаўскі сельскі дом культуры прыйшлі сакратар партыйнай арганізацыі Расціслаў Ракуць, старшыня калгаса Соф'я Трус, старшыня сельсавета Пракоп Герасімчык.

У новы калектыў запісалася многа спевакоў: муж і жонка Аляксандр і Валянціна Багданчукі, Васіль і Людміла Навумовічы, і такіх сямейных дуэтаў многа. А ўсяго ў калектыве каля 60 чалавек— моладзь і людзі сталага веку. Разам яны ствараюць цудоўны ансамбль. Кіраваць хорам узяўся Марат Малікаў, ён дырыжор аркестра народных інструментаў Слонімскага раённага дома культуры.

Хор трохгалосы. У рэпертуары калектыву творы Ю. Семянякі, Р. Пукста, С. Тулікава, Я. Фрэнкеля і народныя песні.

Першы канцэрт адбыўся ў дні Кастрычніцкіх свят!

М. РЫЛКО.

Маладзёжнай агітбрыгадзе Гродзенскага палаца культуры тэкстыльшчыкаў прысвоена званне народнай. Калектыў гэты створан 6 гадоў таму назад. Ён — пераможца Усесаюзнага агляду агітбрыгад прадпрыемстваў лёгкай і тэкстыльнай прамысловасці, удастоен дыплома першай ступені Міністэрства культуры БССР, Белсаўпрофа і ЦК ЛКСМБ на рэспубліканскім аглядзе, прысвечаным 50-годдзю СССР.

У гарадах і вёсках Прынямоння агітбрыгада карыстаецца вялікай папулярнасцю. Яе выступленні праходзяць з нязменным поспехам.

БЕЛТА.

Хведар БАЧЫЛА

ПАРТЫЗАНСКІМІ СЦЕЖКАМІ

СТАРОНКІ УСПАМІНАЎ

АДЧАЙНЫ ПАШКА ВАЛЬКОВІЧ...

Пашку Вальковіча ў атрадзе ўсе любілі. Ён ніколі не ведаў жаху, кідаўся ў самую гушчу бою. Яго прыкмеціў камандзір нашага атрада імя Варашылава Сарока і ўзяў да сябе ў ад'ютанты. Спраў у ад'ютанта хапала, але галоўным для Пашкі быў удзел у аперацыях. Ён не мог сядзець без справы, ішоў да камандзіра і прасіўся, каб той адпусціў яго на заданне з якой-небудзь дыверсійнай групай. Сарока не мог адмовіць, ведаючы характар Пашкі.

Хачу расказаць пра адзін выпадак, які сведчыць аб мужнасці Вальковіча-байца.

Гэта было ў ліпені 1942 года. Пашку Вальковіча, Алейнікава, Сачка і Балыкова адправілі з заданнем пад Мінск. Яны павінны былі звязацца з нашымі сувязнымі, вывесці пры іх дапамозе з горада чырвонаармейцаў, якія ўцяклі з фашысцкага палону, здабыць зброю і боепрыпасы.

Вальковіч узрадаваўся магчымасці ўдзельнічаць у гэтай аперацыі—сам ён быў родам з вёскі Сенніцы, што пад самым Мінскам. А тут якраз і неабходна было зазірнуць у Сенніцу на разведку. З Пашкам ніхто і не збіраўся спрачацца — на разведку ў вёску пайшоў ён. Разведка прайшла паспяхова. З добрым настроем вяртаўся Пашка на базу. Ён ішоў каля лесу, дзе яго чакалі таварышы. Ішоў, насвістваючы мелодыю вясёлай песенькі, не падазраючы аб тым, што здарылася за гэты час.

Нехта, відаць, падказаў гітлераўцам, што ў лесе заселі партызаны, а можа яны проста вырашылі прачасаць лес. Алейнікаў першым заўважыў з засады ланцуг фашыстаў.

— Трэба адыходзіць,—сказаў ён сваім.—Няўжо высачылі, гады?

Партызаны пачалі адыходзіць. Лес быў невялікім, за ім голае поле...

Пашка Вальковіч нейкім чынам аказаўся паміж першым і другім ланцугом, які рухаўся крыху ззаду. Ён падышоў да лесу і, выпадкова азірнуўшыся, убачыў гітлераўцаў зусім блізка ад сябе. Не доўга раздумваючы, забраўся на сасну. Праходзіць унізе ланцуг, фашысты расканцэнтроўваюцца. Яны амаль прайшлі ўжо, і Пашка ўздыхнуў з палёгкай, але падвяла яго нейкая невялікая птушка—яна раптам заспявала над самым вухам. Адзін з салдат закінуў уверх галаву і спалохана закрычаў: «Рус! Партызанен!»

У той час за кожнага злоўленага жывым партызана салдатам ворага абяцалі адпачынак, дакляравалі надзелы зямлі на захопленых тэрыторыях. Тыя двое таксама, відаць, уявілі сябе ў ролі памешчыкаў дзе-небудзь пад Масквою ці ў Беларусі і, нягледзячы на жах, які ахапіў іх, у Пашку страляць не сталі і на дапамогу сваіх не паклікалі—хацелася падзяліць лаўры славы на дваіх. Вальковіч спусціўся крыху ніжэй, па іх патрабаванню і гітлераўцы зусім супакоіліся — ні аўтамата, ні вінтоўкі ў Пашкі не было. Ён паспрабаваў саскочыць на зямлю, але зачапіўся партупеяй за сук і павіс на ім. Гітлераўцы пачалі рагатаць, тыцкаючы ў Пашку пальцамі. Ён нічога не разумеў, пра што яны гавораць і пакутліва думаў, як бы выкруціцца з гэтай, здавалася, безвыходнай сітуацыі. Але сук зламаўся, і не паспелі немцы ачухацца, як Пашка апынуўся пад дрэвам. Адзін з салдат, больш смелы, паспрабаваў ударыць Пашку штыком, але прамахнуўся, і штык глыбока ўвайшоў у дрэва. У той жа момант Пашка выхапіў з-за пазухі пісталет і ва ўпор стрэліў спярша ў аднаго, потым у другога гітлераўца.

А ў гэты час адбывалася вось што. Алейнікаву, Сачку і Балыкову было вельмі цяжка. Яны сядзяць у кустах, на поле выходзіць небяспечна, а немцы зусім ужо блізка. Становішча—безвыходнае.

— Будзем біцца да апошняга,—сказаў Алейнікаў. — Калі пабяжым па полі, яны нас перастраляюць, як зайцоў. Да таго ж двое ў іх на конях.

Але менавіта ў гэты час прагучалі непадалёк стрэлы (гэта страляў у гітлераўцаў Пашка Вальковіч), і ланцуг павярнуў назад.

Пашка пачуў пагоню і пабег праз поле па высокаму густому жыту. Толькі позна—афіцэры на конях заўважылі і пачалі гнацца за ім. «Усё, канец,—думаў Пашка.—Цяпер мне не ўцячы, прыб'юць, сабакі!» Але ён бег, бег, ён не мог проста падставіць сябе пад фашысцкія кулі. Хоць бы сустрэлася па дарозе невялікая ямка ці канаўка. І—вось яна! Пашка валіцца ў яму. Гэта—выратаванне!

З ямы ён убачыў тых двух на конях. Глядзяць па баках, уцяміць не могуць, куды ён знік. Зараз заўважаць. Трэба апярэдзіць гітлераўцаў. І ён пачаў страляць... Упаў адзін афіцэр, паранены другі, конь яго панёс...

Пашка лічыў сябе выратаваным. Ён выхапіў у мёртвага гітлераўца аўтамат, ускочыў на каня і памчаўся ў напрамку Кайкоўскага лесу.

Там ён сустрэў сябраў.

— Ты ведаеш, капцы нам былі б,—расказваў Алейнікаў.—Сядзім і да смерці рыхтуемся.—Ну, аднаго забілі б, двух, няхай дзесяць, а іх жа вунь колькі! Чыесьці стрэлы выратавалі нас...

А Пашка Вальковіч усхвалявана глядзеў на сябраў і шчасліва ўсміхаўся.

(Працяг. Пачатак гл. у №№ 43 і 45.)

ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ!

Вісарыёну ГАРБУКУ — 60

Заўтра пісьменніку В. Гарбуку спаўняецца 60 год. З гэтай нагоды праўленне Саюза пісьменнікаў БССР накіравала юбіляру віншаванне, у якім гаворыцца:

«Дарагі Вісарыён Сцяпанавіч!

З нагоды Вашага 60-годдзя шлем Вам, нашаму сябру і таварышу, гарачае сардэчнае віншаванне.

Вы зведалі нялёгкія жыццёвыя шляхі. Пачатак працоўнай дзейнасці быў прысвечаны настаўніцкай рабоце, выхаванню дзяцей.

У часе Вялікай Айчыннай вайны былі салдатам інжынерных войск, прымалі ўдзел у абароне Масквы, вызваленні Беларусі, ва ўзяцці Берліна.

Цяжкая хвароба, атрыманая на фронце, прыкавала Вас на многа год да ложка. Вы праявілі вялікую мужнасць і настойлівасць, каб стаць у строй жыцця, быць карысным народу. Вы ўзялі ў рукі пяро пісьменніка, сталі пісаць літаратурныя творы. Вашы апавяданні, заснаваныя на грунтоўным жыццёвым вопыце, друкаваліся ў многіх перыядычных выданнях Беларусі, Масквы, Стаўрапаля. Вы сталі аўтарам цікавых кніг як для дарослых, так і для дзяцей: «Не шукаю спакою», «Лицо в полоску», «Танюшкины рассказы», «Алачка-забывалачка», «На маім акне», «Незнарок і знарок», «Такіх кветак не бывае».

Прыемна адзначыць, што нягледзячы на хваробу, Вы актыўна ўдзельнічаеце ў грамадскім жыцці, кансультуеце творы маладых, выступаеце па радыё, трымаеце сувязь з рабочымі, калгаснікамі і школьнікамі.

Мы рады, што свой юбілей Вы сустракаеце поўныя творчых і жыццёвых парыванняў. Жадаем Вам, дарагі Вісарыён Сцяпанавіч, трымаць раўненне на строй жыцця, бадзёра і радасна глядзець у будучыню, гаварыць з народам натхнёным пісьменніцкім словам.

Радасных Вам поспехаў, новых кніг, доўгіх год жыцця, шчасця».

Рэдакцыя штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» далучаецца да гэтага віншавання і жадае юбіляру новых творчых поспехаў.

ЗЯЛЁНАЕ РЭХА

(Заканчэнне. Пачатак на 7 стар.)

Рачіца халаднаватая была. Я накінуў на сябе дзедаву бравэрку — усёроўна холад даймаў мяне. У думках нават паспрабаваў дакараць таго, хто выдумаў кашулі з кароткімі рукавамі. Здавалася, каб рукавы былі на ўсю даўжыню, дык і ўсяму б целу было цяплей. Дзеда Кажушку я трымаў пад руку, і ён цёгся, кульгаючы.

— Дык вы з гэтага пасёлка, значыцца? З «Крынічнага»?

— Вунь у гэтым дамку і жыву з сям'ёй!—паказаў я пальцам на сярэдні дамок.

Пачуўшы нас, на ганак выбегла мая Марыя Фролаўна. Яна мо дакарала сябе, што аднаго мяне пусціла ў лес.

Марыя Фролаўна ўгледзела дзеда Кажушку, убачыла, што я яго трымаю пад руку, і ніяк не магла даўмецца, што здарылася.

— Знаёмцеся! — падвёў я дзеда пад самы ганак. — Гэта мая палавіна, Марыя Фролаўна, — адрэкамендаваў я жонку па ўсіх правілах этыкету. А дзед Кажушка, мабыць, не ведаў, што яму рабіць. Ён неяк стуліўся, зморшчыўся і застагнаў невядома ад чаго, ці ад болю ў назе, ці ад няёмкасці.

Жонка падала дзеду руку, зычліва ўсміхалася.

— Я правяду дзеда Кажушку да Замошша. З ім няшчасце здарылася. Акрывеў.

Нібы жадаючы пацвердзіць тое, што я кажу, дзед ступіў на знявечаную нагу ды ледзь не ўпаў.

— От жа як бывае. Каб не ваш чалавек, дык хто б яго ведае, як бы я дашкробся дахаты.

— Можа ж зойдзем да паснедаем трохі? Мар'я, там у цябе ёсць чым аграшыцца?

— Знойдзецца!

— Што вы, чалавеча! Што вы! — як не замахаў рукамі дзед Кажушка. — Там старая, дзеці павар'яцеюць, што мяне няма. Няхай другім разам, лепшым часам, — сказаў дзед і пачаў развітвацца.

Правёў дзеда да самага Замошша. Здаў, як той казаў, з рук на рукі і вяртаюся ў сваё «Крынічнае».

Дарога на Замошша была тая самая, якой я хаджу штораніцы на прагулку. Ведаю на ёй кожны бугарок, кожную калдобіну. Мо завязаўшы вочы прайшоў бы па ёй і не ўпаў. Ведаю не толькі, што на дарозе. Ведаю, што над ёй. Як толькі раніцай даходжу я да гэтай купінкі, быццам з-пад ног у мяне, вырываецца птушка. Яна немаленькая, прыгожая, і небаязлівая, пралятае, як куля, нізенька над самай галавою. Адляцеўшы, пачынае кігікаць «Ку-гі, Кугі, Кугі!» гэтак, пакуль я не прайду метраў дзвесце, і толькі тады варочаецца на тое самае месца, з якога ўзляцела. Нібы гэта спецыяльны дазорны, якога высылаюць птушкі, каб ён наглядаў за мною і паведамляў ім пра мае намеры. Я амаль веру, што гэта так.

А вунь над тым, напалавіну дубовым лесам, ля самага вялікага на ўвесь гай дуба мяне штодзень сустракае басавіты вран. Як толькі ўгледзіць ён мяне, пачынае драцца: «кар-кар». Я ўсміхнуся сам сабе і скажу: жывы курылка! І мне чамусьці прыемна, радасна становіцца, што ён жывы.

Нядаўна мне адзін чалавек паказаў у гушчары драчынае гняздо. Там былі апераныя ўжо драчаняты.

На другі дзень я павёў жонку да драчынага гнязда. Яно было цікавае, не абыяк змураванае. Яно было гэтакім, што мы дзіву даліся, як гэта птушка, не маючы ні рук, ні розуму, можа гэтак рабіць. Гняздзечка ўтульнае, цёплае, прыкрытае ад сонца і ветру, схаванае ад хцівага драпежнага вока. Невядома, як толькі людское вока ўгледзела яго!

Прыйшлі мы ў той гушчарнік. Знайшлі гняздо. Зір — а там нікога і няма. Відаць, старыя драчы занепакоіліся, што мы, людзі, агледзелі іхнюю хатку, і вывелі дзяцей на прастор. Мо павялі ўжо дзе ў Афрыку! Кажуць жа, драчы нехатой туды ходзяць.

Шкада, што Марыя Фролаўна не пабачылася з драчанятамі!

Вярталіся дадому мы, як людзі, якім не выпала тое зрабіць, што яны хацелі.

Дарога, па якой мы вярталіся да драчынага гнязда, у адным месцы перакапана ўпоперак. Я звык ужо да гэтай канавы: абыходжу яе гушчарнікам. За мною прадралася і Марыя Фролаўна. Рукой падаць заставалася дадому. Раптам чую нейкі піск, нібы крык з просьбаю дапамогі.

— Давай паглядзім, што там, — звярнуўся я да жонкі.

— Давай!

Прыгледзеўся да глыбіні канавы і раптам бачу: на самым дне яе птушачка. Яна калацілася, унурвала галоўку ў пер'е. Злез у канаву і ўзяў птушачку ў рукі. Адчуваў, як пад пустым валячком б'ецца яе сэрца. Мне шкада-шкада стала птушанятка. Я дастаў яго з канавы і выпусціў па дарогу: хай шукае сваіх. Яно адразу недзе знікла.

— Цяпер мо аж да Афрыкі пойдзе. Гэта ж драчык маленькі.

— Шчаслівай яму дарогі!

І на наступны дзень я пайшоў на сваю праходку. Было ўсё так, як заўсёды. На тых жа самых, што і заўсёды, месцах сустракалі мяне птушкі-дразды. Крычалі, ціліўкалі. Што было новае, дык гэта тое, што над самай дарогай праляцела чародка шчаглоў. Значыць, ужо хутка восень! Яны рассыпалі над лесам свой шчэбет. Я падумаў: недзе птушкі асачылі спелы дзядоўнік і паляцелі туды ласавацца. Хай ім будзе ўдача!

Чамусьці, як праляцелі шчаглы, мне стала шкада, што сёлета мы празявалі салаўіную пару. Успомніўся леташні чэрвень. Жылі мы таксама ў гэтым дамку, і кожны дзень нас весялілі гэтыя песняры. Я хацеў як-небудзь паглядзець салаўінае гняздо. Колькі ні прадзіраўся ў гушчар, гэтак і не ўбачыў ні самога салаўя, ні яго гнязда. Затое песень салаўіных наслухаўся, колькі хацеў. Аж пазайздросціў салаўісе. Гэта ж для яе так спявае салавей. Весяліць яе, каб яна не сумавала ў гнядзе.

Кожны дзень, амаль да самай глыбокай восені, хаджу на світанні на тую лясова-польную дарогу, і кожны раз знаходжу што-небудзь новае, дагэтуль нязнанае мною.

А дзяцел усё чытае і чытае сваю рытмічную прозу. Ён, мабыць, ніколі і не скончыць чытаць тую кнігу. А зялёнае рэха не глушыць яго.

ЮБІЛЕЙ «ЧАЛУЎКІ»

Лёс кінастудыі Войска Польскага «Чалуўка» («Авангард») цесна звязаны з яго гісторыяй і пройдзеным баявым шляхам. Кінагрупа была арганізавана ў 1943 годзе ў Сельцах. Пачатак быў больш чым сціплым. Не хапала абсталявання, здымкі рабіліся для ротных газет і дывізійнага «Жалнежа вольносці». Затым ад Маскоўскай кінастудыі «Чалуўка» атрымала рэпарцёрскую і штатыўную кінакамеры. Можна было пачаць здымкі важнейшых падзей з жыцця арміі, фактаў, якія маюць у сучасны момант гістарычнае значэнне.

«Чалуўка» стала кінагрупай корпуса, арміі ВП і, нарэшце, усяго Войска Польскага. Аператары «Чалуўкі» здымалі прадстаўнікоў Саюза польскіх патрыётаў, ваенныя вучэнні, прысягу «Касцюшкаўцаў». Так быў сабраны матэрыял аб стварэнні першай рэгулярнай арміі — народнага Войска Польскага. Гэты кінафільм быў дэбютам «Чалуўкі». У пачатку верасня 1943 г. адбыўся паказ першага фільма «Чалуўкі» «Прысягаем зямлі польскай». «Чалуўка» зняла летняе наступленне 1944 года, штурм Хелма і Любліна, момант абвяшчэння Маніфеста Польскага камітэта нацыянальнага вызвалення і выхад з лясоў партызанскіх часцей Арміі Людовай.

Аператары «Чалуўкі» першымі знялі канцлагер Майданак, паказаўшы ўсяму свету зверствы фашыстаў. Прэм'ера кінастужкі «Майданак—могілкі Еўропы» адбылася 26 лістапада 1944 года.

З 1 снежня 1944 года «Чалуўка» пачала сістэматычна здымаць кадры для часопіса «Польская кінахроніка». У хроніках былі зазняты бітва за Калобжэг, правядзенне аграрнай рэформы, штурм Берліна, дзейнасць Краёвай Рады Нарадовай у 1943—1945 гг.

У снежні 1945 года «Чалуўка» стала называцца кінастудыяй Войска Польскага, з яе пачалося прадпрыемства «Польскі фільм». У ліпені 1947 года яна спыніла сваю дзейнасць.

У 1958 годзе «Чалуўка» аднавіла сваю работу.

За гады існавання кінастудыя стварыла 1.191 дакументальны, вучэбны, асветны, тэлевізійны і мастацкі кінафільм (кароткі-, сярэдне- і поўнаметражныя) і ваенны кіначасопіс «Радар».

Штогод «Чалуўка» ставіць 111 кінафільмаў, 60 працэнтаў — гэта дакументальныя і вучэбныя стужкі для Міністэрства нацыянальнай абароны. Амаль 50 працэнтаў складаюць гістарычныя кінакарціны, прысвечаныя гісторыі польскай зброі, барацьбе за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне, другой сусветнай вайне, першым гадам станаўлення народнай улады і аднаўленню народнай гаспадаркі.

Цяжка пералічыць усе фільмы, пастаўленыя кінастудыяй «Чалуўка». Лепш за ўсё пра іх гавораць шматлікія ўзнагароды і дыпломы, якімі ўдастоены аўтары на айчынных і зарубежных кінафестывалях. Віншуючы «Чалуўку» з двайным юбілеем — 30-годдзем стварэння і 15-годдзем аднаўлення дзейнасці, трэба падкрэсліць, што яна засталася верная сваім традыцыям. Разам з народным Войскам Польскім «Чалуўка» святкуе слаўную гадавіну, маючы на сваім рахунку нямала выдатных поспехаў.

Богдан ЗАВАДСКІ,
Часопіс «Польское обозрение».

Крэпасць Бабы Віды на беразе Дуная



З сярэдневяковых крэпасцей, якія знаходзіліся на тэрыторыі Балгарыі, лепш за ўсё захавалася крэпасць Бабы Віды паблізу горада Відзіна на беразе Дуная. Відзін быў сталіцай апошніх балгарскіх цароў да таго часу, калі ў канцы XIV стагоддзя Балгарыя трапіла пад уладу Атаманскай імперыі.

Асновы крэпасці былі закладзены ў X стагоддзі ў гады барацьбы балгарскага народа з Візантыяй. У XII—XIV ст ст. Бдзін (Відзін) становіцца сталіцай самастойнага феадальнага княства і буйнай крэпасцю на яго паўночна-заходняй граніцы. Хутчэй, гэта нават цытадэль. Сваю назву крэпасць атрымала з паданняў, створаных народам пра гэтую непрыступную балгарскую цытадэль.

Пра багатую гісторыю крэпасці расказваюць сабраныя тут матэрыялы музейнай экспазіцыі. Зараз у старой крэпасці працуе летні тэатр, дзе штогод арганізуецца агляд балгарскай гістарычнай драмы.

Агенцтва САФІЯ-ПРЭС.

МАЛАДЫЯ МАЙСТРЫ ФАРФОРУ

ФАРФОРАВАЯ фабрыка ў Хенебергу на поўдні ГДР самая маладая ў Еўропе, хаця гісторыя вырабу найтанчэйшага фарфору ў гэтых краях налічвае каля двухсот гадоў.

Яна пачала працаваць 1 жніўня гэтага года, калі ў сталіцы ГДР звінеў песнямі і ззяў феерверкамі Сусветны фестываль моладзі. Супадзенне не выпадковае. Моладзь акругі Зуль, якая будавала гэтае унікальнае прадпрыемства ў Цюрынгіі, закончыла свой аб'ект на тры месяцы раней тэрміну, прымеркаваўшы яго здачу да міжнароднага свята юнацтва.

Белае цюрынгскае золата ствараюць у Хенебергу, выкарыстоўваючы двухвекавы вопыт і самую сучасную тэхналогію. Яшчэ ў пускавым перыядзе прадпрыемства дало прадукцыі на суму ў 10 мільёнаў марак. І ніхто з удзельнікаў грандыёзнага балю моладзі на берлінскай плошчы Александэрпляц у гонар закрыцця фестывалю не дакараў дзяўчат і хлопцаў з акругі Зуль, якія разбілі «на шчасце» аб пліты плошчы велізарнае блюда. Такая традыцыя майстроў фарфоравай справы ў Цюрынгіі...

Галоўнай асаблівасцю будоўлі ў Хенебергу быў яе інтэрнацыянальны характар. Юнакам і дзяўчатам у блакітных кашулях Саюза свабоднай нямецкай моладзі дапамагалі іх аднагодкі з Саюза сацыялістычнай моладзі Польшчы. Будаўніцтва хенебергскай фарфоравай фабрыкі стала адначасова і школай майстэрства.

Пакуль што выраз «нямецкі фарфор» асацыіруецца з назвай іншага цюрынгскага горада — Мейсена. Аднак неўзабаве праслаўленая мейсенская прадукцыя са скрыжавымі блакітнымі мячамі сустрэне дастойнага канкурэнта — цудоўны фарфор хенебергскай фабрыкі.

А. ГРЫГОР'ЕЎ,
кар. ТАСС.

Берлін.

АСАЦЫЯЦЫЯ «МУЗЫЧНАЯ МОЛАДЗЬ»

У асацыяцыі «Музычная моладзь» Чэшскай Сацыялістычнай Рэспублікі амаль 25-гадовая гісторыя. Спачатку спробу яе стварэння (ініцыятар — выдатны чэшскі дырыжор Вацлаў Таліх) не падтрымалі. Да ідэі звярнуліся зноў у 1958 годзе, але ж зноў безвынікова.

Толькі ў 1971 годзе Міністэрства культуры ЧСР усталявала пры чэшскім музфондзе добраахвотную асацыяцыю маладых сяброў музыкі — «Музычная моладзь», забяспечыла фінансавымі сродкамі, неабходнымі для яе дзейнасці.

Пачын выклікаў шырокі водгук: у сучасны момант «Музычная моладзь» аб'ядноўвае 3 500 маладых сяброў музыкі. Аднак, неабходна дадаць, што гэтая арганізацыя не ставіць перад сабой задачу аб'яднаць усіх маладых людзей, тых, хто рэгулярна наведвае канцэрты або спявае, ці займаецца музыкай, як прафесіянал. Асацыяцыя арыентуе сваю дзейнасць перш за ўсё на тых маладых людзей, якія хоць і не абралі музыку сваёй спецыяльнасцю, але цікавяцца ёй, імкнуцца прымаць актыўны ўдзел у рабоце «Музычнай моладзі».

Для асацыяцыі характэрныя не толькі адносіны яе ўдзельнікаў да музычных каштоўнасцей, але і ўплыў мастацтва на фарміраванне маладых грамадзян, на іх маральнае выхаванне.

Камітэт «Музычнай моладзі» стварае методыку, якая б дапамагала вырашэнню пастаўленых задач.

У падрыхтоўцы будучых добраахвотных арганізатараў музычнага жыцця ў Чэхіі для асобных членаў асацыяцыі арганізуюцца так званыя «летнія лагеры», метадычныя семінары, дзе вывучаецца не толькі сама музыка, але і выхоўваецца інтарэс да іншых жанраў мастацтва (напрыклад, танец, літаратура, выяўленчае мастацтва).

Да работы прыцягнуты юнакі і дзяўчаты абласных цэнтраў. Члены аб'яднання сустракаюцца на канцэртах з іншымі майстрамі мастацтваў, складаюць музычна-адукацыйныя праграмы, паездкі і экскурсіі, ходзяць на рэпетыцыі аркестраў, арганізуюць турпаходы. Яны бываюць на занятках аматарскіх камерных ансамбляў і хораў (адным з найбольш вядомых вакальных ансамбляў з'яўляецца Брненскі акадэмічны хор, якім кіруе хормайстар Любамір Матл), у гуртках старадаўніх танцаў. У невялікіх гарадах члены гэтага аб'яднання маюць сапраўдную магчымасць актыўна ўдзельнічаць у мясцовым музычным жыцці.

«Новости музыкальной жизни Праги».

ВЫСТАЎКА БАЛГАРСКІХ МАСТАКОЎ

САЮЗ балгарскіх мастакоў падрыхтаваў план правядзення выставак, якія будуць арганізаваны на працягу бліжэйшых некалькіх гадоў у Балгарыі і за яе межамі.

Яшчэ сёлета Саюз балгарскіх мастакоў арганізуе Агульную мастацкую выстаўку, прысвечаную 50-годдзю Вераснёўскага паўстання 1923 года, якая адкрыецца ў пачатку снежня ў Сафіі. Да канца года адбудзецца традыцыйная выстаўка керамікі, а таксама акруговыя выстаўкі ў іншых гарадах. У праграму выставачных мерапрыемстваў уваходзяць юбілейныя выстаўкі Веры Лукавай, Веры Недкавай і Георгія Паўлава.

У дні савецкай культуры ў Балгарыі паказваліся дзве цікавыя экспазіцыі: прадстаўнічая выстаўка савецкага выяўленчага мастацтва — жывапіс, скульптура і графіка, вялікая фотавыстаўка і выстаўка савецкага палітычнага плаката.

У Маскве адкрылася выстаўка твораў заслужанага мастака Балгарыі Светліна Русева, старшыні Саюза балгарскіх мастакоў.

Багатым будзе і 1974 год. У Плевене адкрыецца 2-я нацыянальная выстаўка, прысвечаная балгара-савецкай дружбе, а ў Габраве — традыцыйная выстаўка твораў на рабочую тэматыку. Будзе арганізавана чарговая выстаўка ілюстрацыі і кнігі. Агульная выстаўка прыкладной графікі, выстаўка мастакоў Паўночнай Балгарыі ў Русе, а таксама выстаўкі пластыкі, карыкатуры, плаката, сяброў мора і інш.

Саюз балгарскіх мастакоў рыхтуе разнастайную і цікавую праграму выставак балгарскага выяўленчага мастацтва за рубяжом і твораў замежных мастакоў у Балгарыі.

У гэтым годзе ў Чэхаславакіі адкрыецца выстаўка твораў больш дзесяці балгарскіх жывапісцаў. У 1974 годзе ў Савецкім Саюзе і ГДР будзе паказана значная частка экспазіцыі Агульнай мастацкай выстаўкі, прысвечанай Вераснёўскаму паўстанню 1923 года. Балгарскія выстаўкі мастацкага тэкстылю, керамікі, разьбы па дрэве, фракійскага мастацтва, жывапісу, скульптуры, графікі, ілюстрацыі, экспазіцыі Смалянскага музея і іншых адкрыюцца ў многіх краінах. Творы Уладзіміра Дзімітрава-Мастэра будуць паказаны ў Англіі, Швецыі.

Частка юбілейнай выстаўкі, прысвечанай 30-годдзю народнай перамогі 9 верасня 1944 года, будзе дэманстравацца ў 1975 годзе ў Савецкім Саюзе. Да 1978 года ў розных краінах свету мяркуецца арганізаваць выстаўкі балгарскай прыкладной графікі, твораў, прысвечаных Красавіцкаму паўстанню 1876 года, маладых балгарскіх мастакоў, эстампаў і абразоў, палітычнага плаката і інш. Балгарскія мастакі прымуць удзел у традыцыйных б'енале жывапісу, графікі, керамікі і інш. У Сан-Паулу, Любляне, Браціславе, Брно, Гданьску, Лугане, Вене, Катавіцы, Варшаве, Будапешце, Берліне і іншых гарадах.

Агенцтва САФІЯ-ПРЭС.

Калектыў Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы смуткуе з прычыны раптоўнай смерці заслужанага дзеяча культуры БССР галоўнага машыніста сцэны Пржыбыткі Міхаіла Іванавіча і выказвае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

Праўленне Саюза пісьменнікаў БССР выказвае глыбокае спачуванне пісьменніцы Ніне Мацяш у сувязі з вялікім горам, якое напаткала яе,—трагічнай смерцю СЯСТРЫ.

УНІВЕРМАГ быў яшчэ адчынены. Язэп Язэпавіч борздзенька затупаў па прыступках магазіна і пачаў прабівацца да патрэбнага аддзела.

— Мне партфель! — не пераводзячы дыхання, загадаў маладзенькай прадаўшчыцы.

На прылаўку выстраіліся, нібы на парад, з паўтузіна партфеляў самай рознай афарбоўкі і канфігурацыі. Але Язэп Язэпавіч удакладніў:

— Кандыдацкі. Разумееш?

Прадаўшчыца неахвотна выплыла ў бакавушку і вынесла адтуль прыпудраную пылам штуковіну, якая нагадвала гібрыд скрыні і чамадана. На ёй было шмат унушальных блішчастых цацак.

Язэп Язэпавіч ажно памаладзеў. У суседнім аддзеле купіў паперы, некалькі бутэлек чарніла і, горды за сябе, накіраваўся да выхаду.

Крочыў дадому, адчуваў у руцэ прыемны цяжар і дакараў сябе: «Дзівак! Тры гады на пенсіі, а бачыш, толькі сёння стукнула шчаслівая думка...» Калі завярнуў на сваю вуліцу, то зноў, як нядаўна, у скверыку, нешта салодкае пачало варушыцца ў закутку яго душы. І тое, салодкае, раптам пачало зноў (у які раз!) вылівацца ў словы:

Гэй, гэй, маладзіца,
На табе хачу жаніцца!..
Я яшчэ...

Тут Язэп зачапіўся за нешта чаравікам і ледзь не паваліўся. Але такой бяды! Цагліну тую можна было б і адкінуць... Крыўдна, што якраз у такое імгненне згубіў самы дарагі радок, які пачынаўся так проста і так здорава! Ды нічога — усё яшчэ наперадзе!

Як звычайна, Муза Васільеўна была дома. У парозе Язэп Язэпавіч моўчкі абмінуў жонку, тэтак жа моўчкі распрануўся, паважна прайшоў у пярэднюю, паставіў свой «кандыдацкі» партфель на стол і толькі тады заявіў:

— Вырашана! Займуся літаратурай!..

Муза Васільеўна расчулена чмокнула Язэпа Язэпавіча ў лысіну і прашаптала:

— Даўно раіла! Калі яшчэ капцінармусам быў...

З таго вечара жыццё для Язэпа Язэпавіча забіла крыніцай. Жывы струмень у тую крыніцу ўлівала штодзень і Муза Васільеўна. Спачатку перабсталявала кватэру — адзін з пакояў адвяла пад творчы кабінет. Начапіла на вокны колеру марской хвалі шторы. На ўсялякі выпадак былі куплены мармуровыя бюсты класікаў — паэта, празаіка, драматурга і байкапісца. Знайшлася ў камісійным замежная пішучая машынка, модная настольная лямпа. І толькі пасля гэтага Язэп Язэпавіч поўнасцю аддаўся творчасці.

Кожную раніцу ўмошчваўся ён за шыкоўны пісьмовы стол, а Муза Васільеўна апраналася і выходзіла ў двор дома, садзілася насупраць сваіх акон на лавачку і дзяжурыла. Варта было выбегчы суседскім дзецям на пляцоўку пакоўзацца, як Муза Васільеўна падымалася з наседжанага месца і грозна папярэджвала:

— Т-с-с! Язэп Язэпавіч піша...

Але як ні старалася, як ні дагаджала жонка, творчая думка Язэпа Язэпавіча не магла зрушыць з месца. На паперы, акрамя тых класічных радкоў, нічога не з'яўлялася.

Каб не таптацца на адным і тым жа, не траціць дарэмна часу, Язэп Язэпавіч вырашыў падацца на кансультацыю. І не абы куды, а ў рэдакцыю. Муза Васільеўна спагадліва паглядзела мужу ў вочы і блаславіла:

— Ты не такі чалавек, Юзя! Ты даб'ешся свайго!

І вось ужо каторы тыдзень па пятніцах Язэп Язэпавіч кладзе ў «кандыдацкі» партфель спісаны лісток паперы, апранае шыкоўнае паліто, пашытае з гэтай нагоды па самай апошняй модзе, і цэнтральнай вуліцай — каб усе бачылі — крочыць у рэдакцыю. Паважна крочыць. І сустрэчныя даюць дарогу... І саслужыўцы былыя здаля здымаюць капелюшы... А як жа! У літаратуру ідзе чалавек!

Язэп Язэпавіч спадзяецца, што яму абавязкова пашанцуе.



— Ты думаеш, я паеду, калі праз тры старонкі зловяць забойцу?!
Мал. Г. МІКЛАШЭЎСКАГА (Польшча).

Мал. К. КУКСО.

Мікола ВЯРШЫНІН

СОН ПАЭТА

Калі натхнення светлы час міне,
Калі замучыць вечны пошук тэмы,
То часам мроюцца паэту ў сне
Урыўкі з ненапісанай паэмы.

МАЛЕНЬКАЯ зашмальцаваная шэрая кніжачка ляжала на газетным століку сярод кніжных паліц і насмешліва пазірала на тоўстыя, рознакаляровыя тамы мастацкай літаратуры.

— Гэй вы, мастацкія! Як жывецца? — пісклявым галаском пагардліва пыталася яна. — Усё стаіце?

— Усё стаім, — неахвотна адгукваліся кнігі на паліцах.

— І ўсё глытаеце пыл? — весела смяялася кніжачка. — Ну, ну, глытайце сабе на здароўе. Шкада мне вас. Салідныя вы, мудрыя, усё нібыта ведаеце, а што вы каштуеце? Затое зірніце на мяне: якая маленькая, якая тоненькая, а гаспадар са мной ніколі не растаецца, каля самага сэрца трымае, усюды з сабой носіць... Дарагая

яму я! Самая дарагая сярод вас...

Мудрыя кнігі маўчалі. Гэтую фанабэрыстую балбатушку яны ведалі даўно.

— Я вось і зараз пайду з гаспадаром у адно месца, — урачыста заявіла кніжачка і ў той жа момант хуценька знікла ў вялікай кішэні.

Праз гадзіну яна вярнулася да хаты. Але што гэта? Здзіўленыя кнігі не пазнавалі яе: растрэпаная, зусім шэрая, нібы з яе выціснулі апошнія сокі, кніжачка ціхенька ляжала на ранейшым месцы. Падышла гаспадыня, узяла яе ў рукі, сумна пагартала старонкі з перакрэсленымі лічбамі—капейкі! — і абыякава кінула кніжачку ў куток са смеццем.

...Бедная, ашчадная кніжка!

Я. ІВАНОЎ.

Аляксей ГАРЭЛІК.

ПЕНА

Кажуць, што адна багіня
Выйшла з пены з хваляй сіняй...
Кажуць так. А вось у нас
Ёсць буфецік «Піва — квас».
Дык даешся проста дзіву,
Што тут робіць тое піва:
За сезон загадчык новы
Дом узвёў шматпакаёвы,
Рэчы ўсе адгабляваны
Пад арэх ды пад каштаны.
Ад людскіх вачэй участак
Акружыў штакетнік часты.
Шыльда ўсім напамінае:
«Злы сабака, пакусае».
Гаспадар жа не бядуе
Ды харомы ўсё будуе.
А сям'ю сваю аднойчы
Адаслаў ён ажно ў Сочы,
Мора пеніць там бурліва.
А пры чым тады тут піва!
Што, яно узводзіць сцены!
Не! Віноўніца тут пена!

ДОЖДЖЫК

— Дожджык, дожджык,
Сыпані,
Нас з работы
Прагані.
Мы паедзем
Мыцца.
Мыцца
І галіцца.
Ну, а потым,
Як заўжды,
Вып'ем
«Зміевай» вады.
А пасля
Лі хоць тры змены:
Нам і мора
Па калена.

МАЯ МАМА

— Мая мама,
Нібы з казкі:
На вушах
Дзве гіркі,
Бляшкі.
А ў касе —
Дык усё роўна,
Што ў снягурачкі
Карона.
І на шыі
Зоркі ззяюць,
Нібы зайчыкі
Мільгаюць.
Тата скажа
Вам таксама:
— Залатая
Наша мама.

І. МАЦВЕЕНКА.

ПАШАНЦАВАЛА

У бюро аднёс паперу
І ўсё ж вымяняў кватэру.
Ноччу — песні пад гітары,
Цераз двор — бярэзнік,
Пад акном — прыём школтары,
Побач — выцвярэзнік.

Паўлюк ПРАНУЗА

ЗЯЗЮЛЯ

Байка

Зязюля лекцыю чытала,
Зязюля птушак павучала,
Як енёзды віць, як яйкі несці.
Ды тут пачулася нарэшце:
— Вой, не кажы ты так багата...
Лепш растлумач, дзе твая хата?
Яна ж «ку-ку» на развітанне:
— Нейк не па тэме мне пытанне.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856. АТ 20069

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі—33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—33-25-25, адказнага сакратара—33-44-04, аддзела літаратуры — 33-22-04, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-24-62, аддзела публіцыстыкі — 33-21-53, аддзела культуры — 33-24-62, выдавецтва —32-22-19, бухгалтэрыі — 32-15-87.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Х. Д. ЖЫЧКА.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. Ц. БАЖКО, Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, А. С. ГРАЧАНІКАЎ, Ю. П. ГРЫГОР'ЕЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАВОЛЬСКІ, Л. ЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ, Л. Я. ПРОКША, Р. К. САЛАВЕЙ, М. БАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Т. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.